Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 ЛЮТАГА 2008 г.
СЕРАДА
№ 38 (26151)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«МЫТНЫ САЮЗ ПРЫЗНАЧАНЫ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ РЭАЛЬНУЮ СВАБОДУ ПЕРАМЯШЧЭННЯ КАПІТАЛАЎ»

Развіццё Еўразійскага эканамічнага супольніцтва (ЕўрАзЭС) павінна быць максімальна актывізавана. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 26 лютага на сустрэчы з генеральным сакратаром ЕўрАзЭС Таірам Мансуравым.

«Тэмпы, якімі развіваецца Еўразійскае эканамічнае супольніцтва цяпер, не адпавядаюць тым задачам, што мы перад ім ставім», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

«Наша пазіцыя па еўразійскай інтэграцыі вядома, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. — Фарміраванне Мытнага саюза як свабоднай адкрытай зоны — гэта вялікая мэта, у імя якой варта працаваць». Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што на тэрыторыі краін — удзельніц ЕўрАзЭС пражываюць 206 млн чалавек, і гэта вельмі значны рынак тавараў і паслуг.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, нягледзячы на тое, што эканомікі краін — членаў супольніцтва ў бліжэйшы час будуць актыўна развівацца, нават пры тых бар'ерах, якія існуюць цяпер, функцыянаванне ЕўрАзЭС наўрад ці зможа быць дастаткова эфектыўным.

«Мытны саюз прызначаны забяспечыць рэальную свабоду перамяшчэння капіталаў. Вопыт у нас ёсць — гэта вопыт СССР», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Запэўніваю, што ў Беларусі вы заўсёды знойдзеце надзейную апору», — дадаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Таіра Мансурава.

Пасля заканчэння сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі генеральны сакратар ЕўрАзЭС у размове з журналістамі, каменціруючы ход развіцця еўразійскай інтэграцыі, выказаў думку, што дзяржавы — удзельніцы Еўразійскага эканамічнага супольніцтва павінны крытычна паглядзець на дапаможныя органы супольніцтва. «Гэтыя органы павінны эфектыўна вырашаць функцыянальныя пытанні», — падкрэсліў Таір Мансураў. Паводле яго слоў, для далейшага развіцця ЕўрАзЭС мае патрэбу ва ўдасканаленні сваёй структуры і актывізацыі ўзаемадзеяння органаў унутры супольніцтва. Ёсць нямала праблемных пытанняў у дзейнасці некаторых з 22 саветаў і камісій, створаных па галіноваму прынцыпу.

Паводле слоў Таіра Мансурава, санкт-пецярбургскі саміт ЕўрАзЭС пад старшынствам Аляксандра Лукашэнкі дакладна абазначыў наяўнасць актуальных праблем ЕўрАзЭС і спосабаў іх вырашэння. «Многія міністэрствы і ведамствы краін-удзельніц не ўдзяляюць будаўніцтву супольніцтва належнай увагі», — лічыць генеральны сакратар ЕўрАзЭС.

«Рэальна аб развіцці супольніцтва будуць сведчыць практычныя справы. На жаль, паўнацэнна праекты ЕўрАзЭС выконваюцца толькі трыма ўдзельнікамі супольніцтва: Беларуссю, Расіяй і Казахстанам», — адзначыў Таір Мансураў.

З 2001 па 2007 год тавараабарот унутры ЕўрАзЭС вырас з $29 млрд да $94 млрд. Аднак праекты ў сацыяльна-культурнай сферы патрабуюць большай увагі. У сувязі з гэтым у якасці прыкладу паспяховага праекта генеральны сакратар адзначыў правядзенне ў Брэсце спартакіяды ЕўрАзЭС. Па ініцыятыве Беларусі ЕўрАзЭС мае намер развіваць праграмы мікраэлектронікі і біятэхналогій. «Аляксандр Лукашэнка выказаў прапанову аб стварэнні канцэпцыі праграмы развіцця мікраэлектронікі. Гэта вельмі правільная прапанова, бо мікраэлектроніка — гэта будучыня», — адзначыў Таір Мансураў. Беларускім бокам для ЕўрАзЭС прапанавана канцэпцыя развіцця біятэхналогій, распрацаваная Нацыянальнай акадэміяй навук. «На працягу года мы павінны разгарнуць гэту праграму, якая дасць магчымасць нам ісці ўпоравень са стагоддзем», — сказаў госць.

Беларусь у бліжэйшы час уступіць у Еўразійскі банк развіцця. Усе працэдуры ўзгаднення з гэтай нагоды ўжо завершаны. Беларусь увойдзе ў лік краін — заснавальніц банка разам з Расіяй і Казахстанам.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ГОНАР І МАРА ТЭРЭСЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Палац, парк і колішнія гаспадарчыя пабудовы ў вёсцы Жэмыслаўль Іўеўскага раёна не проста ўражваюць — яны патрабуюць хутчэй пачаць тут рэстаўрацыю і стварыць сапраўдную меку для турыстаў. Тым больш, што побач рака і возера, вакол лясы. Тэрэса МАЦКЕВІЧ (на фотаздымку), былая працаўніца дзіцячага садка, нарадзілася 66 гадоў таму і яшчэ добра памятае апошніх гаспадароў палаца роду Умястоўскіх. Яе дзед быў тут паплаўнічым — вартаваў панскія сенажаці, а бацька служыў млынаром. Тэрэса Браніслаўна ўсё жыццё кватаравала побач з будынкам палаца і на яе вачах адбываўся заняпад помніка дойлідства XIX стагоддзя. Яна сцвярджае, што тут выраблялі швейцарскія сыры. А на гранітных плітах памятных слупоў вакол населенага пункта пазначана, што гэты маёнтак — дар Умястоўскіх Віленскаму ўніверсітэту для навуковых мэтаў.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Рауля Кастра з выбраннем старшынёй Дзяржсавета і Савета Міністраў Кубы

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Рауля Кастра Руса з выбраннем на пасаду старшыні Дзяржаўнага Савета і Савета Міністраў Кубы.

Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем адзначыў высокі ўзровень існуючых адносінаў паміж Беларуссю і Кубай і выказаў надзею на далейшае пашырэнне ўзаемавыгаднага і трывалага супрацоўніцтва дзвюх краін на аснове ўзаемаразумення і даверу.

Прэзідэнт Беларусі выказаў упэўненасць, што пад кіраўніцтвам Рауля Кастра Куба прадоўжыць правядзенне палітыкі паслядоўнага адстойвання нацыянальных інтарэсаў, паспяхова рэалізуе планы, накіраваныя на далейшы рост дабрабыту кубінскага народа.

Кіраўнік беларускай дзяржавы накіраваў таксама пасланне Фідэлю Кастра ў сувязі з яго адыходам з пасады старшыні Дзяржаўнага Савета і Савета Міністраў Кубы. «Ваша імя ўпісана ў летапіс нацыянальна-вызваленчай барацьбы народаў Лацінскай Амерыкі супраць неаколаніялізму. Вы стаялі ля вытокаў стварэння першай у гісторыі па-сапраўднаму суверэннай кубінскай дзяржавы», — гаворыцца ў пасланні. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што менавіта ўклад Фідэля Кастра ў плённае супрацоўніцтва паміж Кубай і Беларуссю стаў надзейнай асновай дружалюбных адносінаў дзвюх краін. «Для Вашых шматлікіх прыхільнікаў ва ўсім свеце Вы — заўсёды яркі прыклад палымянага служэння Айчыне, справе свабоды і незалежнасці», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Ва ўрадзе

Выбар за спажыўцом — беларускія кансервы ці імпартныя

Тое, што айчынныя прадукты харчавання, у прыватнасці, тыя ж плодаагароднінныя кансервы ў нашых магазінах чамусьці «застаўбілі» ніжнія паліцы — часам даводзіцца амаль што на кукішках чытаць этыкеткі на беларускай прадукцыі — зусім не факт, што яны прайграюць па якасці імпартным таварам. Наадварот, у адрозненне ад некаторых замежных аналагаў, якія выпускаюцца з дабаўкамі, фарбавальнікамі і т.п., беларускія вырабы куды больш канкурэнтаздольныя.

У такім выпадку, запытаўся на ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, што перашкаджае дастойна прадстаўляць нашу кансерваваную прадукцыю ў гандлі? Між іншым, падчас абмеркавання на пасяджэнні пытанняў па ходу рэалізацыі праграмы вытворчасці плодаагароднінных кансерваў у Беларусі на 2006—2010 гады, старшыня Камітэта Дзяржкантролю Зянон Ломаць заўважыў, што праведзеныя камітэтам праверкі лішні раз пацвярджаюць інфармацыю наконт таго, што айчынная прадукцыя, у прыватнасці, дзіцячыя прадукты харчавання вызначаюцца высокім узроўнем якасці і «не ідуць ні ў якое параўнанне па асобных пазіцыях з аналагамі, што закупляюцца за мяжой».

А вось чаго не хапае нашаму прадукту — дык гэта рэкламы, лічыць кіраўнік урада. Акрамя таго, пакупнік, які робіць выбар на карысць канкрэтнага прадукту — айчыннага ці імпартнага — павінен дакладна ведаць, што ён набывае. У сувязі з гэтым прэм'ер даручыў Дзяржстандарту праверыць, якой якасці тавары паступаюць на наш рынак. Не сакрэт, што часам прыгожыя этыкеткі розных кетчупаў, соусаў і інш. — адзіная рэч, якая прывабліве спажыўца, аднак гэта здароўя прадукту не дадае. Праўда, гэта зусім не азначае, што на імпарце будзе пастаўлены крыж. «Імпартныя кансервы, безумоўна, на рынку будуць», — падкрэсліў прэм'ер.

Іншая справа, што пакуль айчынная кансервавая галіна не ў стане насыціць у поўным аб'ёме рынак запатрабаванай прадукцыяй. Так, паводле даных Міністэрства гандлю, у рэспубліцы адчувальны недахоп грыбных кансерваў, кансерваванай садавіны і гародніны, гароднінных асарці, сокаў у пакетах, практычна няма замарожанай агародніны. Гэты «прабел» даводзіцца запаўняць імпартам. Напрыклад, толькі летась імпарт тых жа сокаў склаў 43 мільёны долараў, доля імпартных кетчупаў і таматных пастаў склала 64 працэнты, кукурузных кансерваў — 90 працэнтаў, кансерваваных грыбоў — 77,6 працэнта. Таму адна з задач, што стаіць сёлета, — пераарыентаваць кансервавыя заводы на выпуск канкурэнтаздольнай імпартазамяшчальнай прадукцыі.

«У 2008 годзе ў краіне плануецца ўвесці шэраг новых вытворчасцяў, новых прадпрыемстваў, у першую чаргу, па такіх напрамках, як імпартазамяшчальная прадукцыя, вытворчасць сокаў», — паведаміў старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Іван Данчанка. Так, будзе ўведзены ў эксплуатацыю завод па вытворчасці напіткаў з садавіны ў Высокім і прадпрыемства «Старая крэпасць» у Бабруйску. Адначасова будуць уведзены Гарыньскі камбінат, Баранавіцкі камбінат харчовых прадуктаў, Пружанскі завод, Глыбоцкі кансервавы камбінат, Ельскі, Старадарожскі, Быхаўскі камбінаты. Такім чынам, ствараецца надзейная база для выпуску і самазабеспячэння рэспублікі кансерваванай прадукцыяй. Акрамя таго, паводле слоў Івана Данчанкі, магутнасцяў хопіць і для таго, каб прадукцыя ішла на экспарт. Дарэчы, як удакладніў Сяргей Сідорскі, за кошт стварэння новых вытворчасцяў выпуск плодаагароднінных кансерваў павінен павялічыцца амаль удвая: летась было выраблена каля 254 мільёнаў умоўных бляшанак кансерваў, сёлета ж плануецца выпуск да 403 мільёнаў.

Прапрацоўваецца сёння і пытанне аб тым, каб стварыць пад Мінскам лагістычны гандлёвы цэнтр кансерваванай прадукцыі, паведаміў старшыня «Белдзяржхарчпрама». Гэта дазволіць, на яго думку, паскорыць збыт плодаагароднінной кансерваванай прадукцыі, якая будзе пастаўляцца з цэнтра ў магазіны.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

НОВЫЯ НАЗНАЧЭННІ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь 26 лютага разгледзеў шэраг кадравых пытанняў. Кіраўнік дзяржавы назначыў:

ПАЎЛОЎСКАГА Аляксандра Аляксеевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Французскай Рэспубліцы, Пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры ЮНЕСКА;

ПУГАЧОВА Васіля Паўлавіча — Пастаянным паўнамоцным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры статутных і іншых органах СНД;

ЦЫГАНОВА Аляксандра Рымавіча — намеснікам Старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

ПУЦІЛУ Уладзіміра Рыгоравіча — суддзёй і старшынёй Мінскага гарадскога суда;

БАРЫСЮКА Сяргея Валер'евіча — намеснікам Старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта;

СЯРГЕЯ Івана Сцяпанавіча — начальнікам установы адукацыі «Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь»;

ШУТАВА Сяргея Васільевіча — начальнікам упраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама;

МІХНЕВІЧА Сяргея Іванавіча — Пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Лізе арабскіх дзяржаў па сумяшчальніцтве;

ГОШЫНА Уладзіміра Анатольевіча — першым намеснікам Старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта.

Прэзідэнт даў згоду на назначэнне:

ПЕТРЫШЭНКІ Ігара Віктаравіча — першым намеснікам Міністра замежных спраў;

КАЧАН Валянціны Іванаўны — намеснікам Міністра аховы здароўя — Галоўным дзяржаўным санітарным урачом Рэспублікі Беларусь;

ФІЛОНАВА Анатоля Васільевіча — намеснікам Міністра эканомікі;

ШЭНЦА Леаніда Васільевіча — намеснікам Старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі — дырэктарам Дэпартамента па энергаэфектыўнасці;

ЮХІМУКА Міхаіла Іванавіча — першым намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама;

БАРАНАВА Аляксандра Васільевіча — першым намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама;

ІСАЧЭНКІ Анатоля Міхайлавіча — намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама;

ШОСТАКА Пятра Мікалаевіча — старшынёй Рэчыцкага райвыканкама;

МАКСІМЕНКІ Сяргея Аляксандравіча — старшынёй Светлагорскага райвыканкама;

ЛІСОЎСКАГА Мікалая Віктаравіча — старшынёй Аршанскага гарвыканкама;

ПЯНЬКОЎСКАГА Леаніда Канстанцінавіча — старшынёй Бешанковіцкага райвыканкама;

КАВАЛЬЧУКА Генадзя Філіпавіча — генеральным дырэктарам дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання дакладнага машынабудавання «Планар» — дырэктарам навукова-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «КБТЭМ-СО»

МАРОЗАВА Віктара Іванавіча — намеснікам дырэктара Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю;

СНЕГІРА Міхаіла Валянцінавіча — пракурорам Мінскай вобласці;

КУЛІКА Мікалая Мікалаевіча — пракурорам г. Мінска;

НІКІФАРАВА Міхаіла Яфімавіча — генеральным дырэктарам навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах;

ФЕДАСЮКА Валерыя Міхайлавіча — генеральным дырэктарам навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па матэрыялазнаўстве;

ГЕРАСІМЕНКІ Генадзя Анатольевіча — членам Віцебскага аблвыканкама;

КАЛЕСНІКАВА Валянціна Дзмітрыевіча — членам Гомельскага аблвыканкама;

ЕРМАКОВА Віктара Іванавіча — начальнікам галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі крымінальнай міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў;

ПЯКАРСКАГА Алега Анатольевіча — начальнікам галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю Міністэрства ўнутраных спраў;

ВОРСІНА Яўгена Мікалаевіча — намеснікам Генеральнага сакратара Еўразійскай эканамічнай супольнасці.

(Больш падрабязна — у наступным нумары газеты «Звязда».)

КОЖНЫ ДЗЕНЬ АВІЯШОЎ — ФЕЕРВЕРК

У рамках авіяшоў «Мінск Аэра 2008» пройдзе Першы адкрыты Кубак Беларусі па паветраплаванні. Само ж відовішча будзе арганізавана ў гісторыка-культурным комплексе «Лінія Сталіна» з 3 па 6 ліпеня. Як расказаў Сяргей Салаўеў, генеральны дырэктар ЗАТ «СолМедыяГран» (адзін з арганізатараў авіяшоў), узяць удзел у розыгрышы Кубка прыедуць каля 30 камандаў з Украіны, Расіі, краін Еўрапейскага саюза. Таксама ў праграме авіяшоў запланаваны паказальныя палёты груп «Рускія віцязі» і «Стрыжы», пілотаў беларускіх Ваенна-Паветраных Сілаў на Су-27 і МІГ-29БМ.

— Будуць і забаўляльныя мерапрыемствы, пройдуць гала-канцэрты беларускіх і расійскіх зорак эстрады, выстава, якая прысвечана гісторыі і развіццю авіяцыйнай прамысловасці, — падзяліўся Сяргей Салаўёў. — Кожны дзень авіяшоў будзе завяршацца феерверкам.

Чакаецца, што на «Лінію Сталіна» ў гэтыя дні прыедуць каля 200 тысяч чалавек з 20 краін свету.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк», расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 5 МАРТА 2008 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. О внесении изменений и дополнений в Устав банка.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 3 марта), а также с решениями, принятыми внеочередным общим собранием акционеров банка (после 5 марта) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах — областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней — до 3 марта 2008 года.

Телефоны для справок: (8017) 218 84 38, 218 84 04.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 29.10.2007 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Вниманию акционеров — владельцев акций Открытого акционерного общества «Белорусский народный банк»

ОАО «БНБ» извещает, что очередное общее собрание акционеров состоится 28 марта 2008 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 21 в здании УП «Дом профсоюзов», актовый зал. Регистрация начинается с 8.30.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Банка за 2007 год и основных направлениях деятельности Банка на 2008 год.
2. Об утверждении заключения Ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Банка за 2007 год.
3. Об утверждении годового баланса и отчета о прибыли и убытках за 2007 год.
4. О распределении прибыли Банка за 2007 год.
5. О внесении изменений в Устав Банка.
6. Об определении размера вознаграждения членам Совета директоров и Ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей.
7. Об оказании безвозмездной спонсорской помощи.
8. Об избрании Совета директоров Банка.
9. Об избрании Ревизионной комиссии Банка.

С проектом решения по вопросу, включенному в повестку дня, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 87-а в рабочие дни (с 9.00 до 17.00, обед с 12.30 до 13.15) в приемной ОАО «БНБ» у секретаря.

Для участия в собрании акционерам необходимо иметь при себе:

Акционерам — физическим лицам — паспорт (или другой документ, удостоверяющий личность), их представителям — нотариально оформленную доверенность.

Акционерам — юридическим лицам — документ, подтверждающий служебное положение (для первых лиц), их представителям — доверенность.

Телефон для справок: 017 280 16 63.

УНП 100513485.

Сямён НАУМОВІЧ:

Аўтарытэтна

«НА СТАМАТАЛОГІЮ Ў НАС САМЫЯ НІЗКІЯ ЦЭНЫ Ў СВЕЦЕ»

Паведамленне аб тым, што ў пачатку 2008 года цэны на платныя стаматалагічныя паслугі ў дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя істотна ўзрастуць, прымусіла сур'ёзна нервавацца людзей, якія не могуць сабе дазволіць абслугоўванне ў прыватных стаматалагічных фірмах. Да таго ж у снежні ўступіў у сілу Закон «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян», рэзка абмежаваўшы кола пацыентаў, за якімі захавалася права на бясплатнае ці льготнае зубапратэзаванне. Кошт і якасць стаматалагічных паслуг сталі тэмай нашай гутаркі з галоўным пазаштатным стаматолагам Міністэрства аховы здароўя, загадчыкам кафедры артапедычнай стаматалогіі БДМУ, доктарам медыцынскіх навык, прафесарам Сямёнам НАУМОВІЧАМ.



Фота Мікіты БЕГУНКОВАЙ

— Не сакрэт, што стаматалогія з'яўляецца вельмі затратнай сферай медыцыны. Абсалютна відавочна, што працуючы на маральна састарэлым абсталяванні, атрымаць добры вынік немагчыма. Сучасная стаматалогія — гэта сучасныя тэхналогіі, сучасная тэхніка і сучасныя матэрыялы. Такім чынам дзяржаўная стаматалогія, перад якой пастаўлена канкрэтная задача зарабіць грошы і пашырыць платныя паслугі, аказалася перад складаным выбарам: з аднаго боку, паслугі дзяржаўнага стаматалагічнага сектара павінны заставацца даступнымі для насельніцтва, а з іншага — мы не можам працаваць стратна для сябе, больш за тое, нам трэба развівацца. Па аб'ёмах платных медыцынскіх паслуг стаматалогія выйшла на першае месца ў медыцынскай сферы. Але хачу ўсіх заспакоіць — рэзкага росту цэнаў не адбылося. Цэны ў нас рэгулююцца дзяржавай і штомесячны іх рост знаходзіцца ў межах паловы працэнта.

— Калі я не памыляюся, летась планавалася распрацаваць адзіны прэйскурант на ўсе віды стаматалагічных паслуг для дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый…

— Гэта работа ўжо здзейсненая і цяпер прэйскурант знаходзіцца на ўзгадненні ў Міністэрстве эканомікі. Але з'яўленне адзінага прэйскуранта зусім не азначае, што мы збіраемся ўзняць цэны на стаматалагічныя паслугі ў дзяржаўным сектары да ўзроўню цэнаў у прыватным сектары. Прэйскурант устанаўлівае адзіную для ўсіх гранічна дапушчальную цану на ўсе віды стаматалагічных паслуг, якой абавязаны будуць прытрымлівацца ўсе прыватныя стаматалагічныя арганізацыі і кабінеты. Адразу падкрэслю, што дзяржаўныя арганізацыі аховы здароўя не плануюць арыентавацца на афіцыйна дазволены максімум. Гэта будзе арыенцір, хутчэй, для прыватнікаў.

— Але роскід цэнаў у прыватных стаматолагаў — вельмі істотны. Нярэдка складваецца ўражанне, што цана залежыць ад прэстыжнасці фірмы і колькасці ўкладзеных у рэкламу грошай. Ці не адбываецца ў прыватнай стаматалогіі штучнае завышэнне цэнаў?

— У нас была калісьці ідэя атэстоўваць усе стаматалагічныя арганізацыі, і ў залежнасці ад іх асноўнасці і кваліфікацыі медыцынскага персаналу прысвойваць ім тую ці іншую катэгорыю, ад якой залежала б цана на стаматалагічныя паслугі. Але пакуль што не ўсе дзяржаўныя стаматалагічныя арганізацыі могуць нароўні канкураваць па сваёй тэхнічнай аснашчанасці з прыватнымі стаматалагічнымі фірмамі. Мне вельмі прыемна канстатаваць, што пашырэнне ў дзяржаўных медыцынскіх установах платных стаматалагічных паслуг дазволіла нам апошнім часам істотна абнавіць парк стаматалагічнага абсталявання. Калі да 2002 года мы закуплялі ў год усяго 50 новых стаматалагічных установак па краіне, то з 2003 года, пасля пашырэння аказання платных стаматалагічных паслуг, мы пачалі закупляць штогод 250—280 новых установак. І калі гэтыя тэмпы захаваюцца і далей, то ў бліжэйшыя тры—пяць гадоў мы зможам замяніць увесь свой састарэлы парк абсталявання. Мяркую, што праз пэўны час мы вернемся да ідэі прысвоення стаматалагічным арганізацыям катэгорый.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

А на мой погляд...

КУПЛЯЙ СВАЁ — ЯНО КАРЫСНАЕ!

Якой вітаміннай прадукцыі (сокам, кансервам з садавіны і гародніны) вы і члены вашай сям'і аддаяце перавагу — айчыннай ці замежнай вытворчасці? Што з'яўляецца вырашальным пры выбары — цана, упакоўка, якасць, бяспека (у сэнсе карысці) для здароўя?

Лідзія ВЕЖНАВЕЦ, начальнік аддзела культуры УП «Гарадскія паркі «Мінскзелянбуд»:

— (Не даслухаўшы да канца пытанні) Айчыннай, адназначна. Нехта, магчыма, лічыць, што замежная прадукцыя мае больш прыгожую ўпакоўку. У гэтым сэнсе недзе можна пагадзіцца, што дызайн тары мог бы быць і больш прэзентабельным, больш сучасным. Але… Я, напрыклад, «захапляюся» сокамі, купляю іх выключна ад айчынных вытворцаў, за выключэннем нейкіх экзатычных (ну не растуць у нас ананасы). Тое ж магу сказаць пра малочную, тварожную прадукцыю. А аддаю менавіта ім я перавагу найперш з-за якасці. Яна выдатная. Тут нават не ў грашах справа, а ў смаку… Ім мы сапраўды можам ганарыцца, паколькі ў нас усё натуральнае. Вы ж ведаеце, еўрапейскія стандарты не заўсёды лепшыя. І калі ў мяне ёсць выбар, я заўсёды звярну ўвагу найперш на беларускі яблычак, чым на нейкі там бліскучы замежны. Так, няхай ён па знешнім выглядзе нязграбны, аднак на смак ён мне больш падабаецца, і з гадамі я ўсё больш пераконваюся ў сваім меркаванні. Ведаеце, што мне некалі казаў дзядуля, у якога быў вялікі сад: «Унучачка, калі чарвяк не захацеў есці гэты яблык, навошта табе яго спажываць?» *(Смяецца.)* А ўпакоўка, тара… Прабачце, нехта тыя кансервы і лыжкай са слоіка з'есць, калі захоча, а эстэт выкладзе іх на прыгожую талерку. Для мяне гэтая акалічнасць не з'яўляецца асноўнай, пры выбары найперш я кіруюся якасцю беларускіх прадуктаў харчавання.

Сяргей СОБАЛЕЎ, намеснік начальніка Ашмянскай мытні:

— Несумненна, аддаю перавагу айчыннай прадукцыі. Па-першае, самае галоўнае, гэта якасць. Па-другое, цана… Хоць, безумоўна, за вельмі дарагую прадукцыю я грошы не аддаў бы. Калі гаварыць пра ўпакоўку, лічу, што ў гэтым сэнсе беларускія вытворцы «падцягнуліся» апошнім часам да заходніх стандартаў. Але ў любым выпадку на першае месца пры выбары я стаўлю якасць вітаміннай прадукцыі, асабліва калі гаварыць пра здароўе дзяцей. Тут, акрамя магазінных сокаў, нейкіх кансерваў, мы яшчэ аддаём перавагу вітамінам з уласнага агарода.

Віктар ГЛАЗКОЎ, старшыня Спецыялізаванай Беларускай калегіі адвакатаў «Белінюркалегія»:

— А вы самі паспрабуйце пакаштаваць і параўнаць некаторыя нашы сокі і замежныя. Вынік будзе не заўсёды на карысць першых. Мне больш даспадобы, скажам, украінскія сокі. Так, але ёсць і айчынныя кансервы з садавіны, што мне падабаюцца. *(Смяецца.)* Кабачковая ікра вытворчасці клецкага завода.

Людміла МАЗАН, намеснік начальніка ўпраўлення кадраў Міністэрства юстыцыі:

— У маёй сям'і аддаюць перавагу сокам. І сокам, на жаль, імпартнай вытворчасці, цудоўна разумеючы, што нашы, беларускія, больш карысныя. Але… У замежнай прадукцыі больш зручная ўпакоўка, яна ёй «плюсуе». Хоць, паўтаруся, айчынная вельмі добрая па якасці, але ж не падабаюцца нам гэтыя слоікі. Нейкія іншыя кансервы з садавіны-гародніны мы не набываем, паколькі з дарослай дачкой — як хатнія гаспадыні — самі робім хатнія нарыхтоўкі.

Аляксандр БУЙНІЦКІ, загадчык аддзела гігіены Стаўбцоўскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі:

— Мне ў цэлым больш падабаецца айчынная вітамінная прадукцыя. Калі гаварыць пра сокі, нават нашы мясцовыя, стаўбцоўскага завода: яблычны, з рознымі дабаўкамі. Нядрэнныя на смак, карысныя для здароўя і цалкам бяспечныя. Усё ж у нас узровень кантролю даволі сур'ёзны. А яшчэ ў нашай сям'і аддаюць перавагу садавіне і гародніне, вырашчаным уласнымі рукамі.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.02.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 147,00
1 еўра	3 186,06
1 латвійскі лат	4 574,41
1 літоўскі літ	922,77
1 чэшская крона	127,47
1 польскі злоты	901,70
1 расійскі рубель	87,79
1 украінская грыўня	425,15

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,4558
10 UAH	47,9930
1000 BYR	11,3801
EUR	36,1921

Курс у гандлёвых кампаніях (на 26.02.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Насустрач Пекіну

Аляксандр КОСІНЕЦ:
«СПОРТ — ВЯЛІКАЯ ПАЛІТЫКА»

Учора ў Міністэрстве спорту і турызму намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандр Касінец сустрэўся з галоўнымі трэнерамі нацыянальных камандаў, якія рыхтуюцца да XXIX летніх Алімпійскіх гульняў у Кітаі.

За 164 дні да старту Алімпіяды беларусы выканалі 142 нарматывы ў 15 відах спорту. «На матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне летась было выдзелена больш як 14 мільярдаў рублёў, — паведаміў Аляксандр Мікалаевіч. — Затрачаны значныя сродкі на камандзіраванне нашых спартсменаў на зборы ў тыя краіны, клімат якіх набліжаны да пекінскага. З боку кіраўніцтва дзяржавы робіцца ўсё магчымае, каб умовы падрыхтоўкі беларусаў былі якаснымі і эфектыўнымі, і калі вас зараз нешта непакоіць, — звярнуўся віцэ-прэм'ер да галоўных трэнераў, — кажыце аб гэтым сёння, бо ў нас кожная секунда дарагая...»

У настаўнікаў нацыянальных камандаў заўваг менавіта да арганізацыі падрыхтоўкі да Гульняў у Пекіне, па вялікаму рахунку, не было. І ўсё ж некаторыя турботы існавалі. Напрыклад, галоўны трэнер каманды па лёгкай атлетыцы Анатоль Бадуеў узняў праблему кантролю за ўжываннем допінгу. Маўляў, у 2004-м афіцэры ВАДА бралі ў нашага атлета 2—3 пробы, а зараз правяраюць па 7—8 разоў, што з'яўляецца своеасаблівым псіхалагічным ціскам на спартсмена. На гэту рэмарку Аляксандр Касінец адрэагаваў наступным чынам: «Такая ўвага з боку антыдопінгавага агенцтва азначае, што нас разглядаюць як асноўных прэтэндэнтаў на медалі. Трэнерам у гэтай сітуацыі варта знайсці патрэбныя словы і настроіць спартсменаў на перамогу».

Калі ж зайшла размова аб алімпійскіх відах спорту, дзе беларусы яшчэ не заваявалі ліцэнзій (сярод іх бокс, баскетбол, бадмінтон, конны спорт, стральба з лука, сучаснае пяцібор'е, дзюдо), прадстаўнік хакея на траве заявіў, што на адборачным турніры ў нас невялікія шанцы трапіць на Алімпіяду-2008, бо рэйтынг сапернікаў значна вышэйшы, і таму заваяваць адзіную пуцёўку будзе цяжка. «Мяняйце псіхалогію, — параіў яму кіраўнік арганізацыйнага камітэта «Пекін-2008», — не трэба атрымліваць задавальненне ад таго, што мы толькі ў дваццатцы ці дзесятцы».

Таксама была закранута такая праблема, як адсутнасць да цяперашняга часу алімпійскага талісмана зборнай. Віцэ-прэм'ер прапанаваў наладзіць правядзенне конкурсу, каб выбраць яго ўсёй краінай.

— Гэта не першыя і не апошнія нашы Алімпійскія гульні, таму патрэбна адладзіць механізм арганізацыйнай работы ў дачыненні да падрыхтоўкі да наступных спаборніцтваў, каб яна была накіравана на рост, — падвёў вынік сустрэчы Аляксандр Касінец. — Патрэбна надаваць увагу працы дзіцяча-юнацкіх школ, рэгіёнаў, навукова-даследчых устаноў і г. д. Мы спадзяёмся на паспяховае выступленне беларусаў у Пекіне, бо спорт — гэта вялікая палітыка. Акрамя таго ў год здароўя хочацца паказаць, якая наша дзяржава моцная і здаровая.

Ірына ПРЫМАК.

УРАД БЕЛАРУСІ ВЯРНУЎ 20-ПРАЦЭНТНУЮ СКІДКУ ПРЫ АПЛАЦЕ ВАДЫ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЎСТАНАВІЎ ЛІЧЫЛЬНІКІ ЗА СВАЕ СРОДКІ

Адпаведнае рашэнне зацверджана пастановай Савета Міністраў № 233 «Аб некаторых пытаннях спагнання платы за паслугі водазабеспячэння і каналізацыі» ад 20 лютага 2008 года. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў Апараце Саўміна.

Згодна з дакументам, плата за паслугі водазабеспячэння і каналізацыі з наймальнікаў, уласнікаў жылых памяшканняў, членаў арганізацый грамадзянзабудоўшчыкаў, якія ўстанавілі ў 2008 годзе індывідуальныя прыборы ўліку расходу вады за кошт уласных сродкаў і заключылі дагаворы з водазабеспячальнай арганізацыяй, спаганяецца з 20-працэнтнай скідкай з тарыфаў на гэтыя паслугі, што ўстанаўліваюцца заканадаўствам Беларусі.

Гэта льгота дзейнічае ў першыя два гады пасля ўстаноўкі прыбораў уліку.

Плата за паслугі водазабеспячэння і каналізацыі з грамадзян, якія ўстанавілі лічыльнікі за свае сродкі да 1 студзеня 2008 года, спаганяецца з 20-працэнтнай скідкай з тарыфаў на гэтыя паслугі на працягу першых трох гадоў пасля ўстаноўкі названых прыбораў.

Прадастаўленне такіх ільгот было прадугледжана ў пастанове Савета Міністраў Беларусі № 1332 «Аб упарадкаванні разлікаў насельніцтва за карыстанне жылымі памяшканнямі і камунальнымі паслугамі», якая ў канцы мінулага года страціла сілу. У гэтым годзе ў Беларусі плануецца завяршыць установку індывідуальных прыбораў уліку расходу вады ва ўсіх абсталяваных водаправодам дамах.

ПЕРАРАЗЛІК ПЛАЦЯЖОЎ ЗА ВАДУ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЎСТАНАВІЎ ЛІЧЫЛЬНІКІ ЗА ЎЛАСНЫЯ СРОДКІ, ЗРОБЯЦЬ У САКАВІКУ

Аб гэтым паведаміў журналістам начальнік управлення эканомікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзімір Кісялёў.

Перараразлік зробяць за перыяд з сярэдзіны кастрычніка мінулага года да 1 студзеня 2008 года, калі не дзейнічала 20-працэнтная скідка з тарыфаў на паслугі водазабеспячэння і каналізацыі.

Ён нагадаў, што згодна з рашэннем урада льготы на ваду для грамадзян, якія ўстанавілі індывідуальныя прыборы ўліку расходу вады за свае сродкі, адноўлены з 1 студзеня гэтага года.

Для тых, хто набудзе прыборы ў 2008 годзе, плата за паслугі водазабеспячэння і каналізацыі будзе брацца з 20-працэнтнай скідкай з тарыфаў на гэтыя паслугі на працягу двух гадоў пасля ўстаноўкі лічыльніка. Плата за ваду з грамадзян, якія ўстанавілі лічыльнікі за свае сродкі да 1 студзеня 2008 года, бярэцца з 20-працэнтнай скідкай з тарыфаў на працягу першых трох гадоў пасля ўстаноўкі прыбораў.

Паводле слоў прадстаўніка Мінжылкамгаса, рашэнне аб прадастаўленні скідкі на ваду на працягу двух гадоў для тых, хто ўстановіць лічыльнікі ў 2008 годзе, было прынята зыходзячы з сярэдняга тэрміну акупнасці індывідуальных прыбораў уліку расходу вады. Апошнія абыходзяцца сёння грамадзянам прыкладна Br200 тыс. Паводле яго даных, установўка лічыльніка ў аднапакаёвай кватэры, у якой пражываюць два чалавекі, акупляецца за тры гады, у двухпакаёвай кватэры з трыма жыхарамі — за два гады, чатырма — за паўтара.

Да 2007 года ў краіне лічыльнікі ўстанавілі больш як у 780 тыс. кватэр, што склала 31,8 працэнта ўсяго жыллёвага фонду, абсталяванага цэнтралізаванай сістэмай водазабеспячэння. Толькі за мінулы год лічыльнікі ўстанавілі ў 900 тыс. кватэр. Аснашчанасць імі жылфонду, абсталяванага водаправодам, дасягнула 68,4 працэнта. Для таго каб дасягнуць 100-працэнтнай аснашчанасці індывідуальнымі прыборамі ўліку, да канца 2008 года стаіць задача ўстанавіць лічыльнікі амаль у 800 тыс. кватэр.

БелТА.

Мінскі абласны выканаўчы камітэт выказвае глыбокае спачуванне кіраўніку Апарата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Мартынецкаму Канстанціну Аляксеевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні кіраўніку Апарата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Мартынецкаму Канстанціну Аляксеевічу ў сувязі з напаткаўшым яго непапраўным горам — смерцю БАЦЬКІ.

Абзац

♦ **У Беларусі нараджаецца больш хлопчыкаў, чым дзяўчынак, паведамілі ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу. Так, летась з'явіліся на свет 53 330 хлопчыкаў і 50 095 дзяўчынак, у 2006-м — адпаведна 49 849 і 46 872, у 2005-м — 46 401 і 44 107.**

Фота БелТА.

♦ Жыхары Віцебска купілі гарадскому заапарку пару страўсаў. Сямейства паўднёваафрыканскіх птушак нядаўна з'явілася ў Віцебскім заапарку дзякуючы ахвяраванням гараджан, расказаў дырэктар заапарка Аляксей Андрэйкаў. Ахвяраванні паступалі ад наведвальнікаў на працягу года.

♦ **14-гадовы сербскі хлопчык атрымаў удар токам напружаннем 25 тысяч вольт і застаўся жывы. Ён залез на дах мясцовай электрычкі, каб дастаць закінуты туды футбольны мяч, і дакрануўся да кабеля высокага напружання. Гэта заўважылі пасажыры і выклікалі «хуткую дапамогу». Тое, што хлопчык пражыў электрычны разрад такой сілы, урачы называюць цудам. Хлопчык атрымаў сур'ёзныя апёкі, але цяпер ідзе на папраўку.**

♦ 25 лютага зламыснік абрабаваў філіял аднаго з банкаў у пасёлку Сасновы Бор Светлагорскага раёна. Гэта адбылося ў абедзены перапынак. У 13.10 у дзверы філіяла банка пастукаў невядомы, які назваўся інкасатарам, і папрасіў адчыніць дзверы. Старшы касір адчыніла дзверы, злачынец стукнуў яе па твары, выкраў 9 мільёнаў рублёў і збег. Супрацоўнікі праваахоўных органаў праводзяць аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы для ўстанаўлення асобы рабаўніка.

♦ **Адзін чалавек загінуў, больш за 12,5 тыс. засталіся без прытулку ў выніку паводкі ў Паўднёва-Казахстанскай вобласці. Акрамя таго, пацярпелі больш за 2,3 тыс. будынкаў, разбурана 259 хат, 8 школ, 2 масты, загінула больш за 330 галоў свойскай жывёлы. «Падобнай катастрафічнай з'явы, якая адбылася ў Паўднёва-Казахстанскай вобласці, не было. За 3—4 гадзіны прайшоў вельмі цёплы дождж разам з цёплым ветрам, і двухгадовая норма снегу, якая ляжала на схіле гор, растала. Некаторыя людзі паспявалі выскачыць з хат, выносячы з сабой толькі дакументы», — адзначылі ў МНС.**

♦ Ноччу на аўтамагістралі пад Баранавічамі, насупраць вёскі Новы Свет, жыхар горада не справіўся з кіраваннем аўтамашыны і ўдарыўся ў дрэва. Разам з вадзіцелем загінула яшчэ двое пасажыраў, а чацвёрты трапіў у бальніцу. Ён і расказаў, што, адзначыўшы нейкую падзею, кампанія вырашыла праехацца. Адзін з іх, хоць і не меў правоў на кіраванне аўтамабілем, узяў матчын «Опель» і павёз сяброў. Што здарылася, пацярпелы растлумачыць не здолеў, бо спаў. Усім было па дваццаць гадоў. І як не ўспомніць, што ў мінулым годзе, фактычна на гэтым жа месцы каля вёскі Новы Свет, у аўтааварыі загінула чацвёра маладых людзей. Участак дарогі добра праглядваецца і здавалася б, не з'яўляецца небяспечным.

♦ **У Беларусі адукацыйны ўзровень жанчын у цэлым вышэйшы, чым мужчын, і такая тэндэнцыя захоўваецца на працягу доўгага перыяду. У Міністэрстве статыстыкі і аналізу паведамілі, што летась сярод жанчын, якія працуюць, 54 працэнты мелі вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю, сярод мужчын — 37 працэнтаў (у 2000 годзе было адпаведна 49 і 33 працэнты).**

♦ Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі архібіскуп Рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі Тадэвуш Кандрусевіч лічыць гуманным рашэнне адпусціць Аляксандра Казуліна на пахаванне жонкі, паведамляе «Інтэрфакс».

♦ **У Філадэльфіі 16-гадовы падлетак гуляў у снежкі з сябрамі ў двары свайго дома ў свой дзень нараджэння. Адна са снежак трапіла ў суседа, пасля чаго той пабег у хату і, вярнуўшыся з пісталетам у руках, стрэліў у хлопчыка. Падлетка даставілі ў бальніцу з раненнем галавы; ён быў падключаны да сістэм жыццезабеспячэння, аднак гэта не дапамагло, і хлопчык сканаў раніцай у панядзелак. Паліцыя шукае злачынцу.**

♦ Каля дваццаці наведвальнікаў басейна спарткомплексу «Маяк» ва ўкраінскай Вінніцы атруціліся ад выпарэнняў хлору, двое пацярпелых дастаўленыя ў рэанімацыю. Яны мелі паражэнне дыхальных шляхоў сярэдняга цяжару. Паводле папярэдніх высноў супрацоўнікаў МНЗ, прычынай стала няспраўнасць вентыляцыйнай сістэмы басейна. З-за гэтага ўтрыманне атрутных рэчываў у паветры значна перавышала дапушчальны ўзровень.

♦ **Службовыя сабакі ў Дзюсельдорфе будуць выходзіць на службу ў абутку. Чаравікі для сабак, зробленыя з адмыслова-га сінтэтычнага матэрыялу, па колеры будуць адпавядаць паліцэйскай форме. Усе сабакі мясцовага дэпартамента паліцыі — 20 нямецкіх і бельгійскіх аўчарак — цяпер трэніруюцца насіць чаравікі. Паліцэйскія вырашылі абуць сабак у чаравікі, каб абараніць іх ад парэзаў. У Дзюсельдорфе, асабліва ў старой частцы горада, размешчана шмат піўных. На бруку побач з пітнымі ўстановамі часта валяюцца асколкі шкла, аб якія сабакі рэжуць лапы.**

♦ Муж і жонка з Канады нарадзілі дзіця, скарыстаўшыся замарожанай спермай, якая захоўвалася 22 гады. У 18-гадовым узросце бацька маленькага, Майк Кузьмінскі захварэў на лімфагранулематоз — анкалагічнае захворванне лімфоіднай тканкі. Лечачы ўрач параіў яму замарозіць сперму, бо хіміятэрапія і прамянёвая тэрапія, якія прызначаюцца пры гэтай хваробе, нярэдка прыводзяць да бясплоднасці. Паслухаўшы ўрача, Кузьмінскі здаў сперму на захоўванне ў адну з бальніц Калгары. У 2003 годзе Майк ажаніўся са сваёй сяброўкай Крысцін. Муж і жонка не спадзяваліся на нараджэнне дзіцяці, аднак сястра Майка ўспомніла аб замарожанай сперме і параіла патэлефанаваць у клініку, дзе яна захоўвалася. Супрацоўнік бальніцы сказаў, што сперма па-ранейшаму захоўваецца, а таксама тое, што мужчына павінен за гэтую паслугу заплаціць 2000 долараў. Цяпер муж і жонка вельмі шчаслівыя і аб будучых дзецях пакуль не думаюць. Тым не менш Крысціна адзначыла, што запасаў спермы Майка хопіць яшчэ на 19 спробаў зачацця. Пакуль што рэкордам лічыцца зачацце дзіцяці з дапамогай спермы, якая захоўвалася 28 гадоў. Гэта выпадак быў апісаны ў часопісе Fertility & Sterility у 2005 годзе.

Поўны абзац

♦ Мексіканскія ўлады разглядаюць магчымасць увядзення новага закона, згодна з якім жанічі і нявесты, якія збеглі перад самым вяселлем, павінны будуць выплачваць за тэрміновае змяненне свайго рашэння штраф. Як перадаюць інфармагенцтвы, гэтыя меры дапамогуць пазбегнуць закаханым фінансавага ўрону і эмацыянальнага стрэсу. У Мексіцы вяселле з'яўляецца падзеяй вялікага сацыяльнага значэння: на пышныя цырымоніі збіраецца шмат гасцей, траціцца процьма грошай, а пра вяселлі, на якія прыходзіць 1000, пішуць у мясцовых газетах. Па традыцыі большую частку расходаў за правядзенне мерапрыемства бярэ на сябе сям'я нявесты. Прапанова будзе вылучана на галасаванне на кангрэсе, якое пройдзе ў Мехіка ў сакавіку або красавіку гэтага года. Калі большасць галасоў будзе «за», то новае палажэнне ўступіць у сілу.

♦ **У Кітаі каманда пасадзіла самалёт з-за мышы, якая збегла ад пасажыркі. Апошняя пранесла мыш на борт самалёта, схаваўшы яе ў кішэні плашча. У час палёту гаспадыня заснула, і мыш збегла. Пасажырка звярнулася па дапамогу да каманды самалёта, аднак, нягледзячы на ўсе намаганні, ім не ўдалося адшукаць грызуна. Каманда прыняла рашэнне пасадзіць самалёт у міжнародным аэрапорце. Пасля пасадкі на борце самалёта быў аб'яўлены каранцін. Супрацоўнікі аэрапорта без вынікаў пяць разоў абшукалі салон. Пасля двух з паловай гадзін затрымкі самалёт прадоўжыў рэйс. Некаторыя пасажыры заявілі, што звернуцца ў суд з іскамі да авіякампаніі.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармацыйных агенцтваў.

УП «Минский городской центр недвижимости» проводит открытый аукцион № 6-А-08 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске для строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение цены продажи).

Предмет аукциона: право заключения договора аренды земельного участка.

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 27.12.2007 № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков», в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь № 227 от 21.02.2007.

Сведения о предметах аукциона

Номер лота	Лот № 1	Лот № 2	Лот № 3	Лот № 4	Лот № 5	Лот № 6	Лот № 7	Лот № 8
Месторасположение земельного участка	Слепянская водная система от ул. Плеханова до ул. Малинина	ул. Матусевича (микрорайон Масюковщина-3)	ул. Сухаревская (микрорайон Сухарево-3)	ул. Янковского (микрорайон Сухарево-7)	микрорайон Ангарская-2	пр. Дзержинского (район ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк»)	ул. Янковского — ул. Горецкого — ул. Проектируемая	ул. Янковского — ул. Горецкого — ул. Проектируемая
Целевое назначение	Физкультурно-оздоровительный комплекс с сопутствующими объектами общественного питания, торговли и обслуживания населения в составе объекта «Лыжероллерная трасса в составе Слепянской водной системы от ул. Плеханова до ул. Малинина»	Крытые теннисные корты с помещениями общественного питания и физкультурно-оздоровительного обслуживания населения	Много-функциональный объект общественного назначения (по генплану №№ 34, 35)	Физкультурно-оздоровительный и развлекательный комплекс с крытым плавательным бассейном, объектами общественного питания и торговли	Физкультурно-оздоровительный и развлекательный комплекс с объектами общественного питания и сопутствующей торговли (по генплану №№ 71, 72)	Многоэтажная гараж-стоянка с сервисным центром и помещениями торгового и общественного назначения	Много-функциональный комплекс с предприятиями торговли, общественного питания, бытового обслуживания (по генплану № 10)	Многоуровневая автостоянка на 900 м/м с сервисным центром, объектами торгового и общественного назначения (по генплану № 14)
Кадастровый номер	500000000003002923	500000000006004109	500000000006004111	500000000006004110	500000000002004971	500000000005004023	500000000006004116	500000000006004117
Площадь, га	0,2378	0,3754	1,4647	0,2445	0,2517	0,5666	0,5071	1,9073
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений	Участок свободен от застройки. Представлены многолетние насаждения в виде сада.	Участок свободен от застройки. Часть участка (0,1050 га) покрыта нелесной, древесно-кустарниковой растительностью.	Участок свободен от застройки. По земельному участку проходит водопровод (0,1640 га), телефонная канализация, электрокабель более 1000 В, ливневая канализация (площадь 0,2190 га).	Участок свободен от застройки. По земельному участку проходит водопровод и телефонная канализация.	Участок свободен от застройки. По земельному участку проходит телефонная канализация (площадь 0,0130 га), электрокабель до 1000 В (площадь 0,0020 га), теплотрасса (площадь 0,0700 га).	Участок свободен от застройки, представлен луговыми землями, имеются отдельно стоящие деревья.	Участок свободен от застройки.	Участок свободен от застройки.
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	В соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение объекта (согласно перечню, установленному Мингорисполкомом)							
Срок аренды земельного участка	50 лет	50 лет	50 лет	50 лет	50 лет	50 лет	50 лет	50 лет
Срок заключения договора аренды земельного участка	Договор заключается после совершения всех действий (в т.ч. платежей), предусмотренных законодательством Республики Беларусь, условиями аукциона и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заключенным с его организатором, но не позже 2 рабочих дней.							
Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка (в долларах США)	886 994	1 377 718	5 565 860	936 435	1 028 985	1 004 727	1 942 193	2 427 009
Размер задатка[1] (в долларах США)	44 350	68 886	278 293	46 822	51 449	50 236	97 110	121 350
Базовая годовая арендная ставка (в долларах США)	31 936	49 589	417 434	33 700	37 055	91 247	163 147	220 284
Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителями (белорусских рублей)	8 251 130	8 251 130	8 251 130	8 251 130	8 251 130	8 251 130	8 251 130	8 251 130

[1] *сумма задатка вносится до установленной даты окончания приема документов для участия в аукционе.*

Аукцион состоится **31 марта 2008 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников.

Для участия в аукционе необходимо представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

общий пакет документов:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

заявление об ознакомлении с материалами лотовой документации и осмотре земельного участка;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в размере 5 процентов от начальной цены лота (в случае участия по нескольким лотам — от начальной цены лота с наибольшей стоимостью);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах).

Денежные средства перечисляются на расчетный счет № 3012024570010 в ф-л «БПС-Банк» ОАО по Минской области, код 153001331, 220005 г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, д. 6, УНН 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости», в белорусских рублях по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на момент внесения денежных средств;

для юридических лиц дополнительно:

нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

для иностранных инвесторов дополнительно:

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса иностранного инвестора в соответствии с законодательством страны происхождения (с заверенным переводом на белорусский (русский) язык);

документ о финансовой состоятельности иностранного юридического или физического лица, выданный обслуживающим его банком или иным финансово-кредитным учреждением с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представители иностранных юридических и физических лиц – легализованную в установленном порядке доверенность с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

кроме того, иностранное физическое лицо предъявляет паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также его копии;

для индивидуальных предпринимателей дополнительно:

нотариально удостоверенную копию свидетельства о государственной регистрации;

копию паспорта;

представитель индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность, копию своего паспорта и паспорта лица, интересы которого представляет;

для физических лиц дополнительно:

копию паспорта;

представитель физического лица – нотариально удостоверенную доверенность, копию своего паспорта и паспорта лица, интересы которого представляет.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Прием документов для участия в аукционе начинается с **11.00 29 февраля 2008 года** и заканчивается в **17.00 27 марта 2008 года.**

Победитель аукциона, а в установленных случаях – участник аукциона, в сроки, указанные в протоколе о его результатах и соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, но не позже 10 рабочих дней после принятия решения исполкома о предоставлении ему земельного участка, помимо внесения оплаты за право аренды земельного участка (части платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Минским горисполкомом) обязан:

возместить местному бюджету (бюджету г. Минска) стоимость документации, подготовленной для проведения аукциона;

возместить организатору торгов расходы по организации и проведению аукциона, указанные в извещении;

оплатить вознаграждение за подготовку и проведение аукциона в размере 0,5 процента от определенной в ходе торгов стоимости права на заключение договора аренды земельного участка или от начальной цены предмета торгов соответственно;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним гражданином (индивидуальным предпринимателем, юридическим лицом), местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении этому лицу земельного участка. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин (индивидуальный предприниматель, юридическое лицо) обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Минским горисполкомом), возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, осуществить иные расчеты с организатором торгов, предусмотренные заключенным соглашением о правах и обязанностях сторон при проведении аукциона, а также выполнить условия, содержащиеся в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона. После совершения лицом названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет заключает с ним договор аренды земельного участка.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату платежа.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам, а также приобретения лотовой документации.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Подавать заявления с комплектом документов на участие в аукционе, а также приобретать лотовую документацию можно по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 4 и № 6.

Контактные телефоны + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.

Официальный сайт организатора торгов www.mgcn.by.

УНП 190398583

Открытое акционерное общество «Актамир»
сообщает о проведении 20 марта 2008 г. очередного годового общего собрания акционеров

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах деятельности Общества за 2007 год.
2. Отчет Ревизионной комиссии.
3. Утверждение сводного и годового отчетов, бухгалтерских балансов, счетов прибыли и убытков по итогам работы за 2007 год.
4. Об утверждении направлений распределения прибыли и покрытия убытков Общества.
5. Об избрании членов выборных органов Общества.

Место проведения собрания:
г. Москва, 1-й Кирпичный пер., д. 2.
Начало собрания в 16.00 (время местное).

Регистрация участников будет проводиться с 15.30 по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров — и доверенности.

С материалами, подлежащими представлению при подготовке к собранию, акционеры (их представители) могут ознакомиться: **с 14.03.2008 г. по рабочим дням с 16.00 до 17.00** по месту нахождения Общества: **г. Минск, пер. Бехтерева, 10, комн. 1207; в день проведения собрания — по месту его проведения.**

УНН 100097980

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

27 лютага 2008 г. № 8 (111)

«КРУГЛЫЙ СТОЛ»

«ШИШКИ» ЦЕНТРАЛИЗОВАННОЙ БУХГАЛТЕРИИ

Указ Президента от 12 января 2007 года № 21 «О повышении роли органов местного управления и самоуправления в решении вопросов жизнеобеспечения населения» действует чуть больше года. Многие из поставленных в нем задач уже удалось реализовать, многое еще предстоит сделать. Далеко не все из того, что прописано в указе, легко осуществимо на практике.

Год работы показал, что основные трудности у председателей Советов первичного уровня возникают при решении финансовых вопросов, в частности, при формировании бюджета, изыскании нетрадиционных источников его пополнения, при работе с казначейством, сборе налогов на своей территории и т.д. Получить необходимые разъяснения и комментарии, как говорится, из первых рук они имеют возможность на встречах с председателем Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь по региональной политике и местному самоуправлению Анатолием Малофеевым. Подобные мероприятия регулярно проводятся на базе Института высших управленческих кадров в рамках работы Совета по взаимодействию органов местного самоуправления. Очередная такая встреча, традиционно проходящая в форме «круглого стола», состоялась на прошлой неделе. В ней принимала участие начальник отдела региональных бюджетов главного управления бюджетной политики Министерства финансов Зоя Кругликова.

Первое, с чего всегда начинает свое выступление перед председателями первичного уровня Зоя Николаевна, это советует досконально изучить местную налоговую базу, чтобы потом вместе с районной властью четко определиться: какая часть собираемых в сельсовете налогов может быть направлена в бюджет сельисполкома. «В зависимости от ваших возможностей и предприимчивости ресурсная база должна развиваться и пополняться через нетрадиционные доступные источники, — подчеркнула Зоя Николаевна. — Вы уже пошли по пути сдачи в аренду пустующих помещений, создания унитарных предприятий для оказания услуг населению и т.д. Это прогрессивные подходы».

Анализ местных бюджетов 2008 года показал, что большинство областей в качестве доходного источника передали на первичном уровне часть средств от налога с продаж. Витебская область добавила еще и сбор за владение собаками и курортный сбор. Гродненцы на уровне области оставили общую формулировку «отчисления от местных налогов и сборов». От каких конкретно и в каком объеме — будут решать сами районы.

Год работы по Указу № 21 показал, что назрела необходимость во внесении определенных изменений в существующую законодательную базу. По словам Зои Кругликовой, сейчас в разработке находится Бюджетный кодекс, где, кроме всего прочего, предполагается предусмотреть занесение в доход сельисполкомов части налоговых поступлений от создаваемых на территории данного сельсовета предприятий. Пока что все эти отчисления поступают в бюджет базового уровня.

Во время своего выступления Зоя Николаевна обратила внимание слушателей на особенности использования резервного фонда, который до принятия указа на первичном уровне не формировался.

(Окончание на 2-й стр. «МС».)

ГАРАДОК з візітнай карткай



Дзевяць стагоддзяў стаіць на беразе хуткай ракі Гарынь Давыд-Гарадок. Калі казаць дакладней, праз год будзе яго чарговы юбілей — 910 гадоў. У плане гісторыі і этнаграфіі, фальклору і абрадаў, народных звычаяў і побыту гэта адно з найунікальнейшых і найбагацейшых месцаў калі не ўсёй Беларусі, дык Палесся дакладна. Здаецца, часу сапраўды не падуладна змяніць існы стрыжань, дзякуючы якому да сёння натуральна жыве мова гарадчукоў, іх традыцыі, захоўваецца давыд-гарадоцкі ўклад і нават стыль жыцця.

А час сёння не самы лёгкі... Як удаецца вырашаць надзённыя праблемы горада? Як дапамагчы насельніцтву, якога на сёння амаль сем тысяч? Безумоўна, гэта лепш за іншых ведае старшыня гарадскога Савета і выканаўчага камітэта Уладзімір Галавач.

— Давыд-Гарадок — сапраў-ды ўнікальнае месца, — не без гонару кажа Уладзімір Мі-калаевіч. — І не толькі ў плане гісторыі, культуры і мен-тальнасці. Найперш тут жыве вельмі працавіты і прад-прымальны народ. Таму галоўная задача мясцовых орга-наў улады — ствараць працоўныя месцы для гарадчукоў і дастойныя сацыяльна-бытавыя ўмовы. Лёгкіх шляхоў тут няма.

У канцы 90-х гэты палескі куток выглядаў інакш. Кідаўся ў вочы маленькі стары будынак аўтастанцыі, стыхійны базар на цэнтральнай плошчы без неабходных прыстасаванняў для гандлю... Тавар прадаваўся, можна сказаць, з «падлогі». Безаблічныя фасады гарадскіх крамаў і нежылых пабудоў даўно патрабавалі гаспадарскай рукі — ва ўсім прысутнічала местачковая запушчанасць. Але ў тыя часы гэта было ўласціва не толькі колішняму райцэнтру, размешчанаму ў далечыні ад сталіц і турысцкіх маршрутаў.

— Задача добраўпарадкавання цэнтральнай часткі стаяла вельмі востра і, рыхтуючыся да 900-годдзя, нам удалося шмат чаго зрабіць: плошча пераўтварылася моцную рэканструкцыю і набыла сучасны выгляд, у цэнтры яе паўстала бронзавая фігура князя Давыда, і цяпер гэта — візітная картка нашага горада. Атрымалася ўсё дзякуючы фінансаванню з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў. Але на гэтым план дзеянняў па добраўпарадкаванні не спыніўся.

У тым жа юбілейным 2000-м Давыд-Гарадок атрымаў у падарунак новую аўтастанцыю. Патрэба ў ёй існавала немалая і даўно. Праз населены пункт штодня праходзіла шмат далёкіх міжгародніх і мясцовых рэйсавых аўтобусных маршрутаў, пасажырапаток год ад году не змяншаўся. Гарадчукі — народ непаседлівы — часта выязджалі ў пошуках дадатковых заробкаў, студэнты ехалі на вучобу...

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



ТЭМА ДНЯ

ГРОШЫ ТРЭБА ЗАРАБЛЯЦЬ, А НЕ ПЕРАРАЗМЯРКОЎВАЦЬ

Усе пасяджэнні пастаянных камісій Лідскага раённага Савета дэпутатаў — выязныя і праводзяцца на базе тых ці іншых прадпрыемстваў і арганізацый, дзе абмяркоўваюцца надзённыя пытанні жыцця рэгіёна і прымаюцца канкрэтныя рашэнні. Паводле слоў старшыні раённага Савета Уладзіміра ЦІМЧАНКІ, эканоміка — гэта прыярытэт і для выканаўчай, і для прадстаўнічай улады. І важна не толькі зацвердзіць прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця, бюджэт, але і стварыць умовы для іх выканання.

— Уладзімір Анатольевіч, летась у бюджэт раёна дадаткова паступіла каля васьмі мільярдаў рублёў. За кошт чаго дасягнуты гэты прырост?

— Нядаўна на выніковай калегіі Міністэрства фінансаў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі адзначыў, што дзяліць грошы і пераразмяркоўваць фінансавыя патокі — справа нескладаная. Кожнаму рэгіёну трэба вучыцца зарабляць грошы, і ўсё большая роля ў фарміраванні даходнай часткі бюджэту будзе належаць мясцовым уладам. І сапраўды, у кожным раёне рэспублікі, у тым ліку і ў Лідскім, ёсць патэнцыял для эканамічнага росту і, каб яго задзейнічаць, неабходна стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця сваіх прадпрыемстваў. Не толькі даводзячы ім заданні, але і дапамагаючы ў вырашэнні надзённых праблем, у прыцягненні ўвагі да іх усіх органаў улады, міністэрстваў і ведамстваў (удзельная вага рэспубліканскай формы ўласнасці ў прамысловасці раёна складае амаль 70 працэнтаў), у збыце прадукцыі.

Такім чынам, мясцовы ўзровень кіравання становіцца тым пярэднім краем, ад якога залежыць сацыяльна-эканамічнае становішча ў рэгіёне і яго перспектывы. І тут, на маю думку, павінен адбыцца адыход ад «накатаных» метадаў. Трэба рабіць упор не на размеркаванне прагнозных паказчыкаў, а на стварэнне ўмоў для таго, каб іх не толькі выконваць, але і перавыконваць. І для гэтага — фарміраваць адпаведны інвестыцыйны клімат, падтрымліваць дзелавую ініцыятыву і прадпрымальніцтва, граматна дзейнічаць у накірунку прасоўвання прадукцыі рэгіёна на айчынныя і замежныя рынкі.

Наш раён унікальны сваім шматгаліновым прамысловым комплексам, прычым кожны трэці рубель вырабленай на Лідчыне прадукцыі экспартуецца. Зарэгістраваны і паспяхова працуюць больш за 50 прадпрыемстваў з расійскім, украінскім, польскім, літоўскім, амерыканскім, нямецкім, дацкім капіталам. Па ініцыятыве мясцовай улады на чале са старшынёй райвыканкама Андрэем Худыком штогод праводзяцца Дні эканомікі Лідскага раёна з запрашэннем прадстаўнікоў дзелавых колаў Беларусі і краін замежжа, дыпламатаў. Летась сваю прадукцыю на выстаўцы дэманстравалі 70 прадпрыемстваў, было заключана шмат кантрактаў і дагавораў аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. У мэтах рэалізацыі лідскай прадукцыі на замежных рынках, зноў жа па ініцыятыве райвыканкама, адкрыты гандлёвыя дамы «Ліда — рэгіён» у Маскве (яго кіраўнік, лідчанін Вячаслаў Жылінскі, удастоены прэстыжнага звання «Топ-менеджар Расійскай Федэрацыі 2007 года), у Алматы (Казахстан), у Чыстопалі (Татарстан). А ў Лідзе адкрыты філіял Нацыянальнага цэнтра маркетынгу і кан'юктуры цэнаў, які аказвае інфармацыйную падтрымку прадпрыемствам раёна ў наладжванні дзелавых сувязяў і збыце тавараў. Акрамя таго, дае плён дагавор аб супрацоўніцтве райвыканкама з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. Сёння практычна ўсе нашы прадпрыемствы маюць праграму дзеянняў па абнаўленні вытворчасці, укараненні новых тэхналогій і вырашэнні тых задач, якія дазволяць ім выйсці на сусветны рынак.

— Як сфарміраваны бюджэты Саветаў пярвічнага ўзроўню на гэты год і якім вам бачыцца іх уплыў на сацыяльна-эканамічнае становішча адпаведных тэрыторый?

— Даходная база бюджэтаў пярвічнага ўзроўню згодна з Указам № 21 запланавана з васьмі крыніц, тады як раней бюджэт сельскага Савета напаўняўся з двух-трох крыніц (падаходнага падатку з грамадзян, адміністрацыйных штрафаў і дзяржпошліны). Акрамя таго, у бюджэты пярвічнага ўзроўню будуць залічвацца даходы ад продажу грамадзянам зямельных участкаў, што знаходзяцца на тэрыторыі сельскага Савета, да 50 працэнтаў сродкаў ад рэалізацыі па рашэннях раённага, абласнога Саветаў дэпутатаў нерухомай маёмасці, размешчанай на тэрыторыі сельсаветаў і г. Бярозаўка, а таксама маёмасці, якая знаходзіцца ў іх камунальнай уласнасці. Летась такія паступленні былі адзінкавыя і таму спрагназаваць іх на 2008 год складана, але спадзяюся, што і гэта дазволіць Саветам пярвічнага ўзроўню самім зарабляць грошы.

Сродкі рэзервовага фонду для Саветаў (1 працэнт ад агульнай сумы даходаў) склалі на гэты год 2830 тысяч рублёў. Што датычыцца датацый сельскім і Бярозаўскаму гарадскому бюджэтам з вышэйстаячага бюджэту, то іх памер склаў 1 046 429 тысяч рублёў — гэта на 195 працэнтаў больш у параўнанні з папярэднім годам.

Органы мясцовага кіравання і самакіравання атрымалі больш правоў не толькі па фарміраванні, але і па выкарыстанні бюджэтаў сваіх тэрыторый. Прадугледжаны расходы на бягучае ўтрыманне аб'ектаў добраўпарадкавання, вулічнае асвятленне, вываз смецця. 99 мільёнаў рублёў сёлета запланаваны на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы Саветаў пярвічнага ўзроўню.

Безумоўна, што не ўзмацніўшы пярвічнае звяно ў эканамічным плане, мы не зможам вырашыць тыя задачы, якія перад ім стаяць. І найперш галоўную задачу, якую павінен ажыццяўляць орган дзяржаўнага кіравання — узнаўленне рабочай сілы, што мае на ўвазе стварэнне прадпрыемстваў. У той жа Бярозаўцы, дзе пасля візіту кіраўніка дзяржавы прыняты канкрэтныя меры па мадэрнізацыі вытворчасці на шклозаводзе «Нёман», праблема занятасці людзей усё роўна адчуваецца, паколькі не могуць жа ўсе працаваць на гэтым прадпрыемстве і ў сацыяльнай сферы. А значыць, трэба ствараць новыя рабочыя месцы. Роля пярвічных звёнаў улады, улічваючы іх магчымасці, сёння абмяжоўваецца толькі прапановамі аб стварэнні нейкіх рабочых месцаў, прадпрыемстваў, на большае яны пакуль не здольны.

Але відавочна і тое, што прадпрыемствы павінны стварацца не пад эгідай сельскага ці гарадскога Савета, а як незалежныя гаспразліковыя арганізацыі, на аснове эканамічнага інтарэсу. Пры гэтым пэўная частка падатковых плацяжоў ад іх дзейнасці павінна папаўняць даходную базу бюджэтаў пярвічнага ўзроўню, каб орган улады быў зацікаўлены ў стварэнні найбольш спрыяльных умоў для размешчаных на яго тэрыторыі суб'ектаў гаспадарання.

— Год таму ў інтэрв'ю «МС» вы прапанавалі Лідчыну ў якасці «доследнай пляцоўкі» па выпрацоўцы механізма выканання Указа Прэзідэнта Беларусі № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва»...

— Не страчваю надзеі, што гэта ідэя будзе ўсё ж падтрымана рэспубліканскімі органамі ўлады. Сёння хочацца зноў падкрэсліць, што сам па сабе Указ № 21 — дакумент вельмі патрэбны і змястоўны, аднак важна, каб ён арганічна спалучаўся з жыццёвымі рэаліямі на канкрэтных тэрыторыях. А гэта залежыць не толькі ад нізавых звёнаў улады, але і ад іх узгодненых дзеянняў з шэрагам органаў раённага, абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў. Таму можна было б, як кажуць, усёй талакой, з удзелам спецыялістаў, што займаюцца праблемамі мясцовага кіравання і самакіравання, а таксама адпаведных службаў выпрацаваць механізм рэалізацыі гэтага дакумента на прыкладзе двух-трох раёнаў Беларусі, некалькіх сельскіх і пасялковых Саветаў. Для таго, каб узгадніць фінансавыя, арганізацыйныя, юрыдычныя пытанні і выпрацаваць сістэму фарміравання бюджэту пярвічнага звяна, яго адміністрацыйныя, кадравыя функцыі. Гэты вопыт, мяркую, будзе карысным для сельскіх і пасялковых Саветаў усёй рэспублікі.

Заслугоўваюць увагі асобныя моманты практыкі фарміравання бюджэтаў Саветаў пярвічнага ўзроўню ў Віцебскай вобласці. Але гэта толькі штогадовае пераразмеркаванне ўжо цэнтралізаваных рэсурсаў. Раней у Беларусі падаходны падатак залічваўся цалкам у бюджэты пярвічнага ўзроўню, затым стаў пераразмяркоўвацца. Велічыня падаходнага падатку залежыць ад велічыні зарплаты, колькасці рабочых месцаў, а значыць, стымулюе напрамую стварэнне новых. У мясцовых бюджэтаў як пярвічнага, так і базавага, абласнога ўзроўню павінна быць выпрацавана справядлівая, адзіная сістэма фарміравання, стабільная база нарматываў адлічэння хоць бы на некалькі гадоў. Гэта дазволіць эфектыўна выкарыстоўваць фінансавыя сродкі і стымуляваць напаўненне бюджэту. У выніку ў кожнага органа мясцовага кіравання і самакіравання будзе магчымасць выконваць свае канкрэтныя функцыі і стымуляваць выкананне бюджэту.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Лідскі раён.

НОВЫЯ ЗАДАЧЫ І НОВЫЯ ПАДАТКІ

Стаўка адзінага падатку ў Магілёўскай вобласці павялічана паводле рашэння апошняй сесіі Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў

Гэтым самым зроблены першы крок па выраўноўванні ўмоў дзейнасці прыватных унітарных прадпрыемстваў, у якіх падатковая нагрузка большая, і індывідуальных прадпрымальнікаў. У сярэднім адзіны падатак для «індывідуалаў» павышаецца на 30 працэнтаў. Аднак распрацаваны і спецыяльныя каэфіцыенты — для розных груп гарадоў. А ў сельскай мясцовасці для заахвочвання прыватнай ініцыятывы будзе ўжывацца ніжэйшы каэфіцыент — 0,5.

Найбольш часу на сесіі дэпутаты прысвяцілі абмеркаванню дзвюх справаздач за 2007 год: рабоце аблвыканкама па сацыяльна-эканамічным развіцці вобласці і прэзідыума аблсавета па павышэнні ролі органаў мясцовага самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва. Працу абодвух органаў улады — выканаўчай і прадстаўнічай — дэпутаты прапанавалі прызнаць здавальняючай.

Аднак у выступленнях з трыбуны прагучалі і крытычныя заўвагі. Напрыклад, лідара абласной ветэранскай арганізацыі Анатоля Любчанку і яго выбаршчыкаў хвалюе адмена льготаў. Зразумела, зазначыў ён, закон прыняты і з ім не выпадае спрачацца, але людзі цяжка прывычайваюцца да новых умоў, і ўлада ў сілах гэты працэс змякчыць.

— Напрыклад, можна зрабіць бясплатны праезд для школьнікаў у транспарце, — прапанаваў Анатоль Любчанка. — Я размаўляў з жанчынай, якая разважала, ці можа дазволіць сыну займацца спортам у Лядовым палацы. Некалькі дзесяткаў тысяч каштуюць заняткі плюс праязны білет. Вырашыла, што аздараўленне не па кішэні: няхай дзіця будзе на вуліцы. А вуліца — дрэнны выхавальнік.

З іншага боку, дэпутата трывожаць праявы ўтрыманства ў людзей. Напрыклад, у арганізацыю са скаргай звярнулася дачка ветэрана вайны, які памёр больш за дзесяць гадоў таму: маўляў, магіла разбураецца, якое бязладдзе! І як растлумачыць жанчыне, што догляд магіл бацькоў — гэта ў першую чаргу абавязак дзяцей?

Старшыня Чэрыкаўскага раённага Савета дэпутатаў Наталля Гатоўчык у сваім выступленні прапанавала адрадзіць практыку ўвядзення мясцовых збораў на развіццё інфраструктуры. Паводле яе слоў, калі людзі зробяць свой грашовы ўклад, будуць больш ашчадна ставіцца да таго, што навокал іх.

Старшыня Кіраўскага райвыканкама Анатоль Ісачанка заклікаў з трыбуны ўдасканальваць сістэму мясцовага самакіравання і абуджаць працоўную актыўнасць і ініцыятыву людзей.

Працу сельскіх Саветаў закрануў старшыня Пастаянай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Анатоль Малафееў. Ён знаходзіўся пад уражаннем ад наведвання лепшых сельсаветаў Магілёўскага раёна, куды, паводле яго меркавання, «не сорамна прывезці і замежную дэлегацыю».

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ПОВЫШЕНИЕ КВАЛИФИКАЦИИ

УЧИТЬСЯ НИКОГДА НЕ ПОЗДНО

— Валерий Павлович, раз уж мы с вами говорим о повышении квалификации руководителей именно первичного звена власти, расскажите, в чем заключается специфика этой аудитории?

— Специфика, во-первых, обусловлена тем, что это низовой уровень вертикали. Он формируется из жителей сельских населенных пунктов. Председатели сельских Советов приходят к руководству территорией на выборной основе и являются представителями двух ветвей власти одновременно. Это, как правило, люди, умудренные жизненным опытом, прошедшие определенную школу руководства — предприятиями, сельскохозяйственными кооперативами, учреждениями. Отсюда и средний возраст аудитории — 40—50 лет.

Что отличает данную категорию? Прежде всего это труженики, что сказывается и на их отношении к учебе. Ведь председатель сельисполкома постоянно находится на острие людских отношений — со всеми бедами, проблемами идут к нему. Руководители первичного звена власти привыкли интенсивно работать, быть в курсе всех событий у себя на местах, и эти же качества переносят на учебный процесс. В такую аудиторию приятно нести знания — она не просто слушает, она активно реагирует на новую информацию, принимает участие в диспутах, вступает в дискуссии.

Мы не стремимся жестко подходить к оценке знаний. По окончании курсов все учащиеся пишут выпускные работы по одной из проблем. С одной стороны, они должны изложить, обобщить, проанализировать свой опыт, показать, что у них на местах в этом направлении делается, а с другой — увидеть пути решения данной проблемы, направленные на развитие территории. Но написать работу — это полдела. Ее нужно еще и защитить. На защите, собственно, и выявляется, кто на что способен.

В соответствии с положением Указа Президента № 21 «О повышении роли органов местного управления и самоуправления в решении вопросов жизнеобеспечения населения», на базе Института высших управленческих кадров Академии управления при Президенте Республики Беларусь один раз в три года повышают квалификацию председатели исполкомов первичного уровня и их заместители.

О том, как сегодня организован процесс обучения руководителей низового звена, какие «предметы» входят в обязательную программу слушателей курсов и есть ли возможность «увязывать» теорию с практикой, я попросила рассказать директора Института высших управленческих кадров Валерия КЛОЧКОВА.

Наша задача, прежде всего, состоит в том, чтобы помочь человеку разобраться, в каком направлении он недорабатывает, где ему нужно «подтянуться», на что следует обратить более пристальное внимание. На это мы ориентируем и преподавателей — чтобы они могли оказать помощь аудитории, проконсультировать ее в ходе занятий по тем или иным проблемам. То есть, это не столько контроль знаний, сколько стремление к сотрудничеству со слушателями.

Кстати, анализ социологических исследований, которые мы проводили с большой группой председателей сельских Советов, показал, что подавляющее большинство из них имеют высшее образование. Примерно третья часть закончили агротехнические вузы, 25 процентов — педагоги, еще 25 процентов — экономисты и 15 процентов — инженеры.

— И какая из перечисленных категорий более «приспособлена» к обязанностям руководителя первичного звена?

— Руководитель первичного уровня власти, как и любого другого уровня, — это должность, которая требует не каких-то определенных знаний, а целого их комплекса. Например, инженерная логика позволяет более конкретно и четко решать какие-то вопросы, ставить задачи. Педагог или любой другой гуманитарий, возможно, выигрывает с точки зрения общения с людьми... Поэтому нельзя однозначно определить, чей «диплом» больше подходит для этой долж-ности. Сегодня председатель сельского Совета, исходя из своих обязанностей, решает ряд вопросов самого разнообразного характера — начиная от экономических, юридических, хозяйственных и заканчивая личностными, отношенческими. Хочет он или нет — а должен «подтягивать» свои знания по всем этим направлениям. В какой-то степени здесь помогаем мы. А вообще главным «учителем» выступает сама жизнь, приобретенный с годами опыт.

— Зачастую в аудитории собираются люди, имеющие разный уровень подготовленности, знаний по тем же экономическим, юридическим вопросам. Можете ли вы корректировать программу в зависимости от потребностей аудитории?

— Регулярно перед началом занятий каждой группы мы проводим анкетирование, пытаясь определить, в каких знаниях нуждаются слушатели, чтобы потом заполнить эти пробелы. Это помогает увидеть, насколько наши учебные планы соответствуют запросам аудитории. Например, в экономических знаниях сегодня нуждается почти 26 процентов председателей сельских Советов, в умении четко формулировать стратегические цели управления — 16 процентов, научиться ориентироваться в происходящих социально-экономических и политических процессах хотели бы 24 процента этой категории слушателей... В основном, конечно, нам удается практически полностью учитывать специфику работы руководителей этого звена. Но иногда уже в процессе обучения приходится ориентировать преподавателей на то, чтобы они в своих лекциях осветили не предусмотренный ранее вопрос — если тот вызывает живой интерес аудитории. Не обязательно для этого вводить какой-то новый курс или новый предмет — достаточно раскрыть тему в рамках уже имеющихся. Кстати, в этом году, идя навстречу пожеланиям слушателей, мы ввели в программу факультатив по информатике — обучаем желающих работе на компьютере.

— В соответствии с указом № 21 «О повышении роли органов местного управления и самоуправления в решении вопросов жизнеобеспечения людей», Академии управления при Президенте Республики Беларусь было поручено разработать учебные планы повышения квалификации председателей первичного звена власти. После подписания указа прошел год. Произошли ли за это время какие-то изменения?

— Естественно, произошли. И в первую очередь это касается взаимодействия нашего института с областными учебными центрами. Ведь у нас учатся — если брать первичное звено — только председатели сельских Советов. А на областном уровне проводятся семинары и для секретарей сельисполкомов, и для старост. Поэтому мы разработали программы семинаров для данных категорий, подготовили и направили в областные учебные центры учебно-тематические планы.

(Окончание на 2-й стр. «МС».)

ГАРАДОК з візітнай карткай

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Цяпер вакзал, як з гонарам называюць аўтастанцыю гарадчукі, і сабе на радасць, і іншым у прыклад. Побач з аўтастанцыяй нарэшце займеў сталую прапіску рынак. Уведзены ў эксплуатацыю яшчэ адзін важны сацыяльна-аздараўленчы аб'ект — стадыён, які адразу стаў любімым месцам многіх жыхароў. Адбылася рэканструкцыя СШ № 2, вядзецца яна і ў першай школе.

Горад сапраўды нібы памаладзеў, пасвятлеў. І нават негалоўныя вуліцы цяпер таксама «бяруць прыклад» з цэнтра і цягнуцца да парадку. Уладзімір Галавач акрэсліў існуючую давыд-гарадоцкую сістэму ў вырашэнні гэтай, здаецца, вечнай праблемы. У горадзе створана 14 умоўна-квартальных вулічных камітэтаў, ад якіх паступаюць прапановы і заяўкі на правядзенне тых ці іншых работ. Выканкам на сваіх пасяджэннях уключае іх у план, і, калі неабходны фінансавыя затраты, закладвае гэта ў бюджэт.

Але глабальнай праблемай горада (ужо, можна сказаць, састарэлай) застаецца занятасць працаздольнага насельніцтва, развіццё вытворчасці, стварэнне працоўных месцаў. Як вельмі густанаселены, Давыд-Гарадок заўсёды меў у гэтым праблему. Але асабліва востра паўстае гэта пытанне цяпер. З 3483 чалавек працаздольнага ўзросту працу маюць толькі 1518 чалавек — меней за 50 працэнтаў.

— У 1961 годзе адбывалася ўзбуйненне раёнаў, і Давыд-гарадоцкі быў далучаны да Столінскага. Развіццё былога райцэнтра спынілася, некалькі мясцовых прадпрыемстваў, якія не адпавядалі сучасным нормам, закрыліся. Насельніцтва яшчэ не ведала стыхіі вялікай міграцыі, і, каб выжыць, тут пачалі развозіць кветкі і займацца вытворчасцю насення. Рынкам збыту быў Савецкі Саюз. Ад Брэста да Курыл. З лютага па чэрвень — амаль пяць месяцаў — ехалі на «вэсну», як казалі і кажуць гарадчукі пра свой нялёгкі бізнэс. І ён усё ж дапамог ім і выжыць, і самазахавацца.

Вырашальным у гэтай праблеме стаў 1976 год, калі з'явілася першае прадпрыемства па выпуску прадукцыі абароннага значэння. Спачатку яно месцілася ў старым будынку колішняга масласырзавода і было ўсяго толькі цэхам брэсцкага электрамеханічнага завода. Потым на плошчы ў 35 тысяч квадратных метраў пачалося ўзвядзенне сучасных прамысловых карпусоў з тым разлікам, што на прадпрыемстве будзе задзейнічана як мінімум дзве тысячы чалавек. Паралельна ствараліся і буйная камунальная сістэма, узводзіўся жылы мікрараён, для моладзі

Гарсавет нагадвае сапраўдны вулей...

— інтэрнаты. З навакольных вёсак Альшаны, Велямічы і нават Рубля на завод вазілі моладзь аўтобусамі. На прадпрыемстве ўжо працавалі 1200 чалавек і было яно ў поўным сэнсе горадаўтваральным. З'явіліся і яшчэ два прадпрыемствы — інструментальны і хлебазавод. Да 1995 года сітуацыя з працай і занятасцю насельніцтва заставалася больш менш стабільнай, калі не сказаць добрай.

А потым — спад, як вынік канверсіі і распаду СССР. Якніяк завод уваходзіў у абаронную сістэму краіны і падпарадкоўваўся Міністэрству радыёпрамысловасці. І раптам стаў незапатрабаваны. Закрыццё вытворчасці, скарачэнні, звальненні — усё гэта было ужо як следства. У выніку толькі каля 400 чалавек засталіся на электрамеханічным, якому Уладзімір Мікалаевіч аддаў 23 гады жыцця. Пачынаў механікам-энергетыкам, быў галоўным інжынерам, будаваў новы завод і дзевяць гадоў кіраваў ім. Цяжка перажываў, калі ўсё на вачах гінула.

— І ўсё-такі мы вырашылі зноў рабіць стаўку на вытворчасць, — дзеліцца планамі старшыня гарвыканкама. — Па-першае, будзем развіваць завод і разам з ім сацыяльную сферу. Ужо адкрыты і працуе цэх па вырабе пускавых рэле для халадзільнікаў мінскага завода «Атлант». Там занята 106 чалавек. Ёсць цэх, які выпускае прадукцыю для брэсцкага завода газавай апаратуры «Гефест», дзе працуе 69 чалавек. Арганізавана вучоба кадраў для выпуску іншай запатрабаванай прадукцыі. У 2007-м у горадзе ўдалося стварыць 141 дадатковае працоўнае месца, і не толькі на вытворчасці, але і ў сацыяльнай сферы, у прыватным сектары. Але гэтага яшчэ недастаткова.

Планы горада, вядома ж, грандыёзныя. На базе колішняй вайсковай часці запланавана адкрыццё вытворчага ўчастка ПМК-24, ствараецца раствора-бетонны вузел для ўсяго Столінскага раёна. Запланаваны некалькі аўкцыёнаў па продажы пустых плошчаў спыненых прадпрыемстваў — новым вытворчасцям, зразумела, спатрэбяцца і працоўныя рукі. Давыд-Гарадок уключаны ў маштабную дзяржаўную праграму па развіцці малых гарадоў, і тут ускладаюць вялікія спадзяванні на развіццё прыватнай ініцыятывы насельніцтва, малога бізнэсу. Бо і дагэтуль паўтары тысячы гарадчукоў працаздольнага ўзросту паранейшаму вымушаны выязджаць у пошуках дадаткова-га заробку. Вядома, будзе больш карысна, калі яны рэалізуюць сваю энергію на роднай зямлі.

У планах бягучых і заўтрашніх — правядзенне газіфікацыі. Газ, які прыйшоў сюды ў 2003-м, сёння ўжо стаў звычайнай бытавой з'явай усёй заходняй часткі населенага пункта. А вось іншую палову — зарэчную — яшчэ трэба ўладкаваць, абагрэць. Таму адзін з клопатаў гарвыканкама — стварэнне адпаведных кааператываў. Вада — таксама клопат мясцовай вертыкалі. Не сакрэт, што радыяцыйнае чарнобыльскае забруджванне не абмінула і гэты край. Ва ўсходняй частцы дагэтуль людзі карыстаюцца адкрытымі воднымі крыніцамі — студнямі, а гэта азначае, што вада ў ежу гарадчукоў трапляе верхавая, неачышчаная.

— Ад водаачышчальнай станцыі, якая знаходзіцца на самым захадзе гарадка, да самай усходняй яго кропкі пяць кіламетраў, такі вялікі наш гарадок, — кажа Уладзімір Галавач. — Але ў наступным годзе чыстая вада з'явіцца і там. Хоць гэта, паверце, здзейсніць будзе зусім нялёгка...

І ўсё ж артыкул будзе няпоўным, калі не сказаць, што старшыня Давыд-Гарадоцкага гарсавета і гарвыканкама, дэпутат Столінскага райсавета Уладзімір Галавач — патомны гарадчук, скончыў першую гарадоцкую школу, беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, адслужыў армію. Як і ўсе гарадчукі, пабудаваў свой уласны дом, стварыў сям'ю і ганарыцца сваёй малой Радзімай.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.
Столінскі раён.

УЧИТЬСЯ НИКОГДА НЕ ПОЗДНО

(Окончание. Начало на 1-й стр. «МС».)

Как известно, Указ № 21 завершил построение вертикали власти, расставил окончательные акценты, определил функции первичного уровня власти. Сельские и поселковые Советы стали очень важным звеном этой вертикали, так как работают непосредственно с людьми. Именно этот фактор мы сегодня стараемся учитывать в наших планах — стремимся научить аудиторию работать так, чтобы потом меньше проблем возникало на местах. Чтобы вышестоящие инстанции не получали жалоб на невнимательность и даже грубость работников первичного звена.

С учетом требований Указа № 21 мы дополнительно разработали и согласовали с Министерством образования типовой учебный план повышения квалификации председателей сельских Советов. Совместно с областными исполнительными комитетами определили базовые организации для проведения практических занятий — чтобы учебный процесс состоял не только из теоретического курса, но и имел прикладной характер. Сегодня наши слушатели могут увидеть, как в реальной жизни воплощаются установки, прописанные не только в Указе № 21, но и в других регламентирующих их деятельность документах.

— По каким программам сегодня проходят обучение председатели сельисполкомов? На что здесь делается упор?

— Как я уже сказал, больше внимания стали уделять практическим занятиям — учитывая то, что 40—50 процентов председателей сельисполкомов, приезжающих на курсы, работают в этой должности немногим больше года. Поэтому строим учебный процесс так, чтобы во время занятий более опытные руководители могли поделиться знаниями с начинающими. Такие смешанные группы как раз и дают больший эффект в плане результатов работы. Ведь слушатели контактируют друг с другом не только в стенах аудитории, но и за ее пределами. И таким образом, обмениваясь мнениями и опытом, обретают дополнительные знания. В конечном счете люди получают ту информацию, за которой они сюда приехали.

Что касается непосредственно учебного процесса, то он делится на тематические блоки вопросов. Например, один из таких блоков предполагает изучение нормативно-правовых документов, которые регламентируют деятельность низового звена. Это особенно необходимо для вновь избранных председателей сельских Советов — они еще очень слабо представляют себе правовую базу своей деятельности. Поэтому мы приглашаем сюда и конкретных разработчиков нормативных документов, и членов Конституционного Суда, и работников различных министерств...

Это уже другой уровень образования, нежели в вузе, рас-

Руководители первичного звена власти привыкли работать интенсивно и эти же качества переносят на учебный процесс.

считанный на конкретную целевую аудиторию и ее потребности. Рассматриваем, например, некоторые вопросы социально-экономического развития республики на современном этапе. Читать весь курс экономики нет необходимости — сюда приезжают повышать квалификацию люди с высшим образованием, в свое время уже получившие знания по этому предмету. Мы должны дать им новые подходы, научить решению конкретных проблем. Задача, которая сегодня стоит перед преподавателями, работающими в нашей системе, — это инновационное образование, то есть, умение давать знания, которые могли бы подталкивать человека к решению проблем завтрашнего дня, нацеливать его на перспективу.

— Но можно владеть всеми азами экономики и быть при этом плохим руководителем, не уметь работать в коллективе, не понимать, как правильно налаживать отношения с людьми...

— Хочу сказать, что в структуре учебного плана мы уделяем достаточно внимания вопросам психологии управления. Помимо соответствующих лекций, большой популярностью пользуются психологические тренинги, которые позволяют каждому руководителю увидеть себя со стороны в различных жизненных ситуациях, смоделированных в ходе занятий. Кстати, наши слушатели часто просят увеличить количество часов, отведенных под практические занятия. Но в рамках десятидневного обучения, и без того очень насыщенного, сделать это очень сложно.

— Насколько я знаю, ваш институт активно сотрудничает с Советом Республики Национального собрания Республики Беларусь...

— Это сотрудничество началось у нас пять лет назад. Оно стало еще более тесным, когда в соответствии с Указом № 21 Совету Республики было рекомендовано образовать Совет по взаимодействию органов местного самоуправления. После этого мы получили уже и правовую основу для того, чтобы обращаться к ним за помощью. Члены Совета Республики приходят к нам в институт и проводят практические занятия с председателями первичного звена. В последнее время стала популярной такая форма их совместной работы, как проведение «круглых столов», в ходе которых происходит активный обмен мнениями. Такие встречи ведут к взаимному обогащению сторон. Председатели сельских Советов могут получить ответы на интересующие их вопросы, что называется, из первых рук. В то же время и члены Совета Республики подпитываются информацией с мест.

Кроме этого, мы активно сотрудничаем с Министерством экономики, Министерством труда и социальной защиты, с Конституционным, с Высшим хозяйственным судом да и многими другими государственными структурами. Хочу сказать, что они всегда откликаются на наши просьбы, так как отлично понимают, что все программы, принимаемые сегодня на высшем уровне, в конечном итоге реализуются на местах. И если до сознания исполнителей не будет доведена четкая государственная линия, то и ожидаемого результата мы можем не получить.

Беседовала
Наталия КАРПЕНКО.

ПАЛЁТ ДУШЫ ВЫСОКАЙ

У Вілейцы на будынку Дома Саветаў па ініцыятыве дэпутатаў райсавета ва ўрачыстай абстаноўцы была адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар Пятра Машэрава. Яшчэ ў гады вайны ён ўзначальваў Вілейскі падпольны абкам камсамола, працягваў быць яго першым сакратаром і адразу пасля вызвалення горада.

Ля будынка Дома Саветаў (месца, дзе працаваў у 1944—1945 гадах Пётр Машэраў) сабраліся тыя, хто ведаў Пятра Міронавіча. Працягвалася ўрачыстасць у раённым выканаўчым камітэце, дзе быў паказаны відэафільм пра Машэрава «Палёт душы высокай», падрыхтаваны журналістамі мясцовай газеты. Цікавыя дакументы з архіва вілейскага краязнаўчага музея прадставіла яго старшы навуковы супрацоўнік Вольга Коласава.

Мікалай Судніковіч, які некалі ўзначальваў Асіпавіцкі сельскі Савет, расказаў як па рэкамендацыі Машэрава ўдзельнічаў у пасяджэнні ўрада. Візіт Машэрава ў Асіпавічы быў нечаканы. Ён прыехаў без папярэджання, прапанаваў разам праехаць па тэрыторыі сельсавета. Вынікам гэтай паездкі стала запрашэнне старшыні сельскага Савета на пасяджэнне Савета Міністраў і абагульненне работы мясцовага органа ўлады ў маштабах рэспублікі.

Марыя КУЗАЎКІНА,
дэпутат Вілейскага раённага Савета дэпутатаў.

НОВЫЯ ЗАДАЧЫ І НОВЫЯ ПАДАТКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Яшчэ 3—4 гады таму падобнага не было, — прызнаў Анатоль Малафееў. — А цяпер ёсць сістэма працы з людзьмі. Менавіта на зносіны з людзьмі перанесены націск у працы. І калі ёсць сістэма — будзе і вынік. Сельскія Саветы з'яўляюцца асноўнай уладай на месцах. І самае галоўнае цяпер — «варушыцца», знаходзіць паразуменне з выканаўчай уладай і ўважліва ставіцца да людзей.

Менавіта работы сельскіх Саветаў датычылася прапанова старшыні Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў Валерыя Свістунова. Ён прасіў старшыню абласнога Савета Уладзіміра Панцюхова выйсці з прапановай у рэспубліканскі Савет па ўзаемадзеянні, каб упарадкаваць штаты сельвыканкамаў. Паводле слоў Свістунова, яны лагічна павінны залежаць ад тэрыторыі, колькасці населеных пунктаў і насельніцтва — бо ад гэтага залежыць аб'ём працы.

Паводле справаздачы прэзідыума абласнога Савета, летась было шмат зроблена для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы мясцовых Саветаў, і ў першую чаргу — пярвічнага ўзроўню. На гэта было выдаткавана больш за 5 мільярдаў рублёў. Усе сельсаветы забяспечаны мабільнай сувяззю і камп'ютарнай тэхнікай. Па графіку вядзецца рамонт і завяршаецца абнаўленне парка службовых аўтамабіляў.

Цяпер ад сельскіх Саветаў чакаюць далейшага паляпшэння працы. І тут можна раўняцца на лепшых: на сесіі былі падведзены вынікі спаборніцтва сярод органаў мясцовага самакіравання Магілёўскай вобласці за мінулы год.

Лепшым названы Гарбацэвіцкі сельскі Савет Бабруйскага раёна. Яго старшыні Галіне Гаўрыльчык уручылі пераходны сцяг і прэмію ў 500 базавых велічынь. Другое месца заняў Лабжанскі сельсавет Клімавіцкага раёна, а трэцяе — Княжыцкі сельсавет Магілёўскага раёна.

Пераможцай спаборніцтва сярод органаў тэрытарыяльнага самакіравання стала стараста вёскі Горкі Чэрыкаўскага раёна Галіна Баброва, якая атрымала прэмію ў 50 базавых велічынь. Дыпломамі другой і трэцяй ступені ўзнагароджаны староста вёскі Маляцічы Крычаўскага раёна Любоў Ратабыльская і староста вёскі Бабірава Глускага раёна Ала Храпко.

Між тым, пра неабходнасць напружана працаваць нагадаў кіраўнік выканаўчай улады вобласці Барыс Батура.

Летась Магілёўская вобласць выканала ўсе прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця, а вось за сёлетнія першыя два месяцы, паводле папярэдніх падлікаў, гэта наўрад ці ўдасца. Размова тут ідзе не толькі аб рабоце выканаўчай улады: Уладзімір Панцюхоў лічыць, што ўклад дэпутацкага корпуса ў справу выканання прагнозаў пакуль неапраўдана нізкі.

На сесіі выступіў старшыня Камітэта дзяржкантролю рэспублікі Зянон Ломаць. Ён расказаў пра памылкі, парушэнні і недапрацоўкі, якія выявілі кантралёры летась. Іх было нямала, і калі ліквідаваць пралікі, то гэта дазволіць як мінімум на 10—20 працэнтаў павялічыць выніковасць працы.

Барыс Батура лічыць, што можна дасягнуць і большага, калі рабіць усё так, як трэба. Без дадатковых капітальных укладанняў, а проста за кошт навядзення парадку. Калі прытрымлівацца тэхналагічнай дысцыпліны ў сельскай гаспадарцы, упэўнены кіраўнік вобласці, можна даваць больш прадукцыі і, у канчатковым выніку, жыць лепей.

— Усю энергію, працаздольнасць і веды трэба накіраваць на тое, каб прагнозныя паказчыкі першага квартала ў Магілёўскай вобласці былі выкананы, — сказаў на сесіі Барыс Батура. — Калі ўсім разам працаваць на адзіны вынік, то мы справімся.

Ілона ІВАНОВА.

ПАПАЎСЯ...

Суд Кастрычніцкага раёна Віцебска прыгаварыў грамадзяніна Чэхіі да штрафу ў Br29 млн за дачу хабару мытніку

Грамадзянін Чэшскай Рэспублікі Францішак Рохл прызнаны вінаватым у дачы хабару супрацоўніку Віцебскай мытні — інспектару аддзела мытных расследаванняў і прыгавораны да штрафу ў памеры Br29 млн і канфіскацыі 5 тыс. долараў, прызначаных для ўзнагароды. Такі прыгавор вынес суд Кастрычніцкага раёна Віцебска, паведамілі ў прэс-групе ўпраўлення КДБ па Віцебскай вобласці.

Іншаземец з'яўляўся ўладальнікам перасоўнага атракцыёна «Луна-парк», на які быў накладзены арышт супрацоўнікамі мытні. У мытных дакументах быў указаны заніжаны кошт атракцыёна і патрабавалася правесці перарацэнку для перадачы справы ў суд. Францішак Рохл звярнуўся да інспектара мытні з просьбай не праводзіць ацэнку маёмасці, прыняўшы раней указаную ў дакументах, і паабяцаў яму за гэта ўзнагароджанне ў памеры 5 тыс. долараў.

Пры перадачы хабару грамадзянін Чэхіі быў затрыманы супрацоўнікамі УКДБ.

Інспектар аддзела мытных расследаванняў, які заявіў аб прапанаваным яму хабары, заахвочаны кіраўніцтвам.

Дзіяна КУРЫЛА, БЕЛТА.

ДОМ-ІНТЭРНАТ — НА КРАЙНІ ВЫПАДАК

У Віцебскай вобласці з 517 будынкаў і збудаванняў, што належаць дамам-інтэрнатам, толькі 6 аб'ектаў па сваім тэхнічным стане ўжо непрыдатныя для далейшай эксплуатацыі і будуць знесены, 16 трэба рэканструяваць і капітальна рамантаваць. Па сёння эксплуатуецца Дунілавіцкі псіханеўралагічны дом-інтэрнат у Пастаўскім раёне, што будаваўся і перабудоўваўся ў 1870—1930 гады. Тут жылыя карпусы не маюць ні водаправода, ні каналізацыі. Аналагічнае становішча і ў большасці карпусоў Аляксандраўскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната Шаркоўшчынскага раёна. З-за дрэннага стану больш не эксплуатуецца жылы корпус Віцебскага абласнога тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання ветэранаў і інвалідаў, пабудаваны ў 1959-м...

У апошнія гады значную ролю ў жыцці грамадзян, якія часткова не могуць абслугоўваць сябе, адыгрываюць тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Іх на Віцебшчыне ўжо 27, і ў бліжэйшым будучым ім адводзіцца галоўная роля.

Як падлічылі спецыялісты, выдаткі на ўтрыманне аднаго чалавека ў аддзяленні кругласутачнага знаходжання ў два разы меншыя, а пры абслугоўванні спецыялістамі цэнтраў дома — амаль у 10 разоў меншыя ў параўнанні з выдаткамі на іх пражыванне ў доме-інтэрнаце. На жаль, у 13 аддзяленнях кругласутачнага знаходжання адсутнічаюць свабодныя месцы і існуе чарга на пасяленне.

Як адзначае намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Пётр Южык, дзейнасць цэнтраў дазваляе адзінокім і адзінока пражываючым пажылым і непрацаздольным грамадзянам максімальна доўга заставацца ў прывычнай для іх хатняй абстаноўцы і перасяляцца ў дом-інтэрнат толькі тады, калі ўсе магчымасці нестацыянарных формаў сацыяльнага абслугоўвання будуць выкарыстаныя.

На працягу апошніх гадоў у Віцебскай вобласці павялічваецца колькасць адзінокіх і адзінока пражываючых пенсіянераў і інвалідаў I і II груп. Колькасць грамадзян, якія абслугоўваюцца аддзяленнямі сацыяльнай дапамогі дома, пачынаючы з 2003 года пастаянна расце. Паводле даных на канец 2007 года, яна перавысіла 12 тысяч чалавек.

У сельскай мясцовасці вельмі запатрабаваны разавыя сацыяльныя паслугі: колка дроў, рамонт дома, работа на агародзе, дапамога сядзелак. Таму, як лічаць адказныя асобы ў Віцебскім аблвыканкаме, ёсць неабходнасць у стварэнні сацыяльных пунктаў у далёкіх вёсках. Неабходна развіваць сетку аддзяленняў кругласутачнага знаходжання, набываць транспарт і абсталяванне для забеспячэння дзейнасці цэнтраў па аказанні паслуг насельніцтву.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«ШИШКИ» ЦЕНТРАЛИЗОВАННОЙ БУХГАЛТЕРИИ

(Окончание. Начало на 1-й стр. «МС».)

— Многие председатели неправильно понимают его предназначение, — подчеркнула Кругликова, — и начинают использовать его на те цели, под которые деньги должны выделяться из бюджета базового уровня. Вы можете направить средства резервного фонда на финансирование каких-то ваших социально-культурных программ («Чистый двор», например) или региональных, участниками которых вы являетесь.

Николай БОРОДИН, председатель Радваничского сельского Совета депутатов Брестского района:

— Скажите, могу ли я из своего резервного фонда дать местному жителю к юбилею кроме грамоты сельисполкома, одну «минималку»? И еще один вопрос: почему в Указе № 21 прописано, что при продаже недвижимости, находящейся на территории сельсовета, мы по усмотрению района можем получить до 50 процентов от налога на прибыль? Почему просто не записать «50 процентов»?

Зоя КРУГЛИКОВА:

— По первому вопросу. Существует положение об образовании и использовании резервного фонда. Порядок его формирования и использования устанавливается областным Советом депутатов. Надо взять соответствующее решение и изучить. Возможно, там найдется «лазейка». Вообще, резервный фонд формируется на случай каких-то ЧП. Допустим, подорожали энергоресурсы. В бюджете это не предусмотрено. Пожалуйста — сюда можно направить средства резервного фонда. Кроме того, он используется для проведения мероприятий сельисполкома и для помощи малоимущим.

По второму вопросу. У нас есть Закон «О местном самоуправлении». В рамках предоставленных им полномочий (учитывая, что эта коммунальная собственность все-таки не ваша, а только находится на вашей территории), район определяет размер дохода сельисполкома от продажи недвижимости.

Анатолий ШАВАНОВ, председатель Ходосовского сельского Совета депутатов Мстисловского района:

— Раньше у нас был подоходный налог. Теперь — налог с продаж. В чем разница? Нам все равно выделяется какой-то процент, наш бюджет формируется районными службами... И еще: хочу обратиться с просьбой, чтобы упразднили централизованную бухгалтерию. Она внесла такую неразбериху, что ни один проверяющий теперь не может разобраться.

Зоя КРУГЛИКОВА:

— Вопрос о подоходном налоге остается открытым. Эта проблема пока не решена. Ее надо обсуждать. Только внесение дополнений в законодательную базу может что-то исправить. В любом случае — подоходный налог или налог с продаж — будет отдаваться не целиком, а служить способом регулирования.

Что касается централизованной бухгалтерии, это сделано для экономии государственных ресурсов, в рамках внедрения механизации, компьютеризации и т.д. Теперь 2—3 специалиста в районе обслуживают все сельсоветы.

Анатолий ШАВАНОВ:

— Сокращение штата у нас прошло: раньше был счетовод-кассир, который занимался сбором налогов, и главный бухгалтер. Теперь эти должности объединены.

Зоя КРУГЛИКОВА:

— Счетовод-кассир «ушел», когда создались налоговые органы. Сбор налогов — это их работа. Что касается расцентрализации бухгалтерии, учтите: у нас политика на сокращение административно-управленческих расходов. Но бухгалтеры не входят в лимит численности госаппарата, поэтому попробуйте решить этот вопрос на районном уровне. На мой взгляд, наверное, поголовную централизацию проводить не стоило.

Василий КОРОЛЬ, председатель Вселюбского сельского Совета депутатов Новогрудского района:

— У нас в районе тоже была централизованная бухгалтерия. За 1,5 года набили столько шишек, что в результате было принято решение вернуть все назад. Теперь у нас снова в каждом сельисполкоме свой бухгалтер.

Анатолий МАЛОФЕЕВ:

— Вспомните, что получилось с землеустроителями. Из сельисполкомов их забрали. Предполагалось, что они из района на места будут четко выезжать по графику. Но ведь графики эти нарушаются! Процессы не регулируются, не управляются. Значит, вопрос — в конкретном человеке! Не нужно работать, как отбойный молоток. Вопросы вы можете ставить любые, но вам нужно адаптироваться к тем районным службам, с которыми вы взаимодействуете. Мы еще не привыкли работать, как деловые люди.

Алексей ШАРШУН, председатель Светлосельского сельского Совета депутатов Шумилинского района:

— Раньше председатели сельских Советов имели в основном представительскую функцию, сегодня мы выполняем много практической работы. И не укладываемся в лимит километров пробега. После 20-го, 25-го числа мы все ездим на своем бензине...

Зоя КРУГЛИКОВА:

— Кто утверждает лимит? Выходите на район. Что касается лимитированных расходов по аппарату управления, вы знаете, что существуют рамки, в которые нужно укладываться. Радуйтесь, что у вас есть машина, а не велосипед.

Ольга КОЖЕВА, председатель Полыковичского сельского Совета депутатов Могилевского района:

— Зоя Николаевна, поясните вашу фразу касательно сбора налогов на территории сельсовета. У нас этим занимается специалист первой категории. Тратит очень много времени. В прошлом году 95 процентов всех поступивших налогов по сельсовету (порядка 53 процентов) она подала лично через свои квитанции. Кто же все-таки должен собирать налоги?

Зоя КРУГЛИКОВА:

— Вы, сельские Советы, тоже участвуете в этой работе, но начисление, уплата налога, квитанции, лицевой счет — все это круг забот налоговых органов. Если у вас па-другому поставлена работа, нужно поднимать этот вопрос, принимать решение.

Записала
Инга МИНДАЛЕВА.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;
САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;
СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;
СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;
ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292 21 03.

Краіна здароўя

Выпуск № 10 (66)

Раіць спецыяліст

Вясна — не лепшы час для язвеннікаў

Звычайна ў міжсезонне абвастраюцца многія хранічныя хваробы. У тым ліку вясной і восенню нагадвае аб сабе язвавая хвароба. Чаму — версій многа. У міжсезонне зніжаецца актыўнасць страўнікава-кішачнага тракта, у гэты час змяняецца кіслотнасць страўніка. Да таго ж вясной у нашым рацыёне не хапае вітамінаў В і С, неабходных для натуральнага аднаўлення слізістай абалонкі страўніка.

Хварэюць людзі працаздольнага ўзросту (30—50 гадоў), прычым мужчыны ў 8—10 разоў часцей, чым жанчыны. Як распазнаць прыметы абвастрэння язвы і як засцерагчы сябе ад яе пакутлівых прыступаў? Аб гэтым нам расказала фельчар-валеолаг дзяржаўнага прадпрыемства «Медыцынскі цэнтр-МТЗ» Антаніна ГОЛАД.

Пры абвастрэнні язвавай хваробы страўнік з'яўляецца боль у падлыжачнай вобласці, моташнасць, адрыжка, рвота, пякотка. Такія неўскладненыя формы язвавай хваробы лечацца амбулаторна ва ўрача-тэрапеўта ці ўрача-гастраэнтэролага.

Аднак 15 працэнтам пацыентаў з язвавай хваробай патрабуецца хірургічнае лячэнне. Такая неабходнасць узнікае пры развіцці ўскладненняў: прабадзенне, кровацячэнне, стэназіраванне, перайтварэнне язвы ў рак, неэфектыўнасць медыкаментознага лячэння і інш.

Пры прабадной язве страўніка ці дванаццаціперснай кішкі назіраецца разрыў сценкі страўніка, пры якім яго змесціва зліваецца ў брушную поласць, а потым развіваецца перытаніт. Прыметамі прабадзення язвы з'яўляецца рэзкі, падобны на ўдар нажом «кінжальны» боль у верхняй палове жывата. Хворы бляднее, пакрываецца халодным потам, ляжыць на баку, прыціскаючы ногі да жывата. Нават маленькі рух узмацняе боль. Пры падазрэнні на прабадзенне нельга прамываць хвораму страўнік, даваць есці ці піць, прымаць лекі праз рот. Патрэбна тэрміновая шпіталізацыя ў хірургічнае аддзяленне стацыянара.

Сур'ёзным ускладненнем язвавай хваробы з'яўляецца кровацячэнне з сасуда ў язве, які разбураецца з-за ўздзеяння на яго высокаактыўнага соку страўніка. Пашкоджваюцца сасуды рознага дыяметру, таму кровацячэнне можа быць мікраскапічным ці такім моцным, што выклікае смяротны зыход у бліжэйшыя гадзіны пасля ўзнікнення. Чым глыбейшая язва, тым больш буйныя сасуды пашкоджваюцца і тым мацней кровацячэнне. Прыметамі кровацячэння пры язвавай хваробе з'яўляюцца: рвота ярка-чырвонай кроўю ці колеру «кафейнай гушчы», чорны стул, слабасць, галавакружэнне, мільганне «белых мушак» перад вачыма, халодны, ліпкі пот, беспрытомныя станы, пачашчэнне пульсу, зніжэнне артэрыяльнага ціску. Хвораму неабходна стварыць строгі пасцельны рэжым, пакласці холад (пухір з лёдам) на жывот і тэрмінова выклікаць урача.

Каб не даводзіць да такіх крайнасцяў, язву лепей пралячыць. Звычайна ўрачы прызначаюць антыбіётыкі і прэпараты, якія зніжаюць агрэсіўнае ўздзеянне на сценкі страўніка салянай кіслаты (маалокс, фосфалюгель і г.д.). Спатрэбіцца і дыета, якая будзе складацца з кашаў, бульбянога пюрэ, адварнога мяса і гародніны. Вострыя і тлустыя стравы, а таксама салодкае на перыяд лячэння забараняюцца. Паляпшэнне, як правіла, наступае праз 3—4 дні, а на поўнае рубцаванне язвы ідзе паўтара месяца.

Каб язва не вярнулася зноў, трэба прытрымлівацца ў паўсядзённым жыцці пэўных правілаў.

❖ Не мучайце свой страўнік ні голадам, ні перайяданнем.

❖ Адмоўцеся ад грубай ежы з пакецікаў.

❖ Не ўжывайце алкагольныя напоі і не курыце. Нікацін і алкаголь узмацняюць выпрацоўку салянай кіслаты і перашкаджаюць ператраўліванню ежы.

❖ Будзьце асцярожныя з прыёмам лекаў. Ужыванне корцікастэроідных гармонаў і ацэтылсаліцылавай кіслаты можа справакаваць прыступ хваробы.

❖ Пазбягайце стрэсаў. Навукоўцы лічаць, што нервова-псіхалагічныя фактары — галоўны пускавы фактар хваробы.

❖ Не злоўжывайце антацыднымі прэпаратамі. Іх можна выкарыстоўваць толькі ў якасці экстраннай меры.

Вольга ШАЎКО.

«НА СТАМАТАЛОГІЮ Ў НАС САМЫЯ НІЗКІЯ ЦЭНЫ Ў СВЕЦЕ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А наконт завышаных цэнаў я не магу з вамі пагадзіцца. Справа ў тым, што ўсе прэйскуранты праходзяць абавязковы аналіз і ўзгадненне ў аддзеле цэнаў і цэнаўтварэння Міністэрства аховы здароўя. Сапраўды, цэны, устаноўленыя ў дзяржаўных арганізацыях, сёння ніжэйшыя, чым у прыватным сектары, але ні ў якім разе нельга рабіць на гэтай падставе высновы, што якасць стаматалагічных паслуг у нас горшая, чым у «прыватнікаў». Проста цэны ў дзяржаўным стаматалагічным сектары ў большай ступені адпавядаюць узроўню даходаў пераважнай часткі нашага насельніцтва. Я прывяду вам адзін толькі прыклад, як змяняўся кошт металакерамічнай каронкі за апошнія тры гады: спачатку пацыенты плацілі за каронку 7 долараў, затым 16 і 26 долараў ЗША. Зараз яна каштуе ў межах 50 долараў ЗША. А ў нашых суседзяў-расіян металакерамічная каронка каштавала 120 долараў у дзяржаўным сектары яшчэ ў 1993 годзе. Ці варта здзіўляцца, што паслугамі беларускіх стаматолагаў вельмі ахвотна карыстаюцца замежныя грамадзяне. Дарэчы, у Расіі цэны на стаматалагічныя паслугі былі адпушчаны ў дзяржаўным сектары ў «свабоднае плаванне» яшчэ два гады таму. І ўвогуле, я магу гарантавана заявіць, што ў нас самыя нізкія цэны не толькі на постсавецкай прасторы, але і ва ўсім свеце.

— Не сакрэт, што адмена льгот на зубапратэзаванне была ўспрынята пенсіянерамі вельмі хваравіта...

— Ільготнікі былі фактычна нашым дзяржзаказам. І паверце, што мы былі зацікаўленыя ў іх не менш, чым яны былі зацікаўленыя ў нас. Каб не быць галаслоўным, прывяду вам адну толькі лічбу — на зубапратэзаванне льготнай катэгорыі насельніцтва дзяржава выдаткавала летась больш як 20 мільярдаў рублёў, або амаль што 10 мільёнаў долараў ЗША. У 2006 годзе гэта лічба складала 8,5 мільёна долараў ЗША. Сярэднестатыстычны льготнік «каштаваў» казне 180 700 беларускіх рублёў. А цяпер мы можам страціць пэўную частку сваіх пацыентаў. Калі да адмены льгот ўрач, які займаўся зубапратэзаваннем, прымаў па 10—12 пацыентаў за працоўную змену, то цяпер на прыём могуць прыйсці і тры, і пяць пацыентаў. А калі прыйшлі восем пацыентаў, то гэта лічыцца ўжо выніковым днём. Прызнаюся, што сітуацыя, якую нам даводзіцца сёння назіраць, не можа нас не хваляваць. Ад ранейшай колькасці пацыентаў, якія мелі права на льготы, засталося толькі каля 30 працэнтаў. Таму мы не імкнёмся рабіць ніякіх рэзкіх крокаў у бок павелічэння цэнаў, каб не адпудзіць нашых патэнцыяльных пацыентаў, асабліва сельскіх жыхароў, якія абслугоўваюцца, як правіла, на раённым узроўні. Для іх асабліва важна захаваць даступнае зубапратэзаванне.

Хачу заўважыць таксама, што апошняе павышэнне цэнаў на звычайнае пратэзаванне (без выкарыстання каштоўных металаў), якое адбылося ў чэрвені мінулага года, было ў межах 8—10 працэнтаў. Два здымныя пратэзы абыходзяцца пенсіянерам у суму ад 80 да 100 тысяч рублёў. Ведаеце, мне сёння не сорамна ні за сваю галіну, у якой я працую тры дзесяцігоддзі, ні за нашых людзей. Скажыце, ці шмат вы бачыце ў грамадскіх месцах бяззубых людзей, у тым ліку немаладых? Між іншым, у пэўнай ступені гэта з'яўляецца паказчыкам дабрабыту нашай краіны...

— Чакалася, што з пачатку новага года ўступіць у сілу пералік мінімальных дзяржаўных стандартаў у галіне стаматалогіі. Прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя неаднойчы выказвалі меркаванне, што стаматалогія амаль цалкам павінна пераходзіць на платныя рэйкі...

— Мы свае прапановы па мінімальных сацыяльных стандартах ужо ўнеслі. Але пакуль яны знаходзяцца толькі на паперы і чакаюць свайго зацвярджэння, не хацелася б гаварыць аб іх больш падрабязна. Скажу толькі, што на бясплатнай аснове пацыентам будзе аказвацца неадкладная лячэбная дапамога з выкарыстаннем самых простых пламбіровачных матэрыялаў, выдаленне зубоў і прафілактычныя мерапрыемствы.

— Дарэчы, а як часта беларусы прыбягаюць да паслуг стаматолагаў? І ці можна гаварыць аб нейкіх пазітыўных тэндэнцыях у стаматалагічным здароўі?

— У сярэднім на аднаго беларуса ў нас прыпадае 1,5 наведвання дзяржаўных стаматолагаў у год. Згодна з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя кожны чалавек павінен двойчы на год наведваць стаматолага з прафілактычнымі мэтамі. Але ж у нас вельмі развітая і прыватная стаматалогія (больш як 600 арганізацый), дзе колькасны і якасны статыстычны ўлік пакуль яшчэ не да канца наладжаны.

З 1998 года ў Беларусі рэалізуецца Нацыянальная праграма прафілактыкі захворванняў карыесу зубоў і захворванняў на перыядонт, якая пачала рыначыць станоўчыя вынікі. Так, за апошнія 10 гадоў паказчыкі стаматалагічнага здароўя палепшыліся ў Беларусі ў 2,2 раза. Паводле еўрапейскага прагнозу на бліжэйшыя 10—15 гадоў, пацыенты ва ўзроставай групе ад 65 да 74 гадоў павінны мець 20 сваіх зубоў. Беларусы ў гэтым узросце пакуль што маюць 14—15 здаровых зубоў. Але 20 зубоў — для большасці беларусаў немаладога ўзросту пакуль што «раскоша». А вось паказчыкі па 6-гадовых і 12-гадовых дзецях у нас адпавядаюць стандартам Сусветнай арганізацыі аховы здароўя...

— Цікава, а як вёўся падлік здаровых зубоў у пацыентаў?

— У нас ёсць некалькі навукоўцаў, якія займаюцца гэтай праблемай, і мы цалкам ім давяраем. Увогуле ж лічбы, якія мы атрымліваем з рэгіёнаў, выглядаюць вельмі аптымістычна, таму ў гэтым годзе мы вырашылі правесці сваю «разведку боем». На красавік—май мы запланавалі высадку «эпідэмілагічнага дэсанта» ў рэгіёнах. Будзем дзейнічаць метадам выпадковай выбаркі: браць любую школу, любую арганізацыю...

— Пэўны час таму асноўная колькасць скаргаў на работу медыцынскіх устаноў была звязана з работай прыватных стаматолагаў. Ці быў наведзены парадак на рынку прыватных стаматалагічных паслуг?

— Сітуацыя істотна выправілася. Калі ў 2003 годзе ад 40 да 60 працэнтаў усіх скаргаў, што паступалі ў Міністэрства аховы здароўя, былі звязаны з аказаннем платных стаматалагічных паслуг, і мы толькі паспявалі стварацца камісіі па разглядзе гэтых скаргаў, то ў 2007 годзе скаргаў на работу стаматолагаў было толькі 20 працэнтаў ад агульнай колькасці...

— Сямён Антонавіч, патлумачце, калі ласка, якую гарантыю павінны выдаваць платныя стаматалагічныя арганізацыі на свае віды работ? Чаму адзін стаматолаг дае гарантыю на шэсць месяцаў, другі — на год, а трэці — на паўтара—два гады?

— Кожная арганізацыя мае права выдаваць сваю гарантыю, але яна не можа быць меншай, чым у дзяржаўным сектары. Мы даём гарантыю на зубапратэзаванне — адзін год, і на лячэнне і пламбіраванне зубоў — шэсць месяцаў.

Калі прыватная стаматалагічная фірма дае 3 гады гарантыі, то, як кажуць, калі ласка, выконвайце. Пломба можа выпасці, а пратэз зламацца па розных прычынах, і нават для экспертаў бывае праблематычным вызначыць, чыя гэта віна: стаматолага ці пацыента. Мы сёння і ў дзяржаўным, і ў прыватным сектары імкнёмся працаваць па дагаворах. Заключаецца трохбаковы дагавор паміж адміністрацыяй, урачом і пацыентам. У амбулаторнай стаматалагічнай карце распісваем увесь план лячэння і пацыент ставіць пад ім свой подпіс. Дагаворныя абавязацельствы, мушу заўважыць, вельмі дысцыплінуюць.

— Летась Міністэрства аховы здароўя заяўляла аб сваім намеры навесці парадак на рынку зубных пастаў і абмежаваць месцы іх продажу аптэчнымі ўстановамі...

— На мой погляд, кантроль за якасцю зубной пасты, што ўвозіцца ў нашу краіну, павінен быць больш жорсткім. Згодна з нашай класіфікацыяй пасты адносяны да санітарна-гігіенічных сродкаў, таму не праходзяць клінічныя выпрабаванні. Яны праходзяць толькі абавязковую рэгістрацыю ў Рэспубліканскім цэнтры экспертызы і выпрабаванняў у аховe здароўя і праверку ў Рэспубліканскім цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Але праблема ў тым, што правяраюцца далёка не ўсе партыі зубной пасты. Тое, што прынеслі на даследаванне, і тое, што знаходзіцца ў продажы ці на складзе, — гэта зусім неабавязкова адзін і той жа тавар. Таму нам трэба будзе наладзіць выбарачныя праверкі зубных пастаў на складах, у магазінах, у кіёсках і на рынках. Мы плануем таксама правядзіць дадатковыя выпрабаванні зубных пастаў на кафедрах медыцынскіх універсітэтаў. У нас дастаткова вопытных спецыялістаў. Да гэтай работы падключацца таксама і члены Беларускага рэспубліканскага стаматалагічнага грамадскага аб'яднання, у склад якога ўваходзяць амаль 2,5 тысячы чалавек.

У тым, што ў нас ёсць незаконны і няякасны прадукт, я асабіста не сумняваюся. У прыватнасці, склад пастаў, што рэалізуюцца ў Беларусі пад вядомымі гандлёвымі маркамі, не заўсёды адпавядае заяўленаму на ўпакоўцы. А нашы людзі вельмі давяраюць рэкламе. Шкоды ад такой пасты не будзе, але і карысці таксама. У краінах Еўрасаюза такі падман спажыўцоў проста немагчымы. Дарэчы, прэтэнзій да беларускіх зубных пастаў мы не маем, але іх доля на айчынным рынку — зусім невялікая.

— А калі месцы продажу зубных пастаў будуць абмежаваныя аптэкамі, ці будзе ў спажыўцоў гарантыя, што той прадукт, які ім там прапануюць, адпавядае заяўленым якасцям?

— Мы ўсё роўна прыйдзем да цывілізаваных спосабаў продажу, але абмяжоўвацца толькі аптэкамі не збіраемся. Нічога супраць рэалізацыі зубных пастаў праз магазіны мы не маем, але катэгарычна супраць продажу іх на рынках і ў кіёсках. Ну як, скажыце, гандлёвы пункт на рынку можа канкураваць з аптэкай, калі прадаўца хвалюе толькі адна праблема — як хутчэй збыць свой тавар, а зусім не пытанні якасці і бяспечнасці гэтага тавару? Праўда, пакуль што ўсё ўпіраецца ў наш дабрабыт, будзем багацейшымі — хадзіць на рынак па зубныя пасты, напэўна, ужо не будзем...

— Сямён Антонавіч, многіх беларусаў не пакідае абыякавымі сакрэт галівудскай усмешкі. Ці магчыма стварыць такую ідэальную прыгажосць у беларускіх стаматалагічных клініках?

— І не сумнявайцеся. Мы можам задаволіць нават самых прыдзірлівых і патрабавальных кліентаў. Прычым для гэтага ёсць усе магчымасці не толькі ў прыватных, але і ў дзяржаўных арганізацыях. Стаматалогія ўвогуле развіваецца надзвычай інтэнсіўна, прычым не па гадах, а па месяцах, і нават па гадзінах. Адсачыць усе навінкі — няпростая задача нават для прафесіяналаў. Але толькі на стаматалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта працуюць больш як 100 кандыдатаў і 9 дактароў навук. Цяпер студэнты ўжо на 1-м і 2-м курсах самі вырабляюць і каронкі, і пратэзы, і артапедычныя апараты. Але, прызнаюся, што нам вельмі не хапае ў краіне Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра па стаматалогіі, які б каардынаваў усю нашу галіну і быў флагманам у прафілактычнай, лячэбна-кансультацыйнай і навукова-метадычнай рабоце. Спадзяёмся, што нас пачуюць у міністэрстве...

Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ВОДАР ЗЁЛАК

Нягледзячы на тое, што сёння ў аптэках вялікі выбар лекавых траў, іх прадаюць і на рынку. Прадаўцоў нямнога, але некалькі чалавек у выхадныя раскладваюць пучкі зёлак ды торбачкі з карэньчыкамі на прылаўках.

Маю ўвагу прыцягнуў пенсіянер, які кожную нядзелю на кірмашы «Палескі» гандлюе дзівасілам, амялой, жывакостам... Звычайна зёлкі прадаюць жанчыны немаладога веку і гэты занятак быццам бы для іх найбольш падыходзіць, а тут мужчына выстаўляе пучкі сухіх раслін.

Іван Молеў усё жыццё працаваў вадзіцелем, а калі пайшоў на пенсію, то разам з жонкай пачаў збіраць лекавую траву. Нарыхтоўка ідзе летам і тады даводзіцца блукаць па балоце ды лесе ў пошуках шабельніка, мацярдушкі... На прылаўку я налічыў з паўсотні торбачак і пучкоў.

Дык што падштурхнула чалавека да гэтага?

— Дзеці ўжо ўладкаваныя, у іх сваё жыццё, а я не магу сядзець без работы. Калі не надта актыўна рухацца, то адчуваю сябе кепска. Вось і знайшоў сабе справу, тым больш што жонка ў зёлках разбіраецца. Напачатку была няўпэўненасць, а калі ўцягнуўся, то ўжо адмовіцца ад усяго гэтага цяжка. Без зёлак жыццё становіцца сумным. Гэта на холадзе яны не пахнуць, а ў хаце ад водару аж галава ідзе кругам, — расказваў Іван Васільевіч. Падыходзілі пакупнікі, зноў жа жанчыны і нешта ў тых торбачках перабіралі, нюхалі. Сам пенсіянер жыве ў Слоніме, раней меў праязны і ў Баранавічах бываў сярод тыдня, цяпер наведваецца толькі ў нядзелю, бо ездзіць часцей дарагавата. Але ж зёлкі, напэўна, даюць і прыбытак?

— О-о-о..., і які! — пачуў у адказ. — Я ніколі не разлічваў, што на гэтым можна нешта зарабіць. На хлеб з малаком і не больш за тое.

— А якія зёлкі найбольш запатрабаваныя?

— Карэнне і лісце шабельніка купляюць добра. Хвароба суставаў вельмі распаўсюджана сёння, асабліва ў людзей пенсійнага ўзросту.

Іван Молеў прапануе стограмовую шкляначку карэння шабельніка заліць бутэлькай гарэлкі і настояць. Піць па чайнай лыжачцы перад ядой ды накладваць на суставы прымочкі з гэтага настою.

— А ці дапамагае такое лячэнне?

— Шабельнік рэкамендуюць і дактары, хоць гэтай раслінай лячыла ногі яшчэ мая бабка. А ці дапамагае, то тут, напэўна, як каму. Адна жанчына расказвала, што пухліна з каленяў пасля шабельніка ў яе сышла. Лячэнне зёлкамі — працэс доўгі і не ўсе вытрымліваюць яго. Чалавек бачыць, што праз тыдзень лягчэй не стала і кідае лячэнне, а трэба не адступаць месяц ці два, — выказаў сваю думку прадавец зёлак.

...Я заказаў зуброўкі — спарўднай, лясной. Толькі вось будзе яна пасля сезона збору, бліжэй да восені.

Дачакацца б.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ, РАДЗІЛЬНЫ ДОМ!

Працэс гэты, як гаворыцца, быў пакутлівым, зацяжным, бо пачаўся ён у 2003 годзе і закончыўся толькі што. Раней гэта медыцынская ўстанова знаходзілася ў цэнтры Гомеля, на вуліцы Савецкай, затым яна была пераведзена ў абласную клінічную бальніцу, што на ўскраіне горада, і месцілася ў дзіцячым корпусе. Абласны выканаўчы камітэт паставіў задачу рэканструяваць адзін з будынкаў бальніцы такім чынам, каб радзільны дом адпавядаў самым высокім патрабаванням і стаў адным з самых лепшых у краіне, як па наборы памяшканняў, тэхнічнай і інжынернай аснашчанасці, дызайну, так і па камфортнасці.

Як адзначыў намеснік начальніка абласнога ўпраўлення аховы здароўя Сяргей Грамыка, цяжка было спачатку з фінансамі, затым — з абсталяваннем і г.д., таму і не былі вытрыманы тэрміны рэканструкцыі аб'екта, на якую эрасходавана каля 14 мільярдаў рублёў з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў і іншых крыніц фінансавання з улікам пастаўкі неабходнай медыцынскай апаратуры і абсталявання. А яны — самыя сучасныя для аказання дапамогі цяжарным жанчынам, парадзіхам і нованароджаным дзецям.

Дастаткова сказаць, што ёсць тут і ўнікальны ўльтрагукавы апарат экспартнага класа, наркозна-дыхальная апаратура, шматфункцыянальныя ложкі, сістэма відэаназірання, біяхімічны аналізатар, двухсценныя кувезы для выходжвання нованароджаных з крайне нізкай масай цела і шмат чаго іншага. Непазнавальна змяніліся і ўмовы для знаходжання тут пацыентаў. Для парадзіх і нованароджаных створаны ўсе бытавыя зручнасці, аднамесныя і двухмесныя палаты, дзе мамы знаходзяцца разам з дзецьмі.

У радзільным доме летась на свет з'явілася 2800 немаўлят — адна пятая ад усіх нованароджаных у вобласці. Сёлета — пакуль 300.

Выступаючы на адкрыцці раддома, старшыня аблвыканкама Аляксандр Якабсон выказаў падзяку праекціроўшыкам, заказчыку, будаўнікам, персаналу бальніцы. Справа цяпер за жанчынамі — нараджаць здаровых і прыгожых дзяцей. На радасць усім нам.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

КОЛЬКІ ЗАХОЎВАЦЬ?

Мінімальны тэрмін захоўвання азначае, што вытворца гарантуе нам захаванасць якасці прадукту (напрыклад, яго смаку, паху ці колеру) на працягу ўказанага тэрміну. Невялікае перавышэнне гэтага тэрміну не выключае прыдатнасці прадукту да ўжывання. А вось тэрмін прыдатнасці прастаўляюць на прадуктах, якія хутка псуюцца. У такім выпадку ўжыванне прадукту будзе ўжо небяспечным. Напрыклад, на макароне ці кансервах можа стаяць тэрмін захоўвання (некалькі месяцаў), а вось на ёгурце або каўбасе абавязкова будзе прастаўлены тэрмін прыдатнасці (як правіла, ён не перавышае аднаго месяца).

ПЕРАКРЫТЫ САСУД

Часам здаецца: вось жыў сабе чалавек, не тужыў, і раптам — інфаркт. Але раптам інфаркт ніколі не здараецца. Сасудзістымі катастрофамі, да якіх адносяцца інфаркт міякарда і інсульт галаўнога мозга, праяўляецца такое хранічнае захворванне, як атэрасклероз. Людзі, якія пакутуюць ад атэрасклерозу, выглядаюць старэйшымі за свой узрост, паколькі хвароба павялічвае біялагічны ўзрост чалавека, а, значыць, у любым выпадку скарачае яму жыццё... Наколькі магчыма прадухіліць гэтыя непрыемнасці? Расказвае вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі медыцынскіх інфармацыйных тэхналогій Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Ігар КАЗЛОЎ.

— Раннія атэрасклератычныя паражэнні, так званыя ліпідныя, або халестэрынавыя, палоскі, з'яўляюцца ў артэрыях сэрца ўжо ў дзесяцігадовым узросце, а ў аорце — і яшчэ раней. Аднак адразу трэба заўважыць, што ў будучым, з пункту гледжання развіцця таго ж інфаркту, важным будзе інтэнсіўнасць развіцця, ступень выражанасці гэтых паражэнняў. Наогул атэрасклероз — гэта хранічнае захворванне, у падмурку якога хаваюцца змяненні сасудаў, абумоўленыя адкладаннем у іх ліпідаў, з далейшым фарміраванне ліпідных бляшак. Апошнія, дарэчы, могуць утварацца ў сасудах любога органа — кішэчніка, нырак, але найбольш часта — у сасудах сэрца і галаўнога мозга. Падчас гэтага працэсу прасвет сасуда звужаецца, і тканкі арганізма пачынаюць атрымліваць менш крыві, а значыць, і кіслароду. Пры фізічнай жа ці эмацыянальнай нагрузцы кровазварот узмацняецца, арганізму патрабуецца больш кіслароду, але ахоплены атэрасклерозам сасуд не ў стане прапусціць больш крыві. Орган пачынае пакутаваць, аб чым заяўляе распадару болем, стэнакардыяй — асноўнай прыметай ішэміі. Калі ж кровазварот нейкага ўчастка сэрца спыніцца зусім, разаўецца інфаркт міякарда.

— А ўсё ж такі як атрымліваецца, што з ліпідных палосак «вырастае» бляшка і па якой прычыне яна аднойчы цалкам перакрывае сасуд?

— Само слова «атэрасклероз» адлюстроўвае сутнасць бляшкі. Athere — кашыца, skleros — цвёрды. Бляшка мае сваё ядро і пакрышку. Ядро паступова разрастаецца ў прасвет сасуда за кошт лішку халестэрынавую кашыцу да пары да часу прыкрывае «шапачка». Пад уздзеяннем любога фактару — механічнага, таксічнага, інфекцыйнага аднойчы яна разрываецца. У месцы разрыву абавязкова ўтвараецца тромб, які цалкам перакрывае прасвет сасуда. Гэта і ёсць вострая катастрофа, дакладней, інфаркт або інсульт.

— Ці можна спыніць падхарчоўванне бляшкі халестэрынам?

— Па-першае, халестэрын — гэта жыццёва важнае рэчыва, якое ўваходзіць у склад абалонак клетак, з яго сінтэзуюцца палавыя гармоны, гармоны наднырачнікаў. Таму прырода паклапацілася аб тым, каб чалавеку хапала гэтага рэчыва. Халестэрын не толькі паступае ў арганізм з харчовымі тлушчамі, але і сінтэзуецца ў пячонцы. Лішак жа халестэрыну ў арганізме сапраўды з'яўляецца прычынай развіцця атэрасклерозу.

— Халестэрын і жывёльны тлушч, — хіба не адно і тое ж?

— Халестэрын — гэта тлушчападобнае рэчыва, але не тлушч. Проста ўтрымліваецца яно сапраўды ў прадуктах, багатых на жывёльныя тлушчы. Найбольшая колькасць халестэрыну ў чыстым выглядзе знаходзіцца ў яечным жаўтку, субпрадуктах — пячонцы, нырках, мазгах і г.д.

— Чаму даводзіцца чуць пра «добры» і «дрэнны» халестэрын?

— Халестэрын цыркулюе ў нашай крыві толькі ў складзе асаблівых тлушчавых часціц — ліпапратэідаў. Адзін від, так званы шкодны, цыркулюе ў складзе ліпапратэідаў нізкай шчыльнасці, а другі — добры — у складзе ліпапратэідаў высокай шчыльнасці. Чым вышэй халестэрын ліпапратэідаў нізкай шчыльнасці, тым вышэй небяспека развіцця інфаркту і інсульту, тым больш агрэсіўна можа развівацца атэрасклероз. І наадварот.

— Мы можам уплываць на гэтыя працэсы?

— Можам. Сінтэз халестэрыну ў печані адбываецца з насычаных тлустых кіслот, на якія багатыя тлушчы жывёльнага паходжання. Так што мы можам рэгуляваць узровень халестэрыну з дапамогай дыеты. Паводле рэкамендацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, доля ўсіх тлушчаў у нашым рацыёне павінна складаць не болей за 30 працэнтаў ад агульнай колькасці ўжытага, а доля жывёльных тлушчаў павінна складаць трэць ад усіх ужытых тлушчаў. Адным словам, неабходна абмяжоўваць колькасць мяса, тлустых малочных прадуктаў.

— Ці не лепей наогул адмовіцца ад мяса?

— Акрамя тлушчаў мяса ўтрымлівае бялкі. Прычым паўнацэнныя і збалансаваныя. Паўнацэнныя бялкі ў сваім складзе ўтрымліваюць усе, у тым ліку незаменныя, амінакіслоты, збалансаваныя — значыць, знаходзяцца ў тых суадносінах, якія патрэбны арганізму. Сапраўды, устаноўлена, што людзі, якія прытрымліваюцца вегетарыянства, значна радзей пакутуюць ад сардэчна-сасудзістай паталогіі, але тут не ўсё так адназначна прымальна. Некаторыя раслінныя бялкі — паўнацэнныя, але незбалансаваныя (бялкі збожжавых, рысу, соі), а некаторыя — непаўнацэнныя (бялкі бабовых, кукурузы).

— А што можа паспрыяць больш актыўнаму назапашванню халестэрыну ў сасудах?

— Пры адным і тым жа ўзроўні халестэрыну у аднаго чалавека атэрасклератычны працэс можа праяўляцца ў большай ступені, у другога — у меншай. Таму што важна не толькі ўласна адкладанне, але і тое, наколькі інтэнсіўна падвяргаецца халестэрын перакіснаму акісленню, наколькі ўстойлівым з'яўляецца эндатэлій — абалонка, якая высцілае сасуд. Добрую ці дрэнную паслугу тут можа аказаць шэраг фактараў. Возьмем курэнне. Даўно даказана, што яно ў 3 разы павялічвае рызыку развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў, а нядаўна вывучаны механізмы гэтага ўплыву, адзін з якіх заключаецца ў тым, што элемент тытунёвага дыму — вокіс вуглярод пашкоджвае непасрэдна эндатэліяльныя клеткі. А яны, між іншым, — не проста нешта накшталт тэфлонавага пакрыцця, гэта актыўныя элементы, якія выпрацоўваюць гармон, здольны забяспечыць абарону эндатэлію ад наліпання трамбацытаў, нармальнае расшырэнне сасудаў.

— Чаму ж асобныя курцы не ведаюць, што такое інфаркт?

— Шкодны ўплыў ёсць у любым выпадку, але ж атэрасклероз — захворванне шматфактарнае. На яго развіццё ўплывае ўсё — ад генетычнай схільнасці да навакольнага асяроддзя. У канчатковым выніку ўзаемадзеянне ўсіх фактараў і вызначае вынік. Адносна генетычнай схільнасці на сёння можна сказаць наступнае: калі і ў маці, і ў бацькі ва ўзросце да 50—55 гадоў развівалася ішэмічная хвароба сэрца, меў месца інфаркт міякарда або інсульт галаўнога мозга, то можна з высокай доляй верагоднасці гаварыць аб істотнай схільнасці іх нашчадкаў да такіх хвароб. Ва ўсіх астатніх выпадках большае значэнне мае, напрыклад, узрост канкрэтнага чалавека: з цягам часу мы ўсе падвержаныя развіццю атэрасклерозу.

— Якую карысць можа прынесці нашым сасудам фізічная нагрузка?

— Перш-наперш, фізічныя нагрузкі павінны быць разумнымі — адпавядаць стану арганізма чалавека. Па-другое, яны трэніруюць нашы сэрца і сасуды, зніжаюць частату сардэчных скарачэнняў. Прычым як у стане спакою, так і ў адказ на тую ж фізічную ці эмацыянальную нагрузку. Трэніраваны чалавек прабяжыць 2—3 км з частатой пульса 160 удараў у хвіліну, а нетрэніраваны — з 200 ударамі. Вышэйшая частата пульса — вышэйшы ціск. Кардыёлагі часам памнажаюць частату сардэчных скарачэнняў на артэрыяльны ціск. Так яны вызначаюць тую колькасць энергіі, кіслароду, якая неабходна сэрцу для пераадолення фізічнай нагрузкі. Чым менш энергіі патрабуецца, чым больш эканамічна працуе сістэма, тым большая верагоднасць, што яна праіснуе даўжэй. Па-трэцяе, фізічныя нагрузкі спрыяюць змяншэнню колькасці адрэналіну і норадрэналіну — гармонаў трывогі ў крыві, зніжаюць адчувальнасць клетак да іх. Па-чацвёртае, фізічныя нагрузкі ўплываюць на згусальнасць крыві, зніжаюць здольнасць да тромбаўтварэння.

— Якой павінна быць аптымальная нагрузка?

— Пастаяннай. Прыкладна праз паўгода пасля завяршэння фізічных нагрузак станоўчы эфект пачынае паступова згасаць. Нагрузка павінна ўпісвацца ў звычайны жыццёвы рытм чалавека. Мінімальны аб'ём эфектыўнай хады — прыкладна 35—40 хвілін «у адзін прыём» і не радзей за 4—5 разоў на тыдзень. Бегаць можна па 20 хвілін 3—4 разы на тыдзень.

— Псіхолагі звяртаюць увагу на прамую сувязь паміж стрэсам і гіпертаніяй...

— Нервова-псіхічнае напружанне з'яўляецца важным фактарам развіцця сардэчна-сасудзістых хвароб. Пад уздзеяннем стрэсу стымулюецца выкід стрэсавых, у тым ліку корцікастэроідных гармонаў. Апошнія ж могуць настолькі мабілізаваць рэсурсы арганізма, што пачнецца распад бялкоў, прычым тых, якія найменш патрэбны ў дадзены момант для выжывання — бялкоў слізістых абалонак страўнікава-кішачнага тракта. Вось з-за чаго можа атрымаць развіццё язвавая хвароба страўніка і 12-перснай кішкі. Корцікастэроіды спрыяюць і павышэнню ўзроўню цукру ў крыві, што можа выклікаць развіццё цукровага дыябету. Ён пачынаецца як эндакрыннае захворванне, а ў 80 працэнтах выпадкаў заканчваецца як сардэчна-сасудзістае. Цукровы дыябет цяпер разглядаецца як адзін з першых фактараў рызыкі развіцця сардэчна-сасудзістай паталогіі з-за хуткага паражэння ўсіх сасудаў.

— Кажуць, што алкаголь — шкодны для сэрца, але карысны для сасудаў...

— Той, хто ўжывае алкагольныя напоі, павінен прытрымлівацца невялікіх доз — 30 г абсалютнага спірту для мужчын і 15 г — для жанчын. Паводле шэрагу назіральных даследаванняў, людзі сяродняга і старэйшага ўзросту, якія ўжываюць алкаголь у такім рэжыме, на 10—15 працэнтаў зніжаюць рызыку ўзнікнення сардэчных ускладненняў. Але пераход за азначаную мяжу павышае гэту рызыку ў параўнанні нават з тымі, хто не ўжывае алкаголь наогул. Больш за тое, лішак алкаголю спрыяе ўстойлівасці гіпертаніі да медыкаментознага лячэння. Нельга забываць пра двухфазнасць уздзеяння алкаголю: так, ён павышае ўзровень ліпапратэідаў высокай шчыльнасці, спрыяе зніжэнню тромбаўтварэння, здольнасці трамбацытаў да зліпання. Але пры перавышэнні дозы праз нейкі час назіраецца цалкам адваротны эфект.

— Што вы парэкамендуеце мець на ўвазе кожнаму даросламу чалавеку ў мэтах прафілактыкі сардэчна-сасудзістых хвароб?

— Рабіць штогадовыя абследаванні пасля 30—35 гадоў: ведаць свой халестэрын, узровень глюкозы, артэрыяльны ціск.

***— Ці можна самому расп

АДРАСЫ БЕЛАРУСКАГА ДЗІЦЯЧАГА ФОНДУ

Сёння Беларускаму дзіцячаму фонду спаўняецца 20 гадоў. «27 лютага 1988 года ў Доме Літаратара ў Мінску 326 дэлегатаў прагаласавалі за стварэнне Беларускага аддзялення Савецкага дзіцячага фонду імя Леніна, — узгадвае дырэктар Фонду Аляксандр ТРУХАН. — Заснавальнікамі яго сталі 45 міністэрстваў і ведамстваў, у тым ліку і газета «Звязда». Мы пачалі са статыстыкі: упершыню падлічылі, колькі ў нас дзяцей, якім неабходна падтрымка дзяржавы і грамадства. Беларускі дзіцячы фонд стаў стваральнікам і ініцыятарам многіх праектаў, якія пазней станавіліся дзяржаўнымі. Гэта і ўладкаванне дзяцей-сірот у сем'і, і падтрымка адораных дзяцей, і акцыя «Нашы сэрцы — хворым дзецям». У Фонда шмат унікальных праектаў, усе яны жывыя, працуюць. Нават калі дзеці, якім мы аказвалі падтрымку, вырастаюць, мы не губляем з імі сувязь. Фонд удзельнічаў у распрацоўцы Закона аб правах дзіцяці»...

Гісторыя Беларускага дзіцячага фонду — гэта гісторыя жыцця соцень тысяч дзяцей і іх бацькоў, гэта непаўторныя, надзвычай цікавыя і нярэдка гераічныя чалавечыя лёсы, гісторыя змагання за жыццё, гісторыя перамог любові і надзеі. Напярэдадні юбілею «Звязда» пазнаёмілася толькі з некалькімі з іх. Але кожная паказвае, наколькі вялікую і патрэбную справу робіць у нашай краіне гэты абаронца дзяцінства — Беларускі дзіцячы фонд.

Адрас першы. КАЦЯ

Зараз Каця заканчвае біялагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага агратэхнічнага ўніверсітэта. Яна выйшла замуж і чакае сваё першае дзіця. Жыве ў студэнцкім інтэрнаце. Дзяцінства Каця ўзгадвае з цёплай усмешкай на вуснах: яна адчувае сябе шчаслівай. Яна паказвае на камп'ютары фатаграфію маці на сваім вяселлі, фатаграфіі бацькоў мужа... Яна кажа: «Мне надзвычай пашанцавала». Па святле яе вачэй, па спакойным адухоўленым твары бачна, што гэтая маладая прыгожая жанчына ідзе па жыцці радасна і бясстрашна. Вось і зараз: Сяргею, яе мужу, адмовілі ў сямейным інтэрнаце на заводзе, дзе ён працуе, Беларускі дзіцячы фонд звярнуўся да кіраўніцтва прадпрыемства з просьбай дапамагчы маладой сям'і, і ёсць надзея, што ў патрэбны момант праблема вырашыцца.

Каця КІРЫЕНКА і яе вялікая сям'я.

У Каці няма цяжкіх успамінаў. Порцыя любові, якую яна атрымала ў дзяцінстве, аказалася дастатковай, каб цалкам загаіліся дзіцячыя раны, нарадзіліся сілы на будучае і — удзячнасць лёсу за ўсё.

Яна памятае свой першы дзень у родным доме. Ёй было пяць гадоў, сястрычцы Насці — тры, а браціку Міхасю, якога забралі першым, — не было і года. Яна ўзгадвае, як ўсяго баялася, блытала Захара і Ягора, а маленькі Міхась адразу ўкусіў яе за палец... Родным Каця лічыць дом, у якім вырасла, у які і зараз з задавальненнем прыязджае на канікулы, як усе 10 дарослых ужо дзяцей. Той самы знакаміты дом Кундзікавых у Клічаве, які разам з Кацяй родным лічаць яшчэ 27 чалавек — ад двух да 26 гадоў.

— Быў час, калі я хацела знайсці біялагічную маці, — проста, без аніякага адцення болю альбо горычы расказвае Каця, — можа, каб паглядзець ёй у вочы. Я ведаю, дзе яна жыве. Але потым падумала і рашыла: а навошта? Калі яна столькі гадоў не шукала мяне, пра што нам размаўляць?

З жыцця, якое было ў яе да прыезду ў дом Кундзікавых, Каця амаль нічога не памятае. Толькі адна карціна захавалася ў яе свядомасці, нават некалькі разоў снілася. Яна на нейкім пяньку робіць з пяску «бабкі». Нехта падыходзіць і разбурае яе пясочныя пірагі і тарты.

Кундзікавы былі аднымі з першых, хто рашыўся ўтварыць дзіцячы дом сямейнага тыпу. У 1990-м яны з розных установаў забралі пяцярых малых, яшчэ трое ў іх былі свае. Канчатковае рашэнне яны прынялі пасля таго, як убачылі тэлемарафон, які ладзіў Беларускі дзіцячы фонд. Сяброўства з Фондам доўжыцца больш за 18 гадоў.

— Фонд дапамог нам знайсці спонсара, які прафінансаваў прыбудову да дома, — расказвае маці Маргарыта Уладзіміраўна, — яго прадстаўнікі былі ў Каці на вяселлі, зрабілі падарунак. Фонд дапамагае аздаравіць дзяцей, аказвае юрыдычную дапамогу, падтрымлівае маральна, адгукаецца на ўсе праблемы.

Гэта вельмі няпроста — прысвяціць жыццё дзецям, якія аказаліся ў бядзе. Патрэбны вялікія самаахвяраванне, цярпенне і вера ў дзяцей. Не кожнаму па сілах. Каця памятае, як яны з маці прыйшлі па дзяўчынку, ад якой адмовіліся прыёмныя бацькі. Як ім было крыўдна за дзяўчо. Яна ўзгадвае, як у іх дом прыйшлі дзеці, маці якіх загінула ў аўтакатастрофе. Як няпроста было адагрэць і вылечыць любоўю малых, на вачах якіх адбылася сямейная драма... Кундзікавы не проста даглядаюць дзяцей, яны ўмудраюцца зрабіць іх моцнымі і добразычлівымі. Як ім гэта ўдаецца — ведае толькі Бог. Іх любові хапае на ўсіх. Можаце сабе ўявіць: на дзень нараджэння маці сабралася 25 дзяцей! Не прыехалі толькі тыя, якія працуюць у Маскве.

24 вырваныя з пекла жыцці, 24 маленькія вылечаныя сэрцы, 24 выратаваныя душы, 24 выпраўленыя лёсы — гэтакі подзвіг не пад сілу ажыццявіць у адзіночку. Ужо дзеля аднаго гэтага варта было б існаваць грамадскай арганізацыі, якая падстаўляе сваё плячо такім людзям, як Кундзікавы. З 2000 года Беларускі дзіцячы фонд разам з арганізацыяй ствараў 34 сямейныя дзіцячыя дамы, у якіх сёння выхоўваюцца 376 прыёмных дзяцей, 104 выпускнікі ўжо жывуць самастойна. Гэты праект мае назву «Цёплы дом», на яго Фонд выдаткаваў 940 тысяч долараў ЗША.

Адрас другі. ПАЎЛІК

Паўлік Багарэвіч з'явіўся на свет з прыроджаным парокам сэрца. Такіх дзяцей у нашай краіне штогод нараджаецца каля 800. Шэсць гадоў сям'я Багарэвічаў чакала аперацыі. Маці Галіна Валянцінаўна ведала, што без хірургічнага лячэння яе сын наўрад ці дажыве да свайго паўналецця. Але тэрміны бясконца адцягваліся: Паўлік часта хварэў. Нарэшце, ім сказалі, што час упушчаны. Маці кінулася ў іншую клініку, але і там развялі рукамі: дзе вы раней былі? Яна расплакалася. Які сэнс мае жыццё бацькоў, калі яны нічым не могуць дапамагчы свайму хвораму дзіцяці?

Пра гора Багарэвічаў ведаў увесь інтэрнат фабрыкі «Галантэя», дзе нарадзіўся і жыве дагэтуль Паўлік. Нехта з суседзяў ім параіў звярнуцца ў Беларускі дзіцячы фонд. Тое, што адбылося далей, інакш як цудам Галіна Валянцінаўна назваць не можа.

Яе прыняла Лідзія Мікалаеўна Ліцвіновіч 10 снежня 2004 года. Яна ўважліва выслухала, уключыла Пашу ў праграму «Дзіцячае сэрца» і адразу запрасіла на кансультацыю да доктара Новіка, які якраз знаходзіўся ў Мінску. Падчас кансультацыі міжнародная брыгада ўрачоў прыняла рашэнне неадкладна аперыраваць хлопчыка. 15 снежня 2004 года Паўліку зрабілі аперацыю.

— Я ўбачыла яго пасля аперацыі і не пазнала: скура майго сына стала нармальнага колеру, — пачынае плакаць, калі ўзгадвае, маці Паўліка.

Іх жыццё пасля гэтага стала зусім іншым. Да хлопчыка паступова вяртаюцца сілы. Цяпер Паша вучыцца ў звычайнай школе, мае сяброў, радзей хварэе. Я пытаюся: ці ёсць у яго мары? Адзінаццацігадовы хлапчук адказвае:

— Усе самыя галоўныя мае мары збыліся — я цяпер магу хадзіць у школу, мне купілі веласіпед і сотавы тэлефон. Цяпер няхай бы ў нас з'явілася кватэра. А яшчэ мару быць лётчыкам.

Паша БАГАРЭВІЧ і яго маці Галіна.

Маці смяецца. Яна кажа дзіўныя для старонняга вуха, але зразумелыя для сына рэчы: «Цяпер, Паўлік, мы будзем жыць! Праўда?!»

Толькі за мінулы год у рамках праграмы «Дзіцячае сэрца» Беларускага дзіцячага фонду было праведзена 95 складаных аперацый, 180 дзяцей атрымалі медыцынскую кансультацыю. Усяго ў рамках праграмы зроблена 396 аперацый і больш за паўтары тысячы кансультацый.

Адрас трэці. АЛЯКСЕЙ І «КРОПКІ АПОРЫ»

Андрэй Калеснікаў, генеральны дырэктар сістэмы фірмаў «ВАН і Ко», пазнаёміўся з Беларускім дзіцячым фондам выпадкова. Гадоў восем таму Уладзімір Ліпскі, старшыня праўлення Фонду, расказаў яму пра замежную практыку шэфства бізнэсменаў над канкрэтнымі дзецьмі, якія аказаліся без апекі бацькоў. Андрэй Рыгоравіч паціснуў плячыма, падумаў і вырашыў зрабіць па-свойму. Ён пазнаёміўся з выхаванцам Мінскай школы-інтэрната № 3 Лёшам Макаркіным, тады васьмікласнікам. Сказаў яму: калі ты згодны, я буду кіраваць тваёй адукацыяй. Лёша пагадзіўся. Ён працягваў жыць у інтэрнаце, але жыццё яго змянілася кардынальна. Ён атрымліваў ад Андрэя Калеснікава грошы і сам дамаўляўся з рэпетытарамі. Кожны тыдзень яны па тэлефоне на працягу 30 хвілін абмяркоўвалі поспехі і праблемы ў вучобе. Рэгулярна сустракаліся, летам Аляксей дапамагаў Андрэю на дачы: не проста адпачываў, а менавіта вучыўся працаваць. Пасля 9-га класа Лёша, у парадку выключэння, застаўся пры школе-інтэрнаце і пайшоў у 10-ы клас агульнаадукацыйнай школы. Паспяхова закончыў яе і паступіў у Вышэйшую школу МУС. Днямі Аляксей атрымаў дыплом юрыста. «Вось прынясе мне «корачкі» паказаць, і я падару яму тэлевізар у новую кватэру», — усміхаецца Андрэй Калеснікаў. Калі ён убачыў, што нездарма ўкладаў у хлопца грошы, аддаваў яму свой час і душэўныя сілы, то вырашыў гэты вопыт растыражаваць.

— У нашай краіне 32 тысячы дзяцей-сірот, — разважае Андрэй Калеснікаў, — прадпрыемстваў жа значна больш. Калі кожнае возьме па дзіцяці, як зрабіў гэта я, і дапаможа сіраце атрымаць добрую адукацыю, не абавязкова — вышэйшую... Маладому чалавеку важна стаць майстрам сваёй справы, запатрабаваным у грамадстве. Наколькі менеў тады стане ў Беларусі нешчаслівых лёсаў!

Разам з Беларускім дзіцячым фондам і Упраўленнем адукацыі Мінскага аблвыканкама Андрэй і яго прадпрыемства распрацавалі праект «Кропкі апоры», які стартаваў летам 2006 года.

Сутнасць яго наступная. Пад адным дахам сабраныя восем матываваных (якія хочуць дасягнуць у сваім жыцці пэўнай мэты) і таленавітых дзяцей з інтэрнатных устаноў Міншчыны. Жодзінскі гарвыканкам аддаў пад праект будынак, узяў на сябе яго ўтрыманне, а таксама выплату заробку прыёмным бацькам. Сістэма фірмаў «ВАН і Ко» ўклала ў рамонт і абсталяванне дома грошы і паставіла мэту знайсці для кожнага дзіцяці індывідуальнага спонсара. На сёння адгукнуліся тры прадпрыемствы, адно ўжо ўдзельнічае ў праекце, — гэта буйная будаўнічая арганізацыя ААТ «10 упраўленне начальніка работ».

Такім чынам кожнае дзіця павінна атрымаць некалькі кропак апоры, якія неабходныя, каб падрыхтавацца да самастойнага жыцця. Першая — сям'я. Дзецям адназначна пашанцавала з маладымі, вясёлымі і надзвычай мудрымі прыёмнымі бацькамі Маргарытай і Юрыем Галіноўскімі. Другая — фінансавая падтрымка. Паводле падлікаў і з уласнага вопыту Андрэя Калеснікава, дастаткова штомесяц укладаць у падлетка 180 долараў — грошы нават для сярэдняга прадпрыемства зусім невялікія, каб той меў магчымасць развіць свае таленты, ліквідаваць прабелы ў вучобе, падрыхтавацца да паступлення. Трэцяя — кіраўніцтва адукацыйным працэсам. Гэта тыя, як мінімум, 30 хвілін размоў у тыдзень з дзіцем аб праблемах і поспехах у навучальных установах. Для гэтага, акрамя спонсара, кожнаму дзіцяці падбіраецца індывідуальны папячыцель. Праект яшчэ толькі набірае абароты. Падрабязную інфармацыю пра яго можна атрымаць у Беларускім дзіцячым фондзе, Мінаблвыканкаме і на сайце www.bcf.nsys.by. Ён яшчэ недастаткова вядомы, але бізнэсмены, якія даведваюцца пра яго, выказваюць інтарэс. *Гэта адзін з новых і перспектыўных напрамкаў работы Беларускага дзіцячага фонду...*

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Маргарыта ГАЛІНОЎСКАЯ (першая злева) і яе дзеці: Павел (першы рад), Насця, Аляксей, Карына, Віктар (злева направа) і «галоўны» член сям'і «дваровы» тэр'ер Ева.

К сведению акционеров ОАО «Универсам Заславль»

27 марта 2008 года в 15.00 состоится годовое очередное общее собрание акционеров по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, д. 49.
Регистрация участников с 14.00 до 14.45.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2007 году.
2. Об утверждении заключения аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2007 году, заключения Ревизионной комиссии по результатам деятельности Общества в 2007 году.
3. Отчет о работе Совета директоров Общества в 2007 году.
4. Об утверждении порядка распределения чистой прибыли (покрытия убытков) за 2007 год и нормативов распределения прибыли на 2008 г. О выплате дивидендов за 2007 год.
5. Утверждение годового отчета и баланса Общества за 2007 год.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членов Совета директоров и Ревизионной комиссии.
7. Выборы членов Наблюдательного совета.
8. Выборы Ревизионной комиссии Общества.
9. Об изменении уставного фонда ОАО «Универсам Заславль».
10. О внесении изменений в Устав ОАО «Универсам Заславль».
11. О проведении закрытой подписки на акции дополнительного выпуска.
12. О сделках Общества.
13. О переоценке основных средств Общества.

Акционер Общества принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности. **Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт и доверенность.**

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по указанному адресу (бухгалтерия) в период с 17 марта 2008 г. с 10.00 до 16.30, а в день проведения собрания — в помещении, где оно проводится.

Телефон для справок (017) 203 89 17.

УНП 100008383 **Совет директоров.**

ОАО «Брестский комбинат строительных материалов»

сообщает, что 27 марта 2008 года состоится очередное собрание акционеров

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 год и задачах на 2008 год.
2. Отчет Наблюдательного совета.
3. Отчет Ревизионной комиссии.
4. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности за 2007 год.
5. О выплате дивидендов за 2007 год и направлениях использования чистой прибыли в 2008 году и I квартале 2009 года.
6. Выборы членов Наблюдательного совета, Ревизионной комиссии и условия их материального вознаграждения.
7. О наделении Наблюдательного совета полномочиями, отнесенными к компетенции собрания.
8. О выкупе акций собственного выпуска.
9. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Собрание будет проводиться по адресу: г. Брест, ул. Московская, 360; актовый зал.

Начало собрания в 15.30.
Регистрация с 12.00 до 15.15.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 200295903

ОАО «Минский приборостроительный завод» сообщает:

27 марта 2008 года в 14.00 в корпусе № 40 Общества по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 58, состоится очередное собрание акционеров и их представителей.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2007 году. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2008 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2007 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2007 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли и расходов на потребление, а также выплате дивидендов за 2007 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2008 год.
7. Об утверждении изменений в Устав Общества.
8. О передаче подъездной дороги в п. Сосны в коммунальную собственность.
9. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
10. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Регистрация участников собрания с 13 до 14 часов при предъявлении паспорта. Акционер ОАО «Минский приборостроительный завод» принимает участие в работе собрания лично или через своих представителей, действующих на основании доверенности.

УНП 100363840 **Наблюдательный совет.**

Наблюдательный совет ОАО «Белэнергоавтоматика»

сообщает о проведении 26 марта 2008 года в 14 часов общего собрания акционеров по итогам работы за 2007 год по адресу: г. Минск, ул. Омельянюка, 20, второй этаж, зал заседаний.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет о работе Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии в 2007 году.
2. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2007 году и основных направлениях деятельности Общества в 2008 году.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков и распределение прибыли за 2007 год, с учетом заключения Ревизионной комиссии.
4. О направлении использования чистой прибыли Общества в 2008 году и первом квартале 2009 года.
5. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по месту нахождения Общества, у юрисконсульта, с 14 по 25 марта 2008 г. в рабочие дни с 8.00 до 17.00.

Регистрация участников собрания с 13.00 до 14.00 по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 1 марта 2008 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность, зарегистрированную в установленном законодательством порядке.

УНП 100064414

Спорт-тайм

ЭДУАРДА ДА СІЛВА МОГ СТРАЦІЦЬ НАГУ

Вядучы англійскі ўрач-астэапат і фізіятэрапеўт Цім Элардайс заявіў, што лідар зборнай Харватыі і лонданскага «Арсенала» Эдуарда да Сілва, які атрымаў цяжкі пералом галёнкі падчас матча з «Бірмінгемам» **(на фота)**, мог пазбавіцца ступні. Паводле меркавання Элардайса, толькі кваліфікаваныя дзеянні ўрачоў «Арсенала» выратавалі нагу іграка. Пры гэтым ён засумняваўся ў тым, што Эдуарда зможа выйсці на свой звыклы ўзровень гульні. «Звычайны чалавек пасля такой траўмы будзе аднаўляцца шэсць месяцаў, Эдуарда спатрэбіцца не менш за дзевяць. Акрамя непасрэдна фізічнай траўмы ў дадзеным выпадку вялікае значэнне мае псіхалагічны эфект, які можа ўздзейнічаць на футбаліста на працягу года пасля выздараўлення», цытуе Элардайса Sky News. Нагадаем, што Эдуарда да Сілва атрымаў траўму падчас сутыкнення з абаронцам «Бірмінгема» Марцінам Тэйларам, які ўрэзаўся ў галёнку натуралізаванага бразільца прамой нагой.

СКОКНУЛІ Ў ПЕКІН

У Пекіне завяршыўся этап Кубка свету па скачках у ваду, дзе разыгрываліся апошнія квоты на ўдзел у Алімпіядзе-2008. Па выніках этапа каманда Беларусі атрымала дзве ліцэнзіі. На трохметровым трамплінe ўдала выступіла Дар'я Роменская, а на дзесяціметровай платформе ў дадатковай кваліфікацыі поспеху дасягнуў Аляксандр Варламаў. А вось галоўнай нашай надзеі — дуэту Вадзім Каптур/Аляксандр Варламаў да запаветнай мэты не хапіла ўсяго 0,78 бала. Менавіта на столькі іх апярэдзіў калумбійскі дуэт.

ШАНЦЫ БАКСЁРАЎ НЕ СТРАЧАНЫ

У італьянскай Пескары стартаваў адзін з баксёрскіх адборачных турніраў да Алімпіяды-2008. У складзе беларускай дэлегацыі на Апеніны накіраваліся 11 спартсменаў. Агульная колькасць нашых баксёраў, паводле планаў міністра спорту і турызму Аляксандра Грыгарава, які ўзначальвае Беларускую федэрацыю аматарскага боксу, павінна скласці 6—7 чалавек. Як вядома, галоўным этапам адбору на Гульні-2008 у баксёраў быў чэмпіянат свету, які прайшоў мінулай восенню ў Чыкага (ЗША). Па яго выніках пуцёўкі ў Пекін атрымалі 80 атлетаў з 37 краін. Ні аднаму з нашых суайчыннікаў не ўдалося тады прабіцца ў васьмёрку, што ў большасці вагавых катэгорый дазволіла б атрымаць алімпійскую ліцэнзію. Астатнія вакансіі будуць разыграны на некалькіх кваліфікацыйных турнірах, якія будуць праходзіць да канца красавіка. Зборная Беларусі возьме ўдзел у двух з іх: апроч памянёнага турніра ў італьянскай Пескары, з 7 па 14 красавіка ў Афінах.

АНРЫ ХАГУШ ВЯРНУЎСЯ Ў БАТЭ

Расійскі абаронца Анры Хагуш, які пасля заканчэння мінулага сезона імкнуўся працаўладкавацца на радзіме, вярнуўся ў барысаўскі БАТЭ. Пасля заканчэння адпачынку футбаліст нечакана апынуўся на праглядзе ў яраслаўскім «Шынніку». Але на днях ігрок з'явіўся ў офісе барысаўскага клуба і заключыў новае працоўнае пагадненне. Такім чынам, наступны сезон Хагуш правядзе ў складзе БАТЭ. Прычынай развітання Хагуша з «Шыннікам» сталі рознагалоссі ва ўмовах асабістага пагаднення.

МАТЧ ПРАЦЯГЛАСЦЮ БОЛЬШ ЗА 10 СУТАК

У канадскай правінцыі Альберта адбыўся самы працяглы хакейны матч, які завяршыўся з лікам 2250:2223 на карысць дружыны «Лячэнне» (яна спаборнічала з «Надзеяй»). Энтузіясты з мястэчка Шэрвуд-Парк бесперапынна гулялі на адкрытай пляцоўцы больш за 10 сутак запар (241 гадзіну). Цікава, што ігракі пабілі на цэлую гадзіну ўласны рэкорд, які ўстанавілі 3 гады таму. Незвычайны матч праводзіўся з дабрачыннай мэтай — сабраць сродкі для барацьбы з дзіцячымі анкалагічнымі захворваннямі.

Ад дзяржкантролю не схаваешся!

РЭЦЫДЫЎ?

Пасля распаду Саюза ў эканоміцы панаваў сумбур і ў той час для ашуканцаў было вялікае раздолле. Напрыклад, прадпрыемства пералічвала нейкай фірме вялікія грошы на пастаўку сыравіны ці адпраўляла сваю прадукцыю за межы рэспублікі, а ўзамен нічога не атрымлівала. І няпроста было высветліць, што там: змова ці прадпрыемства «кінулі». Але гэта было ў мінулым.

Баранавіцкі міжраённы камітэт дзяржаўнага кантролю Брэсцкай вобласці правёў праверку некалькіх прадпрыемстваў, якія належаць Брэсцкаму абласному спажыўтаварыству, і аказалася, што не ўсё засталося ў мінулым.

Тут неабходна адзначыць, што наша спажывецкае таварыства — вельмі разгалінаваная структура і можа займацца ад рознічнага гандлю да дзейнасці па забеспячэнні бяспекі юрыдычных і фізічных асобаў. Пры наяўнасці вялікай колькасці магазінаў, перапрацоўчых прадпрыемстваў, нарыхтоўчых пунктаў і інш. спажыўтаварыства, тым не меней, арганізацыя не дужа багатая і з гэтай нагоды павінна берагчы кожны рубель.

А пры праверцы «Баранавіцкай міжраённай гандлёвай базы» было ўстаноўлена, што за грамадскія грошы там асабліва ніхто і не хвалюецца.

База займаецца знешнеэканамічнай дзейнасцю, у якой на імпарт робіцца асноўны націск. Так, у знешнегандлёвым абароце летась імпартныя аперацыі склалі 94,4 працэнта, а экспартныя ўсяго 5,6. У асноўным база закупляе за межамі краіны свежамарожаную рыбу і рыбныя кансервы, менавіта на іх прыпадае 88 працэнтаў знешгандлёвага імпартнага абароту.

«Баранавіцкая міжраённая гандлёвая база» падтрымлівае дзелавыя сувязі з расійскім ЗАТ «Запрыбзбыт», якое знаходзіцца ў Калінінградзе. Вось туды база і адгрузіла закансерваваны бярозавы сок на суму 831215,9 расійскіх рублёў (прыкладна 35 тыс. долараў). Адпраўлялі прадукцыю пачынаючы з 13 лютага 2007 года, а праверку дзяржканторль праводзіў праз год, у лютым 2008-га.

«Аднак на момант праверкі валюта ў суме 731215,9 расійскіх рублёў не вернута расійскай фірмай, кансерваваную прадукцыю таксама не вярнулі. Юрыдычнай службай прадпрыемства не праводзілася работа па вяртанні запазычанасці, прэтэнзіі на адрас юрыдычнай асобы не накіроўваліся. Спагнанне запазычанасці праз суд не праводзілася...», — пішацца ў заключэнні дзяржкантролю.

Здавалася б, грошы і не вялікія, але іх было б дастаткова, каб выплаціць месячную зарплату ўсяму калектыву (109 чалавек) і яшчэ пад дзесятак мільёнаў засталося б. Грошай няма, а ніхто не б'е трывогу, хоць па закону, калі на працягу трох месяцаў валюта не паступіла, то неабходна рабіць захады, каб вярнуць яе. Трэба думаць, што тыя грошы ўвесь гэты час дзесьці круцяцца і даюць прыбытак і напэўна ж за 265 дзён пратэрміноўкі страты базы выраслі ў некалькі разоў, бо за гэты час расійскія рублі не адзін раз абярнуліся б таварам.

І гэты выпадак не выключэнне, на прадпрыемстве свядома скажалі справаздачу. Вось мінула тры месяцы, а запазычанасць у суме 1041,0 млн рублёў не ўключана ў дэбіторскую запазычанасць, бо чаго хвалявацца за грамадскія грошы. Вернуць пазней, а калі і не вернуць, як за той бярозавы сок, то і бяда не вялікая — не свае ж прападаюць.

Справаздача дзяржкантролю насычана рознымі парушэннямі на Баранавіцкай міжраённай гандлёвай базе. У чым жа справа?

— Ды ў тым, што на базе няма элементарнага парадку. Галоўны бухгалтар адразу звольніўся, а за ім пацягнуліся і астатнія работнікі бухгалтэрыі. Калі б у кіраўніка прадпрыемства была выразная пазіцыя і калектыў лавіў кожнае яго слова, то я ўпэўнена, што да гэтага не дайшло б, — сказала Галіна Будчан, галоўны спецыяліст Баранавіцкага МРКДК Брэсцкай вобласці.

Відавочна, ніводная іншая арганізацыя Брэстчыны апошнім часам так не засвяцілася ў плане розных фінансавых парушэнняў, як спажывецкае таварыства. Ва ўсякім разе, асабіста і неаднаразова даводзілася пісаць артыкулы пра такія выпадкі. І калі на лаву падсудных адразу села 12 чалавек бухгалтараў і прадаўцоў аднаго з райпо, то неабходна разабрацца у самой арганізацыі — ад вобласці да нізавых структур.

ПУП «Баранавіцкі нарыхтпрамгандаль» таксама з'яўляецца падраздзяленнем спажыўкааперацыі і мае не толькі 44 гандлёвыя пункты, а яшчэ займаецца і закупам лому і адходаў чорных і каляровых металаў. На гэтую дзейнасць мы і звернем увагу.

Хто ў нас найперш здае металалом? Людзі бедныя, якія стараюцца хоць нейкім чынам падтрымаць сваё існаванне. Вязуць на калясках, веласіпедах ці цягнуць розны жалезны хлам на пункты прыёму, і такіх здатчыкаў нямала.

За 9 месяцаў 2007 года пастаўлена лому і адходаў чорных металаў у 2,3 раза больш, чым устаноўлена дзяржаўным кантрактам для прадпрыемства на 2007 год.

Людзі стараюцца, здаюць, а іх падманваюць. За 1 кг лому і адходаў неабходна плаціць 200 рублёў, такая ўстаноўлена цана, а здатчыкам выплачвалі па 160 рублёў. Прыёмшчыца нарыхтоўчага пункта № 2 А. Якоўчык растлумачыла, што цана на нарыхтоўку ўсяго чыгуннага лому і адходаў даведзена ў пісьмовай форме эканамістам па цэнах у памеры 160 рублёў.

І каго ашуквалі? Людзей, якія апынуліся ў нашым грамадстве на самым нізе.

Закуп металалому ад аўтамашын, сельскагаспадарчай тэхнікі, іх вузлоў і дэталяў неабходна праводзіць праз журнал, фіксаваць здачу, указваць пашпартныя звесткі здатчыкаў. На нарыхтоўчым пункце № 7 выявілася цэлая група фіктыўных здатчыкаў. Напрыклад, А. Яцкевіч заявіў, што ён ніякіх адносінаў не мае да 1560 кг здадзенага металалому. Нарыхтоўшчык А. Варабей растлумачыў, што звесткі аб здатчыках запісваў з іх слоў і ніякіх дакументаў не пытаў.

Праверка была выбарачнай і факты, прыведзеныя ў артыкуле, асобныя, але і яны гавораць, што арганізацыя работы на памянёных прадпрыемствах не на ўзроўні. Свае кантралёры неаднаразова правяралі гэтыя аб'екты, але прыведзеных вышэй парушэнняў не выявілі. Ёсць над чым падумаць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«Загрыпавалі» ўсходнія рэгіёны Беларусі

Амаль што 76 тысяч выпадкаў захворвання беларусаў на грып і вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі было зарэгістравана ў кантрольных гарадах за апошні тыдзень (з 18 па 24 лютага).

Па стане на 25 лютага эпідэмічны парог па-ранейшаму быў перавышаны ў 10 кантрольных гарадах і на 32 адміністрацыйных тэрыторыях. Да «грыпуючых» тэрыторый далучыліся на мінулым тыдні Орша і Наваполацк, а таксама Жлобінскі, Чачэрскі, Лепельскі і Лёзненскі раёны. А выйшлі з эпідэміі Ашмянскі і Чэрыкаўскі раёны. Па прычыне адсутнасці больш як 30 працэнтаў навучэнцаў вучэбны працэс зараз спынены ў 37 установах адукацыі (у Баранавічах, Віцебску, Мінскім, Чэрвеньскім, Круглянскім, Пінскім, Пастаўскім і Лепельскім раёнах).

У сталіцы на мінулым тыдні назіралася паступовае змяншэнне колькасці мінчан, што захварэлі на прастуду — усяго было зарэгістравана больш як 27 тысяч звароты гараджан у медыцынскія ўстановы, што на 15 працэнтаў менш, чым за папярэдні тыдзень. Аднак эпідэмічны парог усё роўна быў у Мінску перавышаны. Усяго з пачатку эпідэмічнага пад'ёму на грып і прастуду ў сталіцы захварэлі 151 тыс. мінчан, што складае 8,4 працэнта ад агульнай колькасці насельніцтва.

Надзея НІКАЛАЕВА.

РУП «Белспецконтракт» проводит аукцион по продаже автомобильной техники

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

на 2-ом открытом аукционе по продаже объектов республиканской собственности 28 марта 2008 г.

№ п/п	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта, (руб.)	Сумма задатка, (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
1.	Грузовой Урал-4320-01 ш. 039865, дв. 765708	г. Брест, в/ч 92504	1985	40 325	13 000 000	1 300 000

2-й аукцион состоится в 11 часов 28 марта 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, РУП «Белспецконтракт».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в **17 часов 26 марта 2008 г**. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604, РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, резиденты Республики Беларусь и нерезиденты, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 28 марта 2008 года.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС**. **Справки по тел.: (017) тел./факс 224 88 05. Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.com; e-mail: info@belspeckontrakt.com.**

ЗА МІЗЭРНЫМ ПАМЕРАМ АПЛАЧАНАЙ ДЗЯРЖПОШЛІНЫ СТАЯЦЬ ШМАТМІЛЬЁННЫЯ ЗДЗЕЛКІ КЛІЕНТАЎ

Спецыяльна для «Звязды»

У сярэдзіне сакавіка беларускі натарыят адзначыць свой 90-гадовы юбілей. У сталіцы, у кожнай вобласці Міністэрствам юстыцыі адна з дзяржаўных натарыяльных кантор заснуецца ў якасці першай дзяржаўнай натарыяльнай канторы для найбольш складаных натарыяльных дзеянняў. З кіраўніком менавіта такога «флагмана» ў Мінску — загадчыцай першай гарадской натарыяльнай канторы Святланай ГУРЫНОВІЧ — і сустрэўся журналіст «Звязды».

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Святлана Фёдараўна, падпарадкаваная вам кантора, наколькі я ведаю, з'яўляецца першай не толькі згодна з парадкавым нумарам. Вы — першыя і ў справе...

— Мы сапраўды першымі ў краіне пачалі працаваць са шлюбнымі дагаворамі, першымі распрацавалі і ўкаранілі інстытут атрымання ў спадчыну прыватызаваных кватэр. І хоць на сёння на заканадаўчай аснове ён не замацаваны, мы шмат робім для грамадзян, не парушаючы заканадаўства. Мы першыя, хто стаў сведчыць дагаворы сурагатнага мацярынства: з сямі выпадкаў па сталіцы за мінулы год пяць былі засведчаны ў нашай гарадской натарыяльнай канторы. Гэта пакуль яшчэ новы, рэдкі від дагавора, да нас — каб максімальна захаваць канфідэнцыяльнасць — ездуць, напрыклад, і з Віцебска, і з Гомеля. Увогуле, 40 працэнтаў нашых кліентаў — іншагароднія. Ездуць з іншых рэгіенаў у тым ліку і таму, што ў нас вялікі штат перакладчыкаў, у тым ліку і з «рэдкіх» моў, скажам, з казахскай ці ўзбекскай.

— Ці дастаткова ў Мінску натарыусаў, асабліва з улікам іншагародніх кліентаў? Ці ёсць для звычайнага грамадзяніна розніца, да каго яму звяртацца: да натарыуса ці да адваката?

— Звяртацца заўсёды трэба да спецыяліста. Але калі пытанні датычыцца натарыята — лепш да натарыусаў. Па выніках платнай кансультацыі яны заўсёды ў прысутнасці кліента рыхтуюць і выдаюць пісьмовую раздрукоўку размовы (з абавязковым захаваннем у канторы другога экзэмпляра). Такая раздрукоўка дапамагае ў далейшым разабрацца: хто што сказаў або прапусціў. Праблемы з натарыяльным абслугоўваннем у сталіцы не існуе, у Мінску працуюць 24 натарыяльныя канторы, у некаторых раёнах — па дзве-тры. Увогуле, я лічу, што інстытут кансультацый сябе ўжо зжыў. Сёння, дзякуючы прынцыпу «аднаго акна» (дарэчы, сярод дзяржустаноў менавіта мы першымі пачалі ўкараняць яго з 2005 года), чалавеку ўвогуле пры звароце не трэба ведаць, якія дакументы неабходна мець. На размову з натарыусам ідзе не больш за 5—7 хвілін. «Хочаце падарыць? Добра, ваш пашпарт, калі ласка. Да пабачэння». Усё астатняе за кліента зробіць менавіта натарыус. Праблема тут, напэўна, у іншым...

— У кліентах, у культуры паводзінаў?

— Так, апошнія два гады назіраецца нейкая нецярплівасць грамадзян... Хоць сёння чаканне ці, дакладней, знаходжанне кліента ў натарыяльнай канторы ў сярэднім не перавышае 15—20 хвілін. Пры наяўнасці чаргі з пяці-шасці чалавек (нехта прынёс дакументы, хтосьці прыйшоў іх забраць) заўсёды працуе дзяжурны натарыус. Але некаторыя кліенты імкнуцца ўчыніць скандал, сказіць факты, магчыма, такім спосабам імкнучыся аказаць пэўны ціск. Такія паводзіны ніколі не паўплываюць на вынясенне станоўчага, як таго хацелася б некаторым грамадзянам, рашэння па іх пытаннях — усё павінна быць у рамках заканадаўства. Больш за тое, цяпер ва ўсіх натарыяльных канторах вядзецца відэа- і аўдыёнагранне, сістэма дазваляе вылічыць: колькі канкрэтны чалавек знаходзіўся ў чарзе, якія кансультацыі атрымліваў і колькі па часе. Кабінеты абсталяваны «трывожнымі кнопкамі», якімі ў іншых натарыяльных канторах, на жаль, калегам даводзілася карыстацца... Гэта пры тым, што для кліентаў створаны максімум зручнасцяў: ад прыёму «вузкімі» спецыялістамі да запісу па тэлефоне, кансультацый, у тым ліку і па тэлефоне, выездаў натарыусаў на дом да кліента.

— Калі ласка, Святлана Фёдараўна, раскажыце пра апошнія віды паслуг больш падрабязна? Колькі яны каштуюць кліенту?

— Калі чалавек прыходзіць да нас, натарыус першапачаткова кансультуе яго бясплатна. Мы не патрабуем першапачатковай аплаты, маўляў, толькі пасля гэтага з вамі будуць размаўляць. Толькі пасля кансультацыі даём накіраванне і просім — калі ласка, аплаціце паслугі. Дык вось, 90 працэнтаў — не аплачваюць. Пра што гэта гаворыць? Зноў жа памянёная вышэй культура паводзінаў... Тое ж самае скажу і пра тэлефонныя кансультацыі — вельмі шмат робіцца бясплатна, хоць, у прынцыпе, такія паслугі павінны аплачвацца. Чалавек жа часам вырашае пытанні, звязаныя са шматмільённай маёмасцю, а расцэнкі на паслугі натарыусаў апошні раз павялічваліся ў кастрычніку 2007 года. Якія яны, мяркуйце самі — удвая меншыя, чым у адвакатаў. Напрыклад, кансультацыя па пытаннях афармлення спадчынных правоў (можа доўжыцца да гадзіны па часе) — 5130 рублёў. Кансультацыя па пытаннях сведчання адчужэння жылога памяшкання — 3870 рублёў. Нагадаю, між іншым, што кошт аднаго талончыка на праезд у гарадскім пасажырскім транспарце каштуе 600 рублёў.

Калі гаварыць пра такую паслугу, як выезд натарыуса на дом, дык яна апошнім часам становіцца ўсё больш запатрабаванай: за дзень кожная з натарыяльных кантор сталіцы ажыццяўляе 3—6 выездаў на дом да хворых, што дастаткова шмат і ёсць тэндэнцыя да павелічэння. Праўда, трэба агаварыцца, што на дом натарыус можа пад'ехаць толькі да асобы, якая з'яўляецца дзеяздольнай (разумее значэнне сваіх дзеянняў), але па прычыне фізічнага стану (хваробы, узросту) на дадзены момант не можа самастойна наведаць натарыяльную кантору. У гэтым выпадку грамадзянін мае права зрабіць выклік натарыуса па тэлефоне. Родныя, сябры такой асобы, якія прадстаўляюць яго інтарэсы, звычайна аплачваюць за яе дзяржпошліну і на ўласным аўтатранспарце падвозяць натарыуса. Калі ж кліент з'яўляецца зусім адзінокім чалавекам (што сустракаецца даволі рэдка), натарыус у межах двухтрох прыпынкаў грамадскага транспарту выязджае да кліента на апошнім. У такой сітуацыі наш работнік мае права ўзяць з сабой квітанцыйную кніжку і ўзяць грошы ў грамадзяніна ў якасці аплаты дзяржпошліны наяўнымі — з абавязковай выдачай квітанцыі. Дарэчы, сёння не мае значэння пры аплаце дзяржпошліны тая акалічнасць, звярнуўся кліент непасрэдна ў натарыяльную кантору ці наш спецыяліст выехаў да яго дадому, хоць раней пры другім варыянце дзяржпошліна была ўдвая большай. Гэта вельмі зручна для грамадзян.

— Ці ёсць ільготы для нейкіх катэгорый грамадзян?

— Так, такіх катэгорый шмат. Ад платы дзяржпошліны за здзяйсненне натарыяльных дзеянняў, у прыватнасці, вызвалены інваліды Вялікай Айчыннай вайны. А гэтаксама пенсіянеры за засведчанне даверанасці на атрыманне пенсій, дзяржаўных дапамог, аліментаў. Увогуле, ад платы пошліны ў нас вызваляюцца пенсіянеры за ўсе натарыяльныя дзеянні, не звязаныя з маёмасным характарам; якія не накіраваны на ўзнікненне, змяненне правоў і абавязкаў — атрыманне копій подпісаў.

Што датычыцца спадчыннага права, дык ільгота прадастаўляецца спадчыннікам, якія пражывалі на дзень смерці спадчынадаўцы і на момант атрымання пасведчання аб праве спадчыны працягвалі пражываць на той жа жылплошчы. Можна таксама, да прыкладу, прыгадаць яшчэ непаўналетніх, якіх Закон «Аб дзяржаўнай пошліне» таксама ўнёс у новы пералік асобаў і якім прадастаўляецца льгота па аплаце натарыяльных дзеянняў.

— Дзякуй за гутарку!

Сяргей РАСОЛЬКА.

P.S. *Улічваючы актуальнасць і сацыяльную значнасць для многіх грамадзян тэмы, узнятай на старонках газеты, рэдакцыя мае намер у бліжэйшы час вярнуцца да яе. Сачыце за публікацыямі ў «Звяздзе»!*

Дарэчы, па дамоўленасці з загадчыцай першай гарадской натарыяльнай канторы г. Мінска Святланай Гурыновіч нашы чытачы могуць дасылаць свае пытанні, якія датычацца натарыяльнай дзейнасці, або пісьмова (220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А, газета «Звязда», з адзнакай «Натарыят»), або па тэлефоне рэдакцыі 287 17 41. Па выніках зваротаў на старонках газеты будуць дадзены кампетэнтныя адказы.

МІГРАЦЫЙНЫ ПРЫРОСТ — 4,7 ТЫС. ЧАЛАВЕК

У параўнанні з 2006 годам гэты паказчык знізіўся на 16,9 працэнта, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА Ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу.

Паводле даных Мінстата, у Беларусь у мінулым годзе прыбылі 14 тыс. 155 чалавек, а выехалі за межы рэспублікі 9 тыс. 479 чалавек (у 2006 годзе — адпаведна 14 тыс. 124 і 8 тыс. 498 чалавек).

З краін СНД і Балтыі прыбылі ў мінулым годзе 12 тыс. 566 чалавек, выбылі — 7 тыс. 278 (у 2006 годзе — адпаведна 13 тыс. і 7 тыс. 290 чалавек). Па-ранейшаму асноўны міграцыйны абмен Беларусі адбываецца з Расіяй, Украінай і Казахстанам. Імігранты з гэтых дзяржаў складаюць 84,2 працэнта ў агульнай колькасці тых, хто прыбыў у нашу рэспубліку з краін СНД і Балтыі. Так, з краін далёкага замежжа ў нашу рэспубліку прыбылі ў мінулым годзе 1 тыс. 589 чалавек, выбылі 2 тыс. 201. Для параўнання: у 2006 годзе было адпаведна 1 тыс. 124 і 2 тыс. 208.

«ХТО З'ЕСЦЬ САМЫ ВЯЛІКІ ТОРТ»

У Вялікабрытаніі чалавек памёр падчас дабрачыннага турніру па паглынанні самага вялікага торта. Дакладная прычына смерці пакуль не названая. Мужчына ўдзельнічаў у турніры па паяданні тартоў, які праводзіў уэльскі начны клуб. Прыбытак ад вечарынкі павінен быў пайсці на рахунак мясцовай выставы мастацтва. Конкурс «Хто з'есць самы вялікі торт» быў кульмінацыйным момантам мерапрыемства. Супрацоўнікі бара аказалі чалавеку першую дапамогу, але ім не ўдалося выратаваць яму жыццё.

КНІГІ СКУЛЬПТАРА АЗГУРА

100-годдзе народнага мастака СССР і Беларусі скульптара Заіра Азгура Нацыянальная бібліятэка Беларусі вырашыла адзначыць кніжнай выставай.

Заір Азгур з'яўляецца аўтарам кніг «Незабыўнае» і «Тое, што помніцца». Акрамя таго, сам выступаў у ролі рэдактара і пісаў прадмовы да кніг па беларускім мастацтве. Але ж яшчэ ў кніжках змяшчаліся і яго ілюстрацыі. Напрыклад, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ёсць кніга, якая была выдадзена ў 1932 годзе, — менавіта яна дае ўражанне пра Азгура-ілюстратара. У Зале выяўленчых і відэадакументаў Нацыянальнай бібліятэкі на выставе «Я веру ў творчы пачатак Сусвету...», прысвечанай Заіру Азгуру, прадстаўлена каля 200 экспанатаў — кнігі, альбомы, каталогі выстаў, фатаграфіі, паштоўкі...

Ларыса ЦІМОШЫК.

ЛІДАР ПА КАМП'ЮТАРНЫХ ВІРУСАХ

Расія стала сусветным лідарам у распаўсюджванні камп'ютарных вірусаў, шкоданоснага і шпіёнскага праграмнага забеспячэння, апярэдзіўшы Кітай і ЗША, паведамляюць інфармагенцтвы. Паводле ацэнак аналітыкаў, на долю Расіі прыпадае 27,89 працэнта шкоданосных праграм у свеце, Кітая — 26,52, ЗША — 9,98 працэнта.

Уведомление о созыве очередного общего собрания акционеров ОАО «Универсам Фрунзенский»

Наблюдательный совет ОАО «Универсам Фрунзенский» извещает акционеров Общества о проведении очередного общего собрания акционеров. Собрание состоится 28 марта 2008 года в 15.00 в помещении Общества по адресу: г. Минск, пр-т Пушкина, 37.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О результатах работы Общества за 2007 год и основных направлениях деятельности Общества в 2008 году.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2007 году.
3. Утверждение заключения Ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 г. Рассмотрение результатов аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 г.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества.
5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) за 2007 г. и выплате дивидендов.
6. О направлениях использования чистой прибыли в 2008 году.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8. О наделении членов Наблюдательного совета полномочиями решения ряда вопросов, отнесенных Уставом Общества к компетенции общего собрания акционеров.
9. Об утверждении Положения о порядке учета аффилированных лиц Общества и согласования сделок в совершении которых имеется заинтересованность аффилированных лиц.

Регистрация участников собрания будет производиться в день проведения собрания с 14.00 до 15.00. Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность; представителю акционера — доверенность и документ, удостоверяющий личность.

Наблюдательный совет ОАО «Универсам Фрунзенский».

УНП 100135329

ОАО «Славянский Союз»

извещает о проведении очередного общего собрания акционеров, которое состоится 29.03.2008 г. по адресу: г. Орша, ул. Замковая, д. 11, к. 1.

Начало регистрации в 10.00, начало собрания в 11.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет дирекции об итогах деятельности Общества за 2007 г.
2. О годовом балансе и отчете о прибылях и убытках Общества за 2007 г.
3. О распределении чистой прибыли Общества за 2007 г.
4. Избрание совета директоров и ревизора Общества.

При себе необходимо иметь:

акционеру — документ, удостоверяющий личность;

представителю акционера — доверенность, оформленную в соответствии с законодательством.

С материалами повестки дня можно ознакомиться по адресу: г. Орша, ул. Замковая, 11 с 9.00 до 18.00.

УНН 300257402.

Считать утерянными страховые полисы ЗСАО «Бролли»:

- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 0366215, 0366216, 0609207, 0609314, 0614611,0614220, 0614633, 0706695, 0710830, 0732985, 0740991-0740992;
- добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско), ф.2РН, 2РП серия АК №№ 0006172, 0007852, 0008675, 0008686, 0014524;
- добровольное страхование строений; добровольное страхование домашнего имущества (ф.2РН) серия БИ №№ 0371307, 0371308;
- квитанция 1-СУ серия ГС № 5381739.

Вяртаючыся да надрукаванага

НА АЎТАДАРОЗЕ З'ЯВЯЦЦА ДАДАТКОВЫЯ ПРЫПЫНКІ ДЛЯ АЎТОБУСАЎ

Гісторыя гэта, нагадаем коратка, пачалася яшчэ ўвосень мінулага года са звароту мінчанкі, якая рэгулярна наведвае бацькоў у Смалявіцкім раёне. Для гэтага яна карыстаецца маршруткай «Мінск—Жодзіна» (перавозчыкам на згаданым маршруце з'яўляецца даччынае ўнітарнае прадпрыемства «Аўтамабільны парк № 18» г. Жодзіна).

Гаворка, у прыватнасці, вялася адносна прыпынкаў па запатрабаванні. У іх былі зацікаўлены найперш самі пасажыры (нашу заяўніцу аднойчы вадзіцель маршруткі адвёз і высадзіў за 7—8 кіламетраў ад патрэбнага ёй месца — на «афіцыйным» прыпынку). Разумеў і падтрымліваў грамадзян перавозчык, але спасылаўся на тое, што ў накірунку Мінска (дарога Слабада—Навасады, Р-53) існуе абмежаваная колькасць абсталяваных прыпынкавых пунктаў, на якіх, згодна з Правіламі аўтамабільных перавозак пасажыраў у Рэспубліцы Беларусь, могуць спыняцца прыгарадныя аўтобусы. «ДУП «Аўтапарк № 18» неаднаразова звяртаўся да дарожных арганізацый, адказных за арганізацыю прыпынкавых пунктаў на дадзенай дарозе. Аднак істотных змяненняў у сітуацыі не адбылося, нягледзячы нават на павелічэнне ДТЗ на праблемных участках дарогі (скрыжаванне дарог Р-53 і Р-66, прыпыначныя пункты «Калюга», «Жажэлка»)», паведаміў нам у мінулы раз перавозчык.

І вось мы атрымалі адказ ад дарожнікаў — рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства аўтамабільных дарог «Мінскаўтадарцэнтр». У лісце паведамляецца, «што ў кастрычніку 2007 года ДУП «Аўтапарк № 18» быў праінфармаваны аб тым, што праграмай работ 2008 года прадугледжана ўладкаванне на аўтадарозе Р-53 Слабада—Навасады дадатковых чатырох пляцовак для прыпынку аўтобусаў (дарэчы, заяўніца, звязаўшыся з рэдакцыяй зноў, паведаміла, што, сапраўды, на патрэбным ёй участку дарогі адзін такі прыпыначны пункт ужо з'явіўся. — **С.Р.**)

Інфармацыя аб павелічэнні ДТЗ на скрыжаванні аўтадарог Р-53 Слабада—Навасады з Р-59 Лагойск—Смалявічы—Мар'іна Горка, прыпыначных пунктах «Калюга» і «Жажэлка» не адпавядаюць сапраўднасці. Так, у 2007 годзе на дадзеных участках аўтадарогі зарэгістравана адно ДТЗ з удзелам пешахода па прычыне пераходу праезнай часткі ва неўстаноўленым месцы». (А хіба нават адно здарэнне не лічыцца павелічэннем колькасці ДТЗ, калі дагэтуль іх не было? — **С.Р.**)

Сяргей РАСОЛЬКА.

В связи с утерей страхового полиса серии ББ **№ 0054301 считать его недействительным.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Свойскія птушкі

5-гадовы Уладзік СТАНЧЫК з в. Буднеў Клічаўскага раёна глядзіць з акна, якое калісьці зрабіў майстар цяслярскай і сталярнай справы, яго зямляк-аднавясковец, ветэран вайны Палікарп Дзямідавіч Акуліч. Магчыма і Уладзік стане добрым майстрам.

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.



Аўтаадказчык

НАЧАПІЦЕ ФЛІКЕРЫ, А НЕ ШУКАЙЦЕ «ЗАЧЭПАК» У ПДР

Ці абавязкова насіць флікер у горадзе пры наяўнасці асвятлення? У Правілах дарожнага руху на гэты конт няма дакладнага «загаду».

Уладзімір РАКЕВІЧ, *г. Мінск*

Сапраўды, на першы погляд здаецца, што для гарадскіх пешаходаў можа быць зроблена выключэнне наконт выкарыстання флікераў. Бо ў прыватнасці, паводле пункта 17.1 Правілаў дарожнага руху: «Падчас руху па краі праезнай часткі дарогі ў цёмны час сутак пешаход абавязаны абазначыць сябе святлоадбівальнымі элементамі». Пра наяўнасць ці адсутнасць асвятлення ў ПДР нічога не ўзгадваецца. Таксама дакладна не прапісана, у населеным пункце ці за яго межамі дзейнічае гэта патрабаванне Правілаў. Аднак, гэта не той выпадак, калі, што не забаронена, тое — дазволена. Як патлумачыў старшы інспектар УДАІ МУС Беларусі Фёдар Гуліцкі, незалежна ад таго, асветлена дарога ці не, гарадская альбо вясковая гэта вуліца, ці шаша за межамі населенага пункта, паводле ПДР пешаход абавязаны абазначыць сябе святлоадбівальным элементам у цёмны час сутак. Зразумела, гэта датычыцца тых выпадкаў, калі пешаход рухаецца па краі праезнай часткі дарогі.

Больш за тое, Дзяржаўтаінспекцыя рэкамендуе насіць флікеры не толькі ў цёмны час сутак, але і днём ва ўмовах недастаткавай бачнасці: пры руху ў тумане, у непагадзь. Падобныя дадатковыя меры бяспекі нялішнія. Праведзены Дзяржаўтаінспекцыяй эксперымент засведчыў, што ў цемры пры бліжнім святле фараў вадзіцель можа ўбачыць пешахода на адлегласці да 30 метраў. Улічваючы, што пры хуткасці 60 км у гадзіну аўтамабіль за 1 секунду праязджае 17 метраў, часу на прадухіленне ДТЗ звычайна не хапае. А вось, калі пешаход носіць флікер, то становіцца заўважаным ужо на адлегласці 130—140 метраў і гэта дае магчымасць пазбегнуць аварыі. Даследаванні паказалі, што выкарыстанне святлоадбівальнага элемента змяншае рызыку наезду на пешахода ў цёмны час сутак на 85 працэнтаў. Інакш кажучы, флікер ратуе дзесяткі, а магчыма і сотні людзей. Так што лепш яго начапіць на верхняе адзенне, а не шукаць «зачэпак» у Правілах дарожнага руху.

Аўтапарады

ВЯСЕННІЯ ПРАЦЭДУРЫ І МАНЕЎРЫ

Неўзабаве вясна. Таму аўтааматарам ужо варта пачынаць падрыхтоўку да эксплуатацыі свайго «жалезнага каня» ў іншых кліматычных умовах. Вось некалькі карысных парад на гэты конт.

Першая вясновая працэдура — водная. Неабходна вельмі грунтоўна вымыць кузаў аўтамабіля. Прычым не толькі звонку, але і знутры: у маторным адсеку, багажніку і нават у салоне. Бо хоць гэтая зіма і была не вельмі снежнай, тым не менш дарогі ўсё ж апрацоўвалі солевай сумессю. А гэта значыць, што небяспечная для кузава сумесь вясной можа ператварыцца ў «міну запаволенага дзеяння» для вашага аўто. У тым сэнсе, што гэтыя рэчывы растануць і пачнуць бязлітасна раз'ядаць машыну. Пасля «лазні» неабходна даць аўтамабілю хоць бы дзень на «прасушку». Потым трэба будзе дэталёва апрацаваць спецыяльнымі антыкаразійнымі прэпаратамі ўсе драпіны. Пры неабходнасці найбольш глыбокія «раны» варта пакрыць грунтоўкай і фарбай.

Завяршыўшы водныя працэдуры, пачынайце замену шынаў, масла, фільтраў. «Зімовы абутак» пажадана павесіць у гаражы на сцяне — так ён будзе лепш захоўвацца. Спецыялісты таксама раяць прачысціць паліўны бак. Справа ў тым, што зімой у ім звычайна збіраецца шмат кандэнсату. Для таго, каб яго выдаліць, неабавязкова здымаць бак. Зрабіць гэта дапаможа спецыяльная спіртазмяшчальная прысадка, разам з якой вада проста згарыць у камеры рухавіка.

І яшчэ некалькі парадаў гэтак званым «пралескам» — кіроўцам, якія ўсю зіму не эксплуатавалі сваё аўто. Каб аднавіць сваё вадзіцельскае майстэрства, такім асобам патрэбна ў лепшым выпадку некалькі тыдняў. На час адаптацыі пажадана пазбягаць месцаў з інтэнсіўным рухам. А калі ўжо трапіце на ажыўленую магістраль, то трымайцеся крайняй правай паласы і не адрывайцеся ад калектыву — рухайцеся з хуткасцю аснoўнай плыні.

Аўтаспорт

АЛІМПІЙСКІ ГІБРЫД

Афіцыйным аўтамабілем Алімпійскіх гульняў у Пекіне будзе кітайскі гібрыд «Chery A5».

Абслугоўваць Алімпіяду будуць 50 аўтамабіляў памянёнай маркі. Усе аўтамабілі аснашчаны бензінавымі і электрычнымі рухавікамі.

Аўтаюбілей

СІМВАЛ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

Днямі споўнілася роўна 40 гадоў з моманту выпуску першага аўтамабіля ГАЗ-24.

Гэтая мадэль «Волгі» амаль два дзесяцігоддзі была сімвалам савецкай улады. Менавіта аўтамабіль ГАЗ-24 быў асноўным сродкам перамяшчэння партыйных чыноўнікаў. Усяго з канвеера сышло больш за 600 тысяч машын памянёнай мадэлі.

Аўтаследаванне

«ВОЛЬНЫЯ РУКІ» — МАРУДНЫЯ РУХІ

Амерыканскія вучоныя з універсітэта Юты прыйшлі да высновы, што нават пры наяўнасці сістэмы Hands-free (вольныя рукі) балбатня за рулём па тэлефоне тоіць небяспеку для ўдзельнікаў дарожнага руху.

У прыватнасці, вынікі даследавання сведчаць, што падчас размовы кіроўца аўтаматычна аналізуе атрыманую інфармацыю і значна менш увагі надае дарожнай абстаноўцы. Больш за тое, рэакцыя маладых вадзіцеляў падчас тэлефоннай размовы становіцца такой жа маруднай, як у людзей сталага веку. Увогуле,»мабільныя балбатуны» ў чатыры разы часцей трапляюць у аварыі, чым «маўчуны».

Аўтажарт

Размова двух аўтааматараў.

— Толькі пахадзіўшы цэлы дзень па вуліцах пешшу, я зразумеў, што ў рэшце рэшт стаў сапраўдным аўтааматарам.

— Чаму ты так вырашыў? — недаўмявае калега.

— Кожны раз, праходзячы міма прыгожай жанчыны, я зыркаў то налева, то направа, спрабуючы разгледзець яе ў бакавых люстэрках.

Зімовыя зацемкі

«Дзівак» «...умер» без «натхнення»

Гэта не гісторыя пра сумны канец дзіўнага чалавека. Гэта гульня слоў, якія ўтвараюць назвы рэальных устаноў у розных населеных пунктах. Неяк ехалі зімовым вечарам электрычкай Мінск—Брэст з пляменнікам-студэнтам. На пад'ездзе да Жабінкі засвяціліся неонавыя літары. Мой спадарожнік са здзіўленнем прачытаў: «Чудак?». Калі цягнік запаволіў ход, мы разабралі, што напісана «Гудок». Проста літары такой мудрагелістай формы, што «г» можна прыняць за «ч», і «о» ад «а» мала чым адрозніваецца. А як было б цікава, — сталі мы разважаць, — калі б сапраўды кафэ называлася «Чудак», альбо яшчэ лепш па-беларуску «Дзівак». У такую установу так і захацелася б зазірнуць. Але фантазія правінцыйнага чыгуначнага сэрвісу далей «гудка», «магістралі», «мінуткі», як правіла, не заходзіць.

І не толькі чыгуначнага, але і ўсякага іншага. З'явіліся апошнім часам у райцэнтрах магазіны, пункты харчавання розных формаў уласнасці спрэс «алёнкі» ды «васількі». Ды і не толькі ў райцэнтрах. Калі ў адным мікраёне Брэста і цырульні, і майстэрні па рамонце адзення, і магазінчыкі называюцца аднолькава: «Святлана», «Людміла» ці то па імёнах гаспадынь, ці любімых жанчын гаспадароў прадпрыемстваў. Міжволі ўспамінаюцца словы вядомай песні: «И отныне все, что я ни сделаю, светлым именем твоим я назову». Парыў зразумелы, але як гаварыла намеснік дырэктара нашай школы: «Калі вам гэта імя дарагое, насіце яго ў сэрцы, а не вырэзвайце на парце». Нашы ж суайчыннікі робяць як прасцей, не напружваючы мазгоў. Вядома, за сталіцу казаць не варта, там і маштабы іншыя, і фантазія багацейшая, а вось у гарадах і вёсках прывыклі па-старому, каб не выдзяляцца, не кідацца ў вочы. Раней гэта было нормай. У Пружанскім раёне, скажам, тры калгасы называліся практычна аднолькава: імя Леніна, «Шлях Леніна», «Ленінскі шлях», — і ўсе астатнія ў гэтым жа родзе, нават далёкую «Парыжскую камуну» ўвекавечылі. І толькі адна калектыўная гаспадарка мела назву крышачку адметную — «Новая крыніца». Цяпер усе СВК і ААТ атрымалі імёны ў асноўным па назвах населеных пунктаў, і апошняе не пазбаўлена логікі. Аграгарадок у тым жа раёне, які аб'яднаў вёскі Мокрае і Казлы, назвалі «Жураўлінае». Прыгожа. Значыць, не перавяліся ў глыбінцы людзі рамантычнага складу.

Ды рамантызму яўна бракуе многім гарадскім і местачковым, якія адкрываюць свой бізнэс. У адным з серыялаў пра жыццё дарэвалюцыйнай Расіі амаль уся дзея адбывалася вакол кафэ «Блакітная карова». Сучасны гаспадар ад граху далей памяняў бы слова «блакітная» на «сіняя» ці «зялёная». Але з любым прыметнікам будзе цікава, запамінальна і, як цяпер сказалі б, прыкольна. Толькі вось справа ў тым, што яскравая назва адпаведнага зместу патрабуе. Мусіш дбаць пра марку фірмы, калі назваўся нетыпова, нязбіта. У той «Гудок» хіба дзівак і пойдзе, пасля наведвання ўстановы харчавання «Натхненне» па праспекце Машэрава абласнога цэнтра натхнення наўрад ці прыбавіцца. На памянёным праспекце, адной з цэнтральных вуліц Брэста, няма ніводнай невялікай, утульнай, камернай кавярні, дзе б смачна кармілі, якіх навалам цяпер на вуліцах Польшчы і другой суседкі, Украіны. Калі б іх было шмат, прысутнічала канкурэнцыя, тады б яны змагаліся за кліента, і пра якасць дбалі б, і назвы стараліся б даць прывабныя. Тады, можа, з'явілася б што-небудзь накшталт «Старога знаёмага», «Прынады», «Кубачка гарбаты». Як кажуць, па адзежы сустракаюць. Хто выкарыстоўвае ў назвах нацыянальны каларыт, на мой погляд, п'е з невычэрпнай крыніцы. Апошнім часам у Брэсце з'явілася хоць бы некалькі назваў беларускіх — рэстаран «Мытны двор», турысцкая сядзіба «Рынькаўка», «Карчма на Ковельскай». І сэрвіс там, варта прызнаць, на ўзроўні. Калі ж назвы шэрыя, якасць паслуг невыдатная, то і ўстанову не запомніш, і жаданне не ўзнікне прыйсці яшчэ. Падчас апошніх камандзіровак давялося абедаць у рэстаранах двух райцэнтраў. Назвы не памятаю, тыповыя, меню таксама тыповае. У абедзенны перапынак наведвальнікаў практычна не было. Чым не пацвярджэнне філасофскага пастулата аб адзінстве формы і зместу?

А вось чым кіраваліся стваральнікі забаўляльнага цэнтра ў Пінску, расшыфраваць цяжка. Можа, як у рэкламе, шокам. Еду ў машыне па вуліцы Брэсцкай, заўважаю напярадзе прамавугольную шыльду са словамі «забаўляльны цэнтр». А назва яго прымацавана паўкругам, таму бачыш аграмадныя літары з канца, і калі раўняешся з будынкам, чытаеш «УМЕР»... Трэба яшчэ праехаць пабудову, каб заўважыць літару «Б», якая хаваецца ў пачатку згіба. «Мусіць, так было задумана, — дзеляцца думкамі мае спадарожнікі, — прыцягнуць увагу ў гаспадароў атрымалася». Што так, то так, хоць надзвычай экстравагантна, але вызначыліся. Ну а калі перабаршчыць ва ўсіх відах забаўлянак, то і да лятальнага выходу недалёка, таму пры ўваходзе ва ўстанову не пашкодзіць задумацца.

Назва «умер», нават калі гэта аптычны падман, доўга не забудзецца. А каб запомнілася простае і непрыкметнае, трэба нечым здзівіць. На ўсё жыццё, відаць, запомнілі дзве турысткі з Беларусі гастраном «Добры» ў Пяцігорску. Ішоў 1990 год. Мы з сяброўкай у складзе групы апалчвалі на Паўночным Каўказе. Назад ехалі праз Пяцігорск. Нехта нешта пераблытаў у турагенцтве, і аказалася, што білеты заказаны толькі на наступны дзень. Гэта азначала, што суткі мы павінны кантавацца ў чужым горадзе, неяк харчавацца. Начоўку для нас кіраўнік групы з цяжкасцю знайшоў у спартзале адной са школ. З ежай было горш. Магазіны сталі, як танцпляцоўкі, зусім пустыя. У мяне настрой быў прыўзняты, бо даўно марыла наведаць лермантаўскія мясціны, музей Лермантава, а тут падарунак лёсу, зза якога можна было і дзень пагаладаць. А вось сяброўка вельмі засумавала. Першы і апошні раз у жыцці мы кашавалі марожанае, якое прыгатавана ... з вады, ну можа якая лыжка цукру на вядро дабаўлена. Агледзеўшы славутасці, звязаныя з вялікім паэтам, мы няспешна хадзілі па вузкіх вуліцах горада ў надзеі купіць хоць нешта на дарогу. Ва ўніверсам пад назвай «Добры» зайшлі амаль без усялякай надзеі і вачам не паверылі. На паліцах — розныя прадукты, каўбаса, а пакупнікоў няма. Вопытным позіркам угадаўшы прыезджых, прадавец паспяшалася патлумачыць: «Магазін абслугоўвае ветэранаў». Я ўжо намерылася разварочвацца, а сяброўка як зачараваная глядзела на паліцу. Варта заўважыць, што ў Лены асаблівая канстытуцыя, і выглядае яна вельмі худой, дадаць кругі пад вачыма ад стомы, ды невыказную роспач ва ўсёй постаці... Словам, мажная цётка з «Добрага» магазіна моўчкі ўзяла батон каўбасы, рэзнула з паўкіля, узважыла і падала ёй: «На, а то павалішся хутка». Мы тую каўбасу са смехам да гэтай пары ўспамінаем, як толькі даводзіцца сустракацца.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

На слыху

Алкаголь — для цэлага горада

выявілі супрацоўнікі міліцыі ў доме гамяльчанкі

У маладой жанчыны захоўвалася 15 117 літраў віна самых розных назваў на суму 158 704 тысячы рублёў! Без акцызных марак, вядома ж.

Дзе гэтымі напоямі разжылася гаспадыня, якая, дарэчы, нідзе не працуе, з якой мэтай захоўвала іх, — і трэба ўстанавіць следчым органам па ўзбуджанай крымінальнай справе. А упраўленне дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці затрымала ў адным з гаражнабудаўнічых кааператываў горада мужчыну, які захоўваў там 1400 літраў спірту прадаваў ён яго ўпотайкі ў розных месцах Гомеля, за што ўжо неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ДТЗ з цяжкімі наступствамі

**У Старадарожскім раёне паблізу вёскі Прусы адбылося сур'ёзнае ДТЗ — у кювеце перакулілася аўтамашына, у якой знаходзіліся чацвёра падлеткаў. За рулём

ІНФАРМБЮРО ЗОРНЫЯ РЭЦЭПТЫ ДАЎГАЛЕЦЦЯ

ПОЕЗД ГРОДНА — САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ ПАЧНЕ КУРСІРАВАЦЬ У МАІ 2008 ГОДА

Аб гэтым паведаміў начальнік чыгуначнага вакзала горада Гродна Аляксандр Сакалоўскі.

Поезд па такім маршруце будзе хадзіць тры разы на тыдзень. Плануецца ўвесці прычапныя вагоны «Гродна — Адлер» (праз дзень), «Гродна — Адэса» (адзін раз у чатыры дні). Кошт праезду і расклад руху паяздоў вызначыцца ў канцы красавіка.

«Сусветны турыстычны барометр» паказвае рост

«Сусветны турыстычны барометр» — выданне Сусветнай гандлёвай арганізацыі сцвярджае, што мінулы год стаў самым спрыяльным для развіцця турызму. Колькасць міжнародных турпаездак за два гады вырасла з 800 млн да амаль 900 млн. Гэта новы сусветны рэкорд у турызме.

Станоўчую дынаміку спецыялісты звязваюць з узнікненнем новых рынкаў турыстычных паслуг. Між іншым, Беларусь — адна з такіх краін. Праўда, да рэкордных лічбаў нам яшчэ працаваць і працаваць. Але шанцы ў нас неблагія. Сярод рэгіёнаў планеты, якія асабліва вабяць падарожнікаў, Еўропа застаецца пакуль самым прывабным накірункам. Летась больш за 50 працэнтаў усіх міжнародных турыстычных паездак зарэгістравана ў Еўропе.

З краін, якія здолелі прыцягнуць асабліва шмат турыстаў, вылучаюцца Турцыя, (+18 %), Грэцыя (+12 %) і Партугалія (+10 %), Італія і Швейцарыя (абедзьве +7 %).

Беларусь, як вядома, знаходзіцца ў цэнтры кантынента, пераарыентацыя на сябе нават невялікай часткі турыстычных плыняў Еўропы прынесла б нам шматмільённыя прыбыткі. Тым больш, што аўтары даследавання ў «Сусветным турыстычным барометры» ў раздзеле «Перспектывы 2008 года» прадказваюць далейшае паспяховае развіццё сектара турызму, у прыватнасці, рост цікаўнасці жыхароў з краін з высокім узроўнем даходаў да новых накірункаў падарожжаў.

Леанід ТУГАРЫН.

ВЕЖА ВЫШЫНЁЙ У МІЛЮ

У бліжэйшыя паўгода ў Саудаўскай Аравіі будзе аб'яўлены тэндар на будаўніцтва вежы вышынёй у мілю (1600 м). Кошт гэтага грандыёзнага праекта ацэньваецца ў 10 млрд долараў. У выпадку рэалізацыі саудаўскага праекта хмарачос Джыды будзе ў тры разы вышэйшы за Астанкінскую тэлевежу, вышыня якой складае каля 540 м.

«Раніцай позірк звярні свой на горы, увечары водную гладзь сузірай». Гэта адна з рэкамендацый па захаванні псіхічнага і фізічнага здароўя, змешчаная ў трактаце па медыцыне часоў Сярэднявечча (Салернскім кодэксе здароўя).

Мала хто ведае, што ў тагачаснай Еўропе існавала навука, аналагічная кітайскаму вучэнню фэншуй, — **геамантыка,** якая раскрывала аспекты ўзаемадзеяння чалавека з навакольным асяроддзем, выяўляла — як геаметрыя дамоў, пакояў, асаблівасці ландшафтаў уплываюць на стан здароўя чалавека, яго паводзіны, лад жыцця. Лічылася, што структура жылля (форма, памеры, колер паверхняў, наяўнасць тупых і вострых куткоў і інш.), як і рэльеф мясцовасці, дзе размяшчаецца будынак, могуць паскорыць выздараўленне хворага ці наадварот — пагоршыць яго стан. Існуе легенда, як адзін з самых знакамітых медыкаў Сярэднявечча Абу Алі Ібн Сіна, больш вядомы еўрапейцам як Авіцэна, «ландшафтным метадам» вылечыў хворага шаха ад раку нырак. Ён рэгулярна выводзіў шаха на прагулку ў розныя мясціны (на ўзгорак, у поле, да рэчкі, на балота, у квітнеючы сад і г.д.), ад чаго хворы хутка пайшоў на папраўку.

Як любы медык старажытнасці, Авіцэна быў яшчэ і астролагам. Ён ведаў, што кожны ландшафт адпавядае пэўнаму планетарнаму ўплыву і што індывідуальны гараскоп чалавека дазваляе скласці графік наведвання пэўных ландшафтных зон, якія ўзмоцняць гэты ўплыў, абудзяць у арганізме схаваныя сілы і паскораць працэс выздараўлення. Для старажытных медыкаў важным было не толькі веданне — ЧЫМ і КАЛІ лячыць, але і ДЗЕ гэта лепш за ўсё зрабіць, каб атрымаць максімальна станоўчы эфект.

МЕДЫЦЫНСКАЯ АСТРАЛОГІЯ

Гараскоп хваробы

Сёння розныя хваробы душы і цела лечаць розныя спецыялісты (ныркі — адзін, вочы — другі, псіхіку — трэці). Чалавек «раздрабіўся» на «складальнікі», за якімі згубілася цэлае. У старажытнасці медыцына адносілася да філасофскіх навук і вывучалася разам з імі. Для тагачасных гіпакратаў чалавек быў не проста сукупнасцю органаў, а цэласнай сістэмай, неад'емнай часткай экасферы, Сонечнай сістэмы, Сусвету. Сучасная медыцына разглядае чалавека адасобленага, старажытная — у кантэксце прасторава-часавых каардынат. У аснове такога падыходу ляжала канцэпцыя арганізацыі існага свету на прынцыпе аналогіі (прынцыпе матрошкі), калі адна цэласная сістэма мікраўзроўню (напрыклад, чалавек) з'яўляецца падобнай на іншую цэласную сістэму макраўзроўню (Сонечная сістэма). Розніца толькі ў маштабе. Як у кроплі можна ўбачыць акіян, так у чалавеку — увесь Сусвет.

Старажытныя медыкі ведалі, што па руху зор і планет можна вызначыць спадчынныя хваробы, стан здароўя на дадзены момант і на перспектыву, патэнцыю развіцця тых ці іншых захворванняў і г.д. А яшчэ яны ведалі, што ўся гэтая інфармацыя «спраецыравана» на цела чалавека, у літаральным сэнсе «напісана» на яго твары (фізіягноміка), на чэрапе (фрэналогія), на руцэ (хірамантыя). Форма, колькасць і месцаразмяшчэнне радзімак, малюнак і колер радужкі вока, нават зубы і пульс давалі даведчанаму поўную справаздачу не толькі аб стане здароўя пацыента, але і аб яго звычках, схільнасцях, асаблівасцях характару, раскрывалі сучасны і будучы стан арганізма. Усё гэта браў на ўзбраенне старажытны медык-астролаг і прымяняў у комплексе для дыягностыкі і лячэння.

— Нягледзячы на рознасць падыходаў, астралагічная медыцына не пярэчыць сучаснай навуцы, — расказвае **астролаг Уладзімір ВАСЮК**. — Яны абедзве вывучаюць адзін і той жа аб'ект пад рознымі вугламі. Медыцынская астралогія тэрмінамі зорак і руху планет тлумачыць узаемасувязь чалавека (як істоты фізічнай і духоўнай) з навакольным светам. Калі гэтыя сувязі парушаюцца, развіваецца хвароба, як «сігнал» аб адсутнасці гарманічнага кантактавання. Задача сучаснай медыцыны — вылечыць хваробу. Задача астрамедыцыны — ГАРМАНІЗАВАЦЬ жыццё чалавека. Сучаснай медыцыне не стае інтэгральных ведаў, якія б дазволілі знайсці правільнае прымяненне яе метадам, зразумець усе працэсы, якія працякаюць у жыцці і целе чалавека.

Паводле слоў Уладзіміра, у Гіпакрата — бацькі сучаснай медыцыны — апроч іншага ёсць шмат работ па астралогіі. Фактычна падзел людзей па тыпах тэмпераменту — гэта слабае рэха прапанаванага Гіпакратам падзелу паводле чатырох стыхій. Такую градацыю ён назваў «тэмпераментус» (той, які існуе ў часе). Чалавека, у гараскопе якога пераважала стыхія Агня, Гіпакрат назваў халерыкам (яго прыкметы — актыўнасць, дзейснасць). Чалавека з дамінаваннем стыхіі Паветра ён адносіў у групу сангвінікаў (кантактных, камунікабельных). Грунтоўнасцю і асцярожнасцю, на думку Гіпакрата, адрозніваюцца асобы, у якіх на момант нараджэння гаспадарыла Зямля (флегматыкі). Чуллівыя і засяроджаныя на сваіх перажываннях меланхолікі атрымалі свае якасці ад стыхіі Вады.

У шматтомным трактаце Авіцэны «Канон медыцынскай навукі» астралогіі прысвечана асобая кніга. У ёй ён змясціў распрацаваную канцэпцыю здароўя, вызначыў, што ёсць хвароба (з пункту гледжання астрамедыцыны), якія метады будуць найбольш эфектыўнымі ў залежнасці ад ДЭКУМБІТУРЫ (ГАРАСКОПА ХВАРОБЫ). Пунктам адліку для складання гараскопа хваробы з'яўляецца момант праяўлення яе першага сімптому. Дэкумбітура дазваляе вызначыць, як будзе працякаць хвароба, ці ўзнікнуць пры гэтым ускладненні, чым і як яе лячыць.

«Вогненны» часнок і «паветраны» папкорн

Асноўны пастулат астрамедыцыны: кожнае цела, як і кожная асоба, унікальныя, таму падабраць такі лад жыцця, які б дазволіў максімальна гарманізаваць душэўны, фізічны стан здароўя чалавека і яго зносіны з навакольным светам, можна толькі пасля складання яго персанальнага гараскопа. Хоць, безумоўна, у астрамедыцыны ёсць і агульныя законы і правілы. Так, у вогненных знакаў (Авена, Льва, Стральца) энергетычныя патокі ў арганізме, як правіла, працякаюць актыўна, пераўтварэнне адной формы энергіі ў другую адбываецца хутка. Для іх нармальным будзе актыўны («вогненны») лад жыцця. Калі ж узнікае паталогія (напрыклад, перарасход энергіі), ім неабходна «прытармазіць», «збавіць абароты» да размеранага графіка. У такой сітуацыі для іх падыдзе рытм жыцця, характэрны для паветранай стыхіі, напрыклад, практыкаванні дыхання ёгаў, якія дапамагаюць стварыць раўнамерны ток энергіі па целе.

Для старажытных медыкаў важным было не толькі веданне — ЧЫМ і КАЛІ лячыць, але і ДЗЕ гэта лепш за ўсё зрабіць, каб атрымаць максімальна станоўчы эфект.

Зямныя знакі (Цялец, Дзева, Казярог) інертныя. Ім, каб пазбегнуць «застойвання» энергіі (што можа прывесці да ўтварэння пухлін, ацёкаў), неабходна «паскорыцца», стаць больш дзейснымі. Дысцыпліна і паслядоўнасць мераў, скіраваных на аздараўленне і профілактыку захворванняў, будуць адыгрываць для іх вялікую ролю. Дарэчы, ім трэба звяртаць асаблівую ўвагу на дыету, у першую чаргу гэта датычыцца Цяльцоў. Казярогам можна перыядычна галадаць. Але выбар часу галадання трэба узгадняць з рухам планет і зорак. Дзевам трэба пазбягаць перагрузкі страўніка, сачыць за рэжымам харчавання.

Тое ж датычыцца і рэжыму сну: «актыўным» знакам (стыхіі Агню і Паветра) астрамедыцына раіць больш часу адводзіць на сон. А зямным і водным — наадварот, спаць менш.

Хварэюць прадстаўнікі розных знакаў Задыяка таксама па-рознаму. У вогненных хвароба развіваецца хутка, затое такім жа з'яўляецца і працэс выздараўлення. Да зямных знакаў хвароба прыходзіць непрыкметна, павольна і пакідае цела ў такой жа няспешнай манеры. Вадалеі, Блізняты і Шалі (стыхія Паветра) таксама захворваюць «плаўна», але вылечваюцца хутка. Прадстаўнікі стыхіі Вады (Рыбы, Ракі, Скарпіёны) маюць больш праблем са здароўем, чым астатнія знакі. У іх працэс захваральнасці працякае хутка, а выздараўленне адымае шмат часу і сілу.

Для падтрымання сябе здаровымі і бадзёрымі паветраным і водным знакам неабходна захоўваць свой энергетычны патэнцыял на пэўным узроўні, Агню — пазбягаць перарасходу энергіі, а Зямлі — наадварот, не дапускаць яе «застою».

— Сёння можна знайсці шмат папулярнай літаратуры, дзе вызначаецца сувязь пэўнага знака Задыяка з канкрэтнымі хваробамі, — расказвае Уладзімір Васюк. — У адпаведнасці з гэтым даюцца нейкія парады — аднолькавыя для ўсіх прадстаўнікоў аднаго знака. Такую інфармацыю не трэба ўспрымаць усур'ёз. Практычныя парады па здароўю можна даваць толькі пасля складання індывідуальнага гараскопа.

Веданне гараскопа чалавека дазваляе вызначыць, якія віды спорту будуць для яго найбольш эфектыўнымі, скласці індывідуальны графік заняткаў і нагрузак. Напрыклад, калі штангу «выжымае» Стралец, яму лепш выбіраць сярэднюю вагу дыскаў і рабіць шмат падыходаў. Цяльцам — наадварот, варта вешаць «бліны» з гранічна дапушчальнай вагой, але падыходаў рабіць мала.

Астрамедыцына дае магчымасць падабраць індывідуальны рэжым харчавання. Калі гараскоп сведчыць, што ў арганізме для аднаўлення балансу не стае энергіі Агню, можна «прапісаць» ужыванне «вогненных» прадуктаў (цытрусавых, чырвонага мяса, перцу, цыбулі, часнаку). Вогненным знакам, каб пазбегнуць перарасходу энергіі і знясілення, астролагі НЕ РАЯЦЬ актыўна ўжываць «паветраныя» прадукты (папкорн, белакачанную капусту), паветраным — па той жа прычыне — НЕ ЕСЦІ «вогненных».

А вось зямному Цяльцу «вогненны» рацыён будзе ярказ дарэчы, дапаможа стымуляваць працэсы энергаабмену. Затое яму ПРОЦІПАКАЗАНЫ «водныя» прадукты (рэдзька, гурок, дыня, яблык, баклажан, марская капуста).

Сонца—гара—аазіс

Адным з краевугольных момантаў астрамедыцыны з'яўляецца веданне СІГНАТУР (з лац. — адпаведнік, увасоблены на дадзеным узроўні). Яны бяруцца за аснову пры выбары метадаў лячэння. «Сонца — аранжавы колер — сардэчна-сасудзістая сістэма — гара — аазіс». Гэта сігнатура, якая апісвае ўвасабленне сонечнага прынцыпу. Сігнатуры дазваляюць падабраць адпаведнікі на розных фізічных планах і выбраць найбольш дзейсны для канкрэтнага чалавека. Іх прымяняў і Авіцэна, калі лячыў хворага шаха метадам ландшафтаў.

— Астрамедыцына дае магчымасць вызначыць найбольш удалы час для правядзення аперацыі, для зачацця дзіцяці, — падсумаваў Уладзімір Васюк. — Апроч іншага яна вывучае ўплыў ладу жыцця і ўчынкаў продкаў на лёс і здароўе нашчадкаў, але самае галоўнае: астрамедыцына фарміруе правільны лад жыцця чалавека.

Інга МІНДАЛЁВА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.04	17.42	10.38
Віцебск —	6.56	17.29	10.33
Магілёў —	6.54	17.32	10.38
Гомель —	6.49	17.31	10.42
Гродна —	7.19	17.57	10.38
Брэст —	7.17	18.00	10.43

Месяц

Поўня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Абрама, Аўксенція, Ісака, Кірылы, Міхаіла, Фёдара;*
К. *Анастасіі, Лівіі, Васіля, Віктара, Габрыеля, Леанарда, Юльяна.*

НАДВОР'Е на заўтра



Геамагнітныя ўзрушэнні

Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— малая геамагнітная бура

...у суседзяў

ВАРШАВА	+3..+5°С	КІЕЎ	+7..+9°С	РЫГА	+3..+5°С
ВІЛЬНЮС	+2..+4°С	МАСКВА	+3..+5°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-1..+1°С

27 лютага

Дзве даты

285 год — нарадзіўся Канстацін I Вялікі (Флавій Валерый Канстанцін), рымскі імператар з 306 года. Паслядоўна праводзіў цэнтралізацыю дзяржаўнага апарату. Падтрымліваў хрысціянскую царкву (не забываючы і пра язычніцкія культы). Заснаваў новую сталіцу імперыі — Канстанцінопаль.

1943 год — групай нарвежскіх дыверсантаў узарваны адзіны ў Германіі завод па вытворчасці «цяжкай» вады. Тым самым былі сарваны планы рэйха па стварэнні атамнай бомбы.

Цытата дня:

«Ні ў чым я не знаходжу такога шчасця, як у душы, якая захоўвае памяць пра маіх добрых сяброў».
Уільям Шэкспір (1564—1616), англійскі драматург, паэт.

Усміхнёмся!

Тэлепраграма:
20.00. «Не нарадзіся прыгожай». У галоўнай ролі — Нэлі Уварава.
21.00. «Не нарадзіся разумнай». Вядучая — Ганна Семяновіч.
22.00. «Не нарадзіся прыгожай, не нарадзіся разумнай». У гасцях праграмы — Ксенія Сабчак.

☺

Вадзіцель аўтобуса аб'вяшчае прыпынкі:
— Прыпынак «Піўны бар». Наступны прыпынак — канец чаргі ў піўны бар.

☺

Існуюць два спосабы кіраваць жанчынай... але іх ніхто не ведае.

ТЦ «КУПАЛОВСКИЙ»
(г. Минск, ст. метро «Октябрьская», 2-й уровень)
СДАЕТ В АРЕНДУ ТОРГОВЫЕ ПЛОЩАДИ.
Конт. тел.: (8 017) 287 76 31, 287 77 14.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (23 лютага). Па гарызанталі: Дэсантнік. Спадарожніца. Нарад. Ірыс. Агат. Ада. Лак. Сапа. Карэ. Рыс. Хакі. Рана. Арда. Брас. Бук. Мяч. Каша. Мара. Смаката. Капсула. Опус. Горкі. Бай. Маскіроўка. Стан. Бра. «Татра». Па вертыкалі: Гагара. Рама. «МіГ». «ІС». Рында. Ярка. Адэса. Сеча. Корм. «Ант». Каса. Асада. Твіст. Ара. Кат. Снарад. Спіна. Ода. Нож. Бобр. Ніл. Аўра. Клірас. Сойка. Цыкада. Роба. Суп. Ас. Код. Уша. Лук. Макі. Арка. Час.

Віншуем з днём нараджэння дарагога тату і дзядулю, ардэнаносца, чалавека з актыўнай жыццёвай пазіцыяй ***Станіслава Пятровіча ТРАЙКОВІЧА.*** *Зычым яму моцнага здароўя і доўгіх шчаслівых гадоў жыцця.*

Жонка, дзеці, унукі і праўнукі.

Тэлесеткі

ЖАРСЦІ ПА КАХАННЮ І ... УЛАДЗЕ

На тэлеканале «ЛАД» стартаваў цыкл гістарычных праграм «Жарсць і ўлада». Гэты праект распавядае пра дзесяць гісторый кахання, якія, у сваю чаргу, змянялі ход гісторыі для цэлых народаў.

Дзяўчынка з Бярэсця вырастае ў «асобу нумар адзін» у Маскве, пекар атрымлівае ў жонкі высакародную паненку, жанчына здзяйсняе замах на бацьку пяцярых сваіх дзяцей... Гэтыя выпадкі і самі па сабе прыцягваюць увагу — а калі дадаць, што гаворка ідзе пра Рагнеду і Уладзіміра, Соф'ю Гальшанскую і Ягайлу, Алену Глінскую і Васіля III, Марту і Міндоўга, то цікавасць узрастае ў шмат разоў. У імя кахання адны моцныя асобы здзяйснялі подзвігі, другія ішлі на злачынствы. І кожны такі цалкам рэальны сюжэт з жыцця нашых продкаў — больш захапляльны, чым галівудскія касцюміраваныя кінаэпапеі.

Работу над праектам аўтар праграмы Аляксандра Красько, рэжысёр Ігар Сівіцкі і аператар Руслан Сілюк вялі амаль паўтара года, а ў здымках, якія ішлі ў Лідскім замку, на Грунвальдскім полі, у Камянецкай вежы і ў Брэсцкай крэпасці, узялі ўдзел больш за сто чалавек. Усяго ў цыкле «Жарсць і ўлада», зробленым сіламі журналістаў тэлерадыёкампаніі «Брэст», дзейнічаюць дзесяць пар — знакамітых, але зусім не абавязкова шчаслівых, закаханых, але не заўжды ўзаемна... Гісторыі, без якіх сённяшні наш свет быў бы зусім іншым.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота прэс-службы БТРК.

Уважаемые акционеры ОАО «Заводской райпищеторг»
27 марта 2008 года в 11.00 состоится очередное собрание акционеров ОАО «Заводской райпищеторг».
Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Варвашени, 50.
ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. О результатах работы Общества за 2007 год и основных направлениях деятельности Общества в 2008 году.
2. Утверждение заключения Ревизионной комиссии, рассмотрение результатов ведомственной проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 год.
3. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе за 2007 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2007 год.
5. О распределении чистой прибыли за 2007 год и выплате дивидендов.
6. О направлении использования чистой прибыли в 2008 году и I квартале 2009 года.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8. Определение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
9. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
10. О наделении Наблюдательного совета полномочиями принятия решений по вопросам, не отнесенных Уставом Общества к исключительной компетенции общего собрания акционеров.
Регистрация участников собрания с 9.30 до 10.45 27 марта 2008 года по месту проведения собрания акционеров. Для регистрации при себе иметь документ, удостоверяющий личность (представитель акционера — и доверенность).
Справки по тел. 243 29 83.
УНП 100103703

Открытое акционерное Общество «ДСТ № 2, г. Гомель»
сообщает о проведении годового собрания акционеров, которое состоится 28 марта 2008 года в зале заседаний ДСУ-17 по адресу: г. Гомель, Инженерный переулок, д. 6.
ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Отчет дирекции о финансово-хозяйственной деятельности ОАО «ДСТ-2, г. Гомель» и выполнении прогнозных показателей за 2007 год, принятие параметров прогноза социально-экономического развития ОАО «ДСТ-2, г. Гомель» на 2008 год.
2. Отчет Ревизионной комиссии по результатам годовой проверки деятельности ОАО «ДСТ-2, г. Гомель» и Наблюдательного совета о проделанной работе в 2007 году.
3. Утверждение годового отчета за 2007 год, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках.
4. Утверждение распределения чистой прибыли по итогам 2007 года и направлений ее использования в 2008 году, размера и сроков выплаты дивидендов за 2007 год.
5. О внесении изменений в Устав ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель».
6. О согласовании отчуждения с целью реализации зданий и сооружений Общества.
7. Избрание членов Наблюдательного совета.
8. Избрание членов Ревизионной комиссии.
9. Определение условий материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
10. Об оказании безвозмездной финансовой помощи.
Начало собрания в 10.00.
Регистрация представителей с 9.00.
С собой иметь документ, удостоверяющий личность акционера, представителям — доверенности.
УНП 400022426

Уважаемые акционеры ОАО «Лидсельмаш»
28 марта 2008 года состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Лидсельмаш», расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, 70.
ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:
1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2007 году. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2008 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2007 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2007 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли и расходов на потребление, а также выплате дивидендов за 2007 год.
6. Утверждение направлений использований чистой прибыли и расходов на потребление на 2008 год.
7. О внесении изменений в Устав ОАО «Лидсельмаш».
8. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
9. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
Начало работы собрания в 16.00.
Регистрация участников собрания с 15.30 до 15.50.
УНП 500021638 **Наблюдательный совет ОАО «Лидсельмаш».**

ОАО «Белгалантерея» извещает своих акционеров о проведении 31 марта 2008 года очередного собрания акционеров
ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 год и основных направлениях развития ОАО «Белгалантерея» на 2008 год.
2. О заключении Ревизионной комиссии и аудиторской проверки по результатам деятельности Общества за 2007 год.
3. Утверждение годового баланса и отчета о прибылях и убытках ОАО «Белгалантерея» за 2007 год.
4. Об утверждении направлений использования чистой прибыли в 2008 году и выплаты дивидендов.
5. Утверждение мероприятий по обеспечению стабильной работы Общества в 2008 году.
6. Избрание членов Наблюдательного совета.
7. Избрание членов Ревизионной комиссии.
8. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. Об оказании спонсорской помощи в 2007 году.
10. Утверждение переоценки основных средств индексным методом.
Место проведения собрания:
г. Минск, ул. Ботаническая, 5-а, актовый зал, 6-й этаж.
Время начала проведения собрания — 15.00
Время регистрации участников собрания — в день проведения собрания с 14.00 до 14.45 по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителям акционеров — по доверенности. Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра акционеров на 18 марта 2008 года.
Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания в рабочие дни, начиная с 18 марта 2008 года по месту нахождения Общества с 9.00 до 17.30, в день проведения собрания — по месту проведения собрания.
УНН 100230667

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

html: www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 1054. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12